№ 13 (467) 30 сакавіка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднояўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Вясна-2006

Тэрапія ахвярнасьцю — вось чым былі пратэсты гэтае вясны. Акрэсьцінскія нататкі Андрэя Дынька. **Старонка 4.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Лёс Звона Свабоды

які не загучаў 25 сакавіка. Ці верне яго ЦЭнтральны РУУС? Высьвятляе Адам Воршыч. **Старонка 10.**

## Як я сядзела ў жодзінскай турме

Піша журналістка «НН» Тацяна Сьнітко, схопленая падчас ліквідацыі намётавага мястэчка. **Старонка 15.**

## Выбары — перад намі!

Важна тое, што беларуская праўда ўсё ж такі прагучэла, а яе рэха коціцца па ўсім сьвеце. Артыкул Пётры Рудкоўскага. **Старонка 20.**




## У нумары

**воля і пятля**
Вясна–2006. ........................................4
**рэпартаж**
Кроў на Дзень Волі. ........................8
**факты і камэнтары**
Спэцназ зьбіў вязьня нацызму. ......7
Справа маладафронтаўцаў. ............7
Звон свабоды ў няволі. ................ 10
**Тэма**
Як я сядзела ў жодзінскай турме15
Валянцін Тарас. Арыштанцікі вы мае. ................................................... 19
**Камэнтар**
Пётра Рудкоўскі. Выбары — перад намі! ................................................... 20
**з усіх старон**
Украінскія выбары. ....................... 22
Розны болевы парог. ................... 23
**грамадзтва**
Рыбакі ў цывільным. ..................... 26
**аўтарскія калёнкі**
Павал Севярынец. ......................... 12
Аляксандар Класкоўскі. ............... 24
Лёлік Ушкін. .................................. 25
Віталь Тарас. .................................. 28
**культура**
"Залатая Літара" на Дзень Волі 35
"Плоскасьць свабоды". ............... 36
**гісторыя**
Аляксей Пяткевіч: Як мы сьмяяліся з газэтаў 1950–х. .......................... 38
**літаратура**
Станіслаў Лем. Уранавыя вушы. 40
Новыя вершы Андрэя Хадановіча і Сяргея Прылуцкага. ................... 42
**стыль жыцьця**
Жалезны век у Браславе. ........... 43

### АД РЭДАКЦЫІ

# Гульня да апошняга патрона

Показка гэтых дзён: чым беларуская рулетка розьніцца ад расейскай? Тым, што ў першую гуляюць не з рэвальвэрам, а зь пісталетам Макарава. Для недасьведчаных: стрэл адбудзецца ў любым выпадку. Між 20 і 25 сакавіка ўлады і апазыцыя выбралі такую рулетку. Улада, пасадзіўшы сотні актывістаў, паказвае, што бярэ курс на сілавое вырашэньне падобных праблемаў надалей. Незалежнае грамадзтва, сьвядома ідучы на адседкі, паказвае, што гатовае біцца.

25 сакавіка, падчас мітынгу ў Купалаўскім сквэры, адным з самых папулярных лёзунгаў быў «Ганьба БТ!». Афіцыйная хлусьня выштурхнула на вуліцы тысячы людзей. Чытаў у Інтэрнэце, што работнік БТ, які зьняў адыёзны сюжэт пра намётавы гарадок, ужо баіцца браць у рукі мабільны тэлефон: за некалькі дзён яму прыйшло трыста смс-паведамленьняў адэкватнага зьместу. Сайты афіцыйных тэлекампаніяў блякуюцца: туды, змовіўшыся, заходзяць за раз па некалькі тысячаў чалавек.

Нараканьне на аднастайнасьць апазыцыйных акцыяў у мінулым. Варта капнуць Інтэрнэт — дзясяткі прапановаў. Улада ведае, як разагнаць 20-тысячны мітынг, што інкрымінаваць удзельніку «ланцуга неабыякавых людзей», як ізаляваць апазыцыйнага палітыка. Але што рабіць з моладзьдзю, якая абвешвае локшынай Белтэлерадыёкампанію, масава рве і кідае ў сьметніцу «СБ»? Аўто, што праяжджаюць побач, сыгналяць у знак салідарнасьці нават удзельнікам такіх флэш-мобаў, скаардынаваных праз Інтэрнэт. І сыстэма, што размаўляе мовай сілы, прабуксоўвае. Яна спрабуе тлумачыць сытуацыю даверанаму ёй электарату даходліва: яны адмарозкі, ім заплацілі і г.д. Але хто плаціў кіроўцам аўто?

Мінулы тыдзень засьведчыў уменьне беларусаў каардынавацца і самаарганізоўвацца. У намётавым гарадку, у чэргах ля Акрэсьцінаў, у судох, шукаючы родных. Нацыя зьдзівілася: наколькі яна насамрэч салідарная.

Тэндэнцыя тыдня — дэпэрсаніфікацыя палітыкаў. Сем дзён Лукашэнка не зьяўляўся на тэлеэкранах. Яго вяртаньне, ахвяраваньне ўласнымі партрэтамі й перанос інаўгурацыі можа сьведчыць пра імкненьне схавацца ўглыб сыстэмы, перачакаць, пакуль спадзе градус грамадзкае актыўнасьці. Бо інаўгурацыя пад воклічы «Ганьба!» ў атачэньні шэрагаў спэцназу з спэцсродкамі — відовішча спэцыфічнае. Дый сьвятыня лукашэнкаўскага рэжыму — таталітарная Кастрычніцкая плошча, на якой стаяў помнік Сталіну — дэсакралізаваная намётавым гарадком. Дарэчы, першы ў Беларусі намётавы лягер зьявіўся таксама ў «сталінскіх мясьцінах» — у Курапатах.

Дэпэрсаніфікацыя ж лідэраў апазыцыі стала бачная, калі, у адказ на іх нерашучасьць, людзі на плошчы закрычалі: «Застаёмся!» У Дні Волі грамадзтва гуляла лідэраў.

**Андрэй Скурко**




**Дзень Волі. упалаўскі сквэр у Менску.**

Акрэсьцінскія нататкі, запісаныя за адну ноч.

# Вясна-2006

АНДРЭЙ ДЫНЬКО

Я пішу гэтыя радкі ў панядзелак а 23-й. Калі ўдасца, да здачы нумару якраз трапяць у Рэдакцыю. Сьвятло вымкнута, але турма ня сьпіць. Яна шуміць, як начныя джунглі. З камэраў далятае гоман і сьмех, часам рогат. Гукам турма нагадвае піянэрлягер. Удзень тут гуляюць у вылепленыя з хлеба шахматы, у «мафію», у марскі бой, разгадваюць крыжаванкі. Пасьля адбою надыходзіць час слоўных гульняў. Турма бясконца прыгадвае рознагатункавых амонаўцаў і канвойных, языкаста жартуе з дыктатара, яго камарыльлі, радыёкамэнтатараў і сэржантаў, якіх сагналі на Акрэсьціна на варту з усяе сталіцы. «Цішэй трохі, бля!» — нагадваюць пра сябе яны, але гармідар не сьціхае. У вакенцы над дзьвярыма гарыць лямпачка, пры ёй я і пішу.

Ахоўнік сказаў гадзіну таму хлопцам у суседняй камэры, што на Акрэсьціна вязуць яшчэ трыста затрыманых. Выглядае фантастычна, мы ня схільныя верыць. Такія жарты пасьля тыдня канвэерных арыштаў. Апошняе вялікае паступленьне мы чулі ў суботу. Спачатку па камэрах пайшла чутка, што 15-тысячнае шэсьце кіруецца на Акрэсьціна, праз дзьве гадзіны гэта пацьвердзіў міністар Навумаў у навінах Беларускага радыё, і турма сустрэла яго словы скандаваньнем «Жыве Беларусь!» пад акампанэмэнт бразгату ўсім, што зьвініць, у батарэі. Ледзь цёплыя, яны зусім адключающца ўдзень.

Мы сядзім у новым карцары, яшчэ не дабудаваным, але пад завязку напханым арыштаванымі на плошчы й вакол яе. У камэры на пяць асобаў нас восем, і мы спрабуем мэтадам прапорцыі вылічыць агульную колькасьць інтэрнаваных. Мы ня ведаем колькасьці камэраў у старым корпусе. У новым іх недзе сорак. Колькі ж нас? У сьпісе на абед мы расьпісваемся пад нумарамі 327, 329... Пяцьсот? Шэсьцьсот? Беларускае радыё, адзіны даступны сродак інфармацыі, лічбы затрыманых не паведамляе — верная прыкмета, што яна вялізная!

...Я стаяў рукі за сьпіну, тварам да сьцяны ў прымальніку старога корпусу і з-за сталёвых дзьвярэй мне падаваў голас Алёша Янукевіч. Зь ім у адной камэры сядзяць Юра Сідун, Андрэй Церашкоў — усяго адзінаццаць чалавек. У старым корпусе цёпла, але тхне бамжамі й няма асобных ложкаў. Пакуль чакаю сваёй чаргі на асабісты вобшук, чую Анатоля Лябедзьку ў камэры №4, ён нечага дабіваецца ад вартавога. А ці не з санпрапускніка далятае барытон філёзафа Акудовіча?

У суботу зь перадачай прыйдзе «Наша Ніва», мы старанна разрэжам яе ўпакоўкай ад зубной шчоткі, расьцягнем на старонкі, і я зьдзіўлюся, пабачыўшы Акудовічавы парады па выжываньні ў намётах. Няўжо я не пазнаў голасу брата свайго?

Два корпусы турмы набітыя бітком. У камэрах бродзіць фэрмэнт. Сьвядомыя грамадзяне звыкаюць да турмы. Дэпрэсіі няма. Мы ведаем праз новазатрыманых пра размах пратэстаў на Дзень Волі. Турма вітае бурнымі воплескамі скандаваньні «Ганьба!» і «Жыве Беларусь!» ля акрэсьцінскай брамы. Хлопцы абмяркоўваюць, як закінуць у масы калегаў на працы ідэю акцыі салідарнасьці — грамадзяне ядуць двойчы на дзень, як і вязьні ў турмах, пакуль ня выйдзе на волю апошні арыштаваны. Хлопцы ўчытваюцца ў калёнку Валера Булгакава: «Будзьце гатовыя да ўсяго, але не карыцеся».

З гонарам атрымліваем перадачы. Асобныя жонкі выбралі сабе ня самых зручных мужоў. Цешыць, што перадачы атрымліваюць і прыежджыя з раёнаў. Як у дзень судоў цешылі праваабаронцы і адвакаты — бясьсілыя зьмяніць вэрдыкт, але прысутныя.

Турма яднае. Нас шмат, і мы назіраем, як наша аптымістычная сіла захапляе канвойных. Яны, навічкі, узіраюцца ў нас, загаворваюць першыя. Некаторыя на разьвітаньне паказваюць нам у вочка пальцы, складзеныя літарай «V» — наша перамога. «Што, мучыцеся, пацаны? — пытаецца адзін такі. — А там у дзяўчонак у камэры ёсьць шпрыцы і порначасопісы». І мы разам кладземся ад рогату.

### Радзіма мая дарагая

Слухаем радыё. Чуем, што ў Францыі пачынаецца сацыяльны крызіс, што ў выніку закрыцьця шатляндзкіх пабаў на вуліцы апынулася 1200 чалавек. Адзначаем тыднёвае маўчаньне гаранта стабільнасьці сацыяльна-эканамічнага курсу. Перамога аранжавых ва Ўкраіне становіцца яснай па меры таго, як Беларускае радыё ўвесь панядзелак распавядае пра хаос на шэрагу выбарчых участкаў. Хлопцы адчуваюць, што ў гэтай перамозе ёсьць доля і нашай заслугі. Украінцы ўпару пабачылі, што выробляюць прыяцелі Сыманенкі зь Вітрэнкай, каб утрымаць уладу. Па дзевяць разоў на дзень слухаем пра гнеўнае асуджэньне беларускім МЗСам умяшаньня ва ўнутраныя справы Беларусі з боку ЗША і ЭЗ, і ведаем: гэта нас патрабуюць вызваліць. Хлопцы сарвалі рэжыму элегантную перамогу. Таму Лукашэнка маўчыць.

Да сакавіка мне здавалася, што Рэспубліка Брахня пераажыве свайго творцу. У ізалятары я паверыў, што ўсё можа скончыцца нашмат раней. Я недаацэньваў сілу маральнага рухавіка, што кіруе тымі, хто пратэставаў, і шырыню сацыяльнае базы пратэстаў. У адрозьненьне ад 1996 і 2001 гадоў, тыя, хто ішоў на плошчу гэтай вясной, ведалі, на што ідуць.

Хто сядзіць са мной? Пераважна людзі, для якіх гэта першая адседка. Пера-

важна моладзь 18—35 гадоў. Менскі праграміст родам з Браслава; магілёўскі ды-джэй; іпэшнік з «Дынамa» (этнічны расеец, сын вайскоўца, прыехаў у Беларусь у 17 гадоў) — жывое абвяржэньне тупых нацыяналістычных стэрэатыпаў. Яшчэ ёсьць бізнэсовец у кашэміравым паліто, ён жа пастар эвангельскай царквы; рабочы і адначасова музыка з Гомелю; журналіст газэты «Белорусы и рынок» Вадзім Александровіч; менскі сантэхнік з досьведам лідэрства ў «Маладым Фронце» і перакладу амэрыканскіх мультфільмаў на беларускую мову.

## Асабовы склад

Камэры на Акрэсьціна жывуць напружаным духоўным жыцьцём. Прапаведнікі прапаведуюць пра выпрабаваньні, якія Бог пасылаў Язэпу, дысыдэнты з дваццацігадовым стажам апавядаюць пра справы дзён мінулых. Малодшыя нічога ня ведаюць пра вясну 1996-га. Зубры — наш спэцназ, гэта я па-сапраўднаму распазнаў і ацаніў толькі тут — дэманструюць веды і ўменьні. Няма тугі, няма страху. Ёсьць пачуцьцё споўненага абавязку. «Калі ня мы, дык хто?» — кажа гарадзенскі мэнэджар, які нагрузіў багажнік свайго «форду» кумпяком, сырам, мандарынамі і 21 сакавіка ў 6.00 рушыў у Менск. Даехаў да плошчы. Там і ўзялі.

Мяне затрымалі ўранку 21-га, пасьля першай ночы Плошчы. У спэцаўтобусе я быў не адзін: амонаўцы нагналі туды людзей, якія пачулі пра ўзьнікненьне намётавага мястэчка праз НТВ або Інтэрнэт. Першай рэакцыяй была салідарнасьць. Толькі адзін нёс палатку і вуду (прадметы акрэсьцінскіх анэкдотаў), астатнія — прадукты. Адна — восем булачак і тэрмас з гарбатай, другі — сорак глязураваных сыркоў. У тым другім я пазнаў хлопца з суседняга пад’езду, зь якім мы ведалі адзін аднаго ў твар, але не віталіся. У 1996-м суды штрафавалі за ўдзел у штурханіне з АМОНам. У 2006-м выпісвалі па сем сутак на нарах безь цюфяку дзяўчаткам за тэрмас чаю.

## Сукамэрнікі і дзяўчаты

Калі пройдзе шок першых сутак, гэтыя дзяўчаты будуць сьпяваць на два галасы «Паветраны шар» і дражніць турэмшчыкаў, нават званком выкліка варты вызвоньваючы «Жыве Беларусь!».

Сукамэрнікі, затрыманыя пазьней, расказваюць, што гэта дзяўчаты заскандавалі «Застаёмся!», калі Казулін увечары 21-га прапанаваў зьняць намётавае мястэчка, Мілінкевіч вагаўся, а мужчыны маўчалі.

Адзін з артыкулаў у мінулым нумары «НН» называўся «Першы дзень рэвалюцыі». Але не было рэвалюцыі, былі пратэсты. Мне падалося, што яны былі больш маральнага, чым палітычнага характару, і калі ва ўладзе ёсьць хоць адзін цьвярозы чалавек, ён ня мог не зьвярнуць увагі на тое, што кожныя два з трох аўтамабіляў, якія праяжджалі праз Плошчу, сыгналілі на знак салідарнасьці зь мітынгоўцамі. Кажуць, ад 21 сакавіка ДАІ пачало перадаваць нумары сыгнальшчыкаў пастам, якія штрафавалі іх праз два кварталы. Не на плошчы, дзе адбывалася гуляньне ў «дэмакратычны фасад».

## Замкнёная прастора

Я сяджу на доўгай драўлянай лаўцы (на якой і сплю). Мае сукамэрнікі цясьней прыціскаюцца сьпінамі адзін да аднаго на нарах — сьпяць вальтом — падцягваюць курткі з ног на сьцёгны, падтыкаюць рукавы. Бо холад паўзе з закратаванае адтуліны з пажарным апавяшчальнікам, што паміж камэрай і калідорам, дзьме з зацягнутай сеткай аконнае рамы, дзе замест шыбы ўстаўленае непразрыстае ўзмоцненае шкло — з такога пры позьніх саветах рабілі піжоністыя дзьверы ў кватэрныя блёкі панэльных шматпавярховак. Акрэсьціна нарэшце сьціхла. На батарэі сушацца шкарпэткі. У папяльнічцы, зробленай з кавалка хлеба — адзінага даступнага матэрыялу — тырчаць бычкі «Кента». На карычневай драўлянай падлозе адбіваецца лямпачка, у калідоры кашляе вартавы, на абабітых бляхаю дзьвярах вылучаецца квадрат кармушкі, праз якую нам у камэру двойчы на дзень падаюць есьці. Калі ты не пакутуеш на кляўстрафобію, тут спакойна і па-свойму зацішна. Ты забясьпечаны, ад цябе нічога не залежыць.

Падчас зьняволеньня, як у часе цяжарнасьці, трывожна напачатку і пры канцы. У камэрах абмяркоўваюць, якіх правакацый можна чакаць «на выхадзе». Амаль кожны тут мае знаёмага, на якім «вісіць» палітычна матываваная крымінальная справа. Асабліва балюча было чуць ад Сяргея Салаша (яго падсадзілі да нас на адну ноч перад судом) пра тое, што музэйшчыку Кастусю Шыдлоўскаму ў Браславе падкінулі наркотыкі. Ад гэтай улады можна чакаць усяго. Вярнуліся найгоршыя прыёмы савецкіх часоў, прытым што сам рэпрэсіўны апарат разбух.

## Разьдзьмутыя структуры

Савецкі Саюз рыхтаваўся да вайны з вонкавым ворагам і ўкладаў грошы ў складаныя ракеты. Лукашэнкаўская ўлада ўсе сродкі ўкладае ў змаганьне з унутраным ворагам, таму так размножыліся і разрасьліся СОБР, «Алмаз», ПМСП, спэцаддзелы Службы аховы прэзыдэнта, КДБ. Над імі — Рада бясьпекі і Віктар Лукашэнка, які гэтым апаратам загадвае. Унутраныя войскі вырасьлі шматкроць у параўнаньні з савецкім часам. Здаецца, вакол Плошчы дзейнічае кожная з гэтых структураў.

Арышты адбываліся па-рознаму. Чуў ад аднаго студэнта, як «алмазаўцы» зьбіралі сваіх затрыманых у сквэры Янкі Купалы, зьбівалі і дастаўлялі на Акрэсьціна, паклаўшы штабэлямі на падлогу аўтобуса. Ня ведаю, ці ёсьць тут перабольшаньні. У «зуброў» і некаторых рэгіянальных актывістаў праслухоўвалі тэлефоны. І бралі іх як асабліва небясьпечных злачынцаў, у электрычках або на кватэрах, зьнятых у Менску на суткі.

Наколькі можна меркаваць з асабістага кантакту, рэжым зможа абапірацца на тысячу адборных байцоў сваіх спэцпадразьдзяленьняў датуль, пакуль у яго будуць грошы ім плаціць. Элітныя аддзелы выхоўваюцца ў духу абсалютнай вернасьці загаду камандзіра, закон для іх — справа другасная. Байцы не адчуваюць дыскамфорту, выстаўляючы заведама фальшывыя абвінавачаньні кшталту «нецэнзурнай лаянкі» і г.д.

Рэпрэсіўная сыстэма выбудавалася. «Ідэалягічная вэртыкаль» замяняе сабой партыйную структуру. Яна каардынуе працу па індактрынацыі й кантралюе паводзіны людзей. Вэртыкаль цесна змыкаецца з апаратам спэцслужбаў (намесьнікі па ідэалёгіі часта выконваюць і абавязкі намесьнікаў па кадрах). Разам яны арганізуюць ці фальсыфікуюць псэўдавыбарныя

**Працяг са старонцы 6.**

# Вясна-2006

**Працяг са старонкі 5.**

працэдуры. Усё гэта адбываецца пад аркестар кіраваных СМІ. Пратэсты душацца сілавымі структурамі, пажадана прэвэнтыўна, прычым суды, выбаркамы і г.д. проста зацьвярджаюць прынятыя наверсе рашэньні. Спрыяльная эканамічная каньюнктура дазваляе ўдзельнікам гэтай сыстэмы верыць у яе даўгавечнасьць і, што немалаважна, справядлівасьць. Здаецца, лукашэнкаўская сыстэма, як і савецкая, будзе спараджаць бязьмежную духоўную карупцыю й прапагандысцкі ідыятызм. Аднак на першых парах яна выклікае ў тых, каму прыносіць матэрыяльную карысьць і ідэалягічнае задавальненьне, амаль таталітарную адданасьць. Гэта можна назіраць па Лідзіі Ярмошынай.

## Таямнічыя візытанты

Мы, насельнікі камэры №13, назіралі гэта на іншым чалавеку. Хто ён — мы так да канца і не зразумелі. Чаму ён прыходзіў — таксама. Гэта было ў пятніцу, 24 сакавіка, увечары. У ноч з 23 на 24 сакавіка якраз зьнесьлі намётавае мястэчка.

Да нас у камэру ўвайшлі двое ў цывільным у суправаджэньні акрэсьцінскіх начальнікаў-міліцыянтаў. Першы — бляндын у норкавай шапцы, з пранізьлівым неміргаючым позіркам. За такі ўзялі б на ролю эсэсаўца на «Беларусьфільм». Ён запатрабаваў расказаць, хто з нас кім працуе. Маўляў, вырашылі абысьці камэры і пабачыць, «што за публика устроила эти беспорядки». «Мы вас ещё соберём вместе с заместителем министра образования», — заявіў ён наймалодшаму з нас. «Чего тебе не хватает? Тебе денег мало платят?» — наляцеў на праграміста. Пікіроўка з ды-джэем скончылася кароткай лекцыяй, зь якой мы даведаліся, што:

— Казулін — здраднік і поп Гапон, за ім няма нікога, апроч тых трыццаці чалавек, што суправаджалі яго ў Палац чыгуначнікаў 2 сакавіка. Казуліну напісалі праграму, у якой слова «Беларусь» можна было б замяніць на «Ніжагародзкая вобласьць»;

— Мілінкевіч — мямля;

— нас выкарыстоўваюць, каб зарабіць грошы, вялікія грошы. І, пакуль мы мерзьлі, Мілінкевіч зь сям'ёй вячэраў у кабаку зь вінцом;

— у Беларусі будуецца дзяржава для народу, і ніхто ня мае права аспрэчваць волю 83% выбарцаў;

— любыя акцыі пратэсту будуць жорстка спыняцца.

Тут ён апэляваў да другога цывільнага, якога назваў сваім «сябрам па вучобе, які цяпер працуе ў Расеі».

Візытанты рэціраваліся, калі Вадзім Александровіч уступіў зь імі ў палеміку па-беларуску. Расейскі «калега» спытаўся ў начальніка ІВС, «на каком языке говорит этот осуждённый?». «На белорусском», — адказалі яму.

Візытанты сышлі, а мы сталі думаць, хто ж гэта быў. Спыталіся ў вартавога, ён сказаў «намесьнік міністра». Але выпраўкай і манэрамі візытант не выглядаў як намесьнік міністра ўнутраных справаў, хутчэй, як супрацоўнік спэцслужбы. Ці спэцпадраздзяленьня. Я доўга ўспамінаў, дзе бачыў гэты твар. Ці ня ён сядзеў паміж А.Лукашэнкам, С.Сідорскім і М.Паўлавым на матчы Беларусь—Гішпанія? І што рабіў побач з гэтым беларускім інкогніта ў цывільным расейскі спэцслужбіст? Ці азначае гэта, што 19—25 сакавіка ў Менску прысутнічаў расейскі дарадца(-ы)? Цікавы быў бы паварот.

Што значыў гэты візыт? Магчыма, проста жаданьне пабачыць «ваеннапалонных» на свае вочы. Хто яны, каторыя наважваюцца кідаць выклік імпэрыі? Найбольш парадавала нас у словах гэтага цывільнага тое, што з намётавага мястэчка перад штурмам ніхто ня выйшаў «кроме наших».

## Тэрапія ахвярнасьцю

Знадворку сьвітае, значыць камэра №13 неўзабаве прачнецца. Трэба закругляцца: пісаць пад размовы, перакуры і фізыялягічнае жыцьцё сямі сукамэрнікаў нерэальна.

Краіна зрабіла яшчэ адзін крок ад нармальнасьці. Было нагнятаньне атмасфэры тэрору перад выбарамі й здушэньне пратэстаў Сакавіка-2006 мэтадам татальных арыштаў.

Больш ня мае значэньня, парушаеш ты закон ці не. Цябе могуць адлічыць, звольніць, зьбіць, затрымаць, пасадзіць, варта табе весьці любую дзейнасьць, прыраўненую да апазыцыйнай.

Рэжым хацеў задушыць мястэчка блякадай, узяць на змор. Самая сутнасьць рэжыму праявілася ў гэтых арыштах людзей па дарозе ў туалеты, хапаньні дзяўчат з тэрмасамі, маскіроўцы аўтазакаў за бігбордамі «За процветающую Беларусь». Для гэтага рэжыму тэлекарцінка важыць больш за ўсё астатняе. Улады інтэрнавалі ўсіх, хто падаваўся ім прэвэнтыўным арганізатарам пратэстаў, пасьля затрымлівалі ўсіх запальшчыкаў пратэсту. Але адбылося неспадзяванае — на месца кожнага затрыманага прыходзілі тры новыя, а прадукты людзі сталі прарносіць на сабе. Фатографы задакумэнтавалі шчасьлівы твар хлапчука, які распрануўся і здымае абкручаныя вакол цела сасіскі.

Існаваньне намётавага мястэчка паклікала тысячы людзей на геройскія ўчынкі, малыя і вялікія. І гэтыя ўчынкі застануцца зь людзьмі на гады, асьвятляючы іх сэрцы.

Тэрапія ахвярнасьцю — вось чым былі пратэсты Вясны-2006. Улады зразумелі, што прайгралі. Нязграбна зьнішчылі мястэчка. Гэта не дапамагло, таму на Дзень Волі ўлады пайшлі на зусім прымітыўную правакацыю. Так я бачу карціну гэтых дзён, большую частку якіх правёў за кратамі. Калі памыляюся, папраўце.

Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што пасьля 19 сакавіка Беларусь прачнецца іншай — сьмелай і свабоднай. Я ня быў пэўны, што гэта не прапагандысцкі зварот. Я ня ведаю, што там у вас на волі. Я ня ведаю, хто там яшчэ на волі. Я баўлю гэтыя дзесяць дзён сярод людзей, якія прайшлі тэрапію ахвярнасьцю, і гэта сьветлыя дні сярод сьветлых людзей. Магчыма, Мілінкевіч не памыляўся.

*23.00, 27 сакавіка — 6.00, 28 сакавіка*

# Спэцназ зьбіў вязьня нацызму



У рэдакцыю «НН» затэлефанаваў чалавек, пацярпелы 25 сакавіка.

65-гадовы Ўладзімер Шадзенка 25 сакавіка прыехаў зь Віцебшчыны ў сталіцу сьвяткаваць Дзень Волі.

«На сам мітынг я прыпазьніўся, таму з сквэру Янкі Купалы пайшоў з калёнай. Побач са мной ішла жанчына, зь якой мы размаўлялі ўсю дарогу. Дайшлі да віядука праз праспэкт Дзяржынскага, а там стаяць гэтыя — са шчытамі, у камуфляжы. Грукаюць палкамі, сунуцца ў наш бок. Я бліжэй пайшоў, каб паглядзець, бо баяцца — гэта не для мяне».

Сп.Уладзімер кажа, што адзін з спэцназаўцаў яго пхнуў шчытом: «Я пхнуў яго ў адказ — па-мужчынску. Тады да мяне падскочыў другі, стаў біць. Нехта стукнуў ззаду па галаве — я асеў у сьнег. Памятаю, што кінуліся лупцаваць: у мяне на руках і нагах засталіся сінякі. Жанчыны загаласілі, што забіваюць. Здаецца, потым я пачуў каманду «Адставіць!». Больш нічога ня памятаю».

Ачомаўся сп.Уладзімер толькі на ганку 4-й больніцы. Мэдсёстры паведамілі, што яго прывезьлі АМАПаўцы. «Думаю, яны агледзелі дакумэнты, якія былі ў мяне. Я пашпарт спэцыяльна ня браў, а ўзяў пасьведчаньне малалетняга вязьня нацызму: я быў у Асьвенціме, маці мая там засталася... Таму, відаць, мяне не арыштавалі й нідзе дагэтуль не называюць маё прозьвішча. Маўляў, быў вязень нацызму — а цяпер вязень гэтага рэжыму», — разважае сп.Шадзенка.

У 4-й больніцы Шадзенку наклалі швы, выдалі два накіраваньні на абсьледаваньне (адно зь іх на рэнтген). Пры гэтым у адным з накіраваньняў напісалі... «алькагольнае ап’яненьне». Што праўда, даведкі пасьля абсьледаваньня пра «ап’яненьне» ўжо ня згадвалі. «Якое ап’яненьне, калі я на машыне?.. Выштурхнулі мяне з больніцы — куртка, шапка ў крыві, куды ехаць — ня ведаю, бо з горадам не знаёмы». Дабраўся да знаёмых, пераначаваў у іх і толькі наступнага дня выправіўся дадому.

Уладзімер Шадзенка лічыць, што справядлівасьць павінна быць узноўленая: «Павінны быць названыя ўсе імёны: і тых, хто пацярпеў, і тых, хто біў. Калі Паўлічэнка кажа, што пагаварыў з Казуліным па-мужчынску, дык чаго ж ягоныя падначаленыя б’юць з-за сьпіны?»

**Аркадзь Шанскі**

# Справа маладафронтаўцаў

**Чаргов**ую крымінальную справу распачаў аддзел па барацьбе з тэрарызмам і арганізаванай злачыннасьцю КДБ. Моладзевых актывістаў вінавацяць ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі (арт.193 ч.1 КК). Па гэтай частцы артыкулу прадугледжваецца тэрмін арышту на шэсьць месяцаў альбо штраф.

Фігурантамі новай справы сталі Зьміцер Дашкевіч, затрыманы падчас штурму намётавага гарадка і асуджаны на 15 сутак, Сяржук Лісічонак, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан. Усе чатыры хлопцы раней уваходзілі ў кіраўніцтва незарэгістраванага «Маладога фронту».

27 сакавікаператрусы, што ладзілі супрацоўнікі КДБ і міліцыі, адбыліся на кватэрах у С.Лісічонка, А.Корбана і Аляксея Шэіна, у кватэры якога нейкі час жыў Дашкевіч. А.Шэін кажа, штоператрус на ягонай кватэры доўжыўся чатыры гадзіны. Забралі вінчэстэры ад кампутараў і літаратуру. Аргтэхніку і літаратуру канфіскавалі і ў С.Лісічонка. Ягоная жонка кажа, што мужа пасьляператрусу забралі супрацоўнікі органаў. Куды павезьлі — не паведамілі. «Яны ўсё сьмяяліся, што дарогай можа адбыцца транспартнае здарэньне», — гаворыць Вольга, якая засталася дома з 10-месячным дзіцем. Затрыманы і Алег Корбан.

Толькі позна ўвечары Лісічонак вярнуўся дадому. Пра што яго пыталі сьледчыя — ня кажа: даў падпіску. Пад такой самай падпіскай і ягоны адвакат Павал Сапелка.

Гарэцкі да сябе на кватэру кадэбістаў 27 сакавіка не пусьціў, бо яны ня мелі ордэру на арышт. На наступны дзень яны прыйшлі з ордэрам, правяліператрус і забралі хлопца на допыт.

Крымінальная справа маладафронтаўцаў — наступная за справай «Партнэрства». Яшчэ адна крымінальная справа за ўдзел у «Маладым фронце» заведзеная на актывістку зь Нясьвіжу Насту Азарку.

Допыты моладзевых актывістаў пачаліся па ўсёй краіне. 28 лістапада на допыт у КДБ у Лідзе выклікалі Сяргея Чайку, Віталя Калбыку, Яўгена Лапо. У Салігорску 29 лістапада такія ж самыя візыты зьдзейсьнілі Глеб Сандрас, Рыгор Астапеня, Зьміцер Бараноўскі і Іван Шыла. Пакуль што ўсе яны праходзяць як сьведкі ў справе менскіх маладафронтаўцаў, аднак з усіх дапытаных бяруць падпіску, каб яны не распавядалі пра сутнасьць допытаў.

**Аркадзь Шанскі**

# Кроў на Дзень Волі

У Дзень Волі, едучы на плошчу, мы пачулі ў мэтро папярэджаньне: цягнік на станцыі «Кастрычніцкая» не спыняецца. На пытаньне маленькай дзяўчынкі «Чаму?» яе мама толькі змрочна пахітала галавой. Большасьць людзей у вагоне адказ ведала. Рэпартаж **Сямёна Печанка.**

Скрыжаваньне праспэкту і вуліцы Леніна. З розных бакоў — каля ГУМу, каля Нацбанку, каля «Макдоналдсу» — стаіць па пару соцень людзей, «запакаваных» спэцназам у чорным. Міліцыянты, пашыхтаваныя ў некалькі шэрагаў, налягаюць на людзей, адціскаючы ў супрацьлеглы ад плошчы бок. Людзі час ад часу робяць спробы вырвацца на праспэкт, але ўсё ж патроху пасоўваюцца ў бок Паштамту. Крычалку «Міліцыя з народам» хтосьці перарабіў, замяніўшы «народ» на «ўрода». Невялікая аварыя, што здарылася непадалёк ад будынку КДБ, выклікала саркастычную ўсьмешку: «Столькі ДАІшнікаў — а толку?»

Праз тэлефоны разьбітая на часткі калёна дэманстрантаў каардынуецца: Мілінкевіч будзе ў Купалаўскім сквэры, усе кіруемся туды, абыходзячы спэцназ. На скрыжаваньні вуліц Маркса і Леніна давялося спыніцца: у аўтобусы вярталася ачапленьне з плошчы. Відовішча ўражвала — той колькасьці міліцыі з гакам хапіла б, каб спыніць людзей на праспэкце. А гэта ж былі далёка ня ўсе. За рогам вуліцы прыпаркаваныя новенькія «МАЗы», у якіх у ноч на 24 сакавіка вывозілі з плошчы мітынгоўцаў.





АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Карнікі! — выгукнула бабуля з гвазьдзіком, разглядаючы спэцтранспарт. — Вось такія і ў вайну людзей зь сьвету зжывалі»

З «карнікамі» ў чорным яшчэ раз сутыкнуліся на лесьвіцы, спускаючыся да вуліцы Багдановіча. Многія зь іх адводзілі позіркі.

## «Мы з вамі!»

Вялікую калёну дэманстрантаў мы нагналі ля 2-й клінічнай бальніцы. Два маладзёны набылі ў шапіку па «Саўбелцы», са сьмехам парвалі газэціны на шматкі і трэсьлі імі астатні шлях да сквэру. З машыны, што спынілася на чырвонае сьвятло, жанчына пракрычала: «Мы ня можам прыйсьці сёньня на акцыю, але мы з вамі!»

## Мітынг

Ад помніка Янку Купалу даносіліся выбухі: «Жыве Беларусь!» і «Разам!» — пакуль мы дабіраліся, мітынг пачаўся. Побач з намі сустрэліся студэнты і іх выкладчыкі. І тыя, і другія, мабыць, не чакалі ўбачыць тут адзін аднаго, але відавочна прыйшлі з аднолькавай мэтай.

Пульхны дзяцюк-прадпрымальнік скардзіўся на менчукоў: «Прас...лі Майдан! Мы хіба наезьдзімся з рэгіёнаў? Каб я, напрыклад, быў мянчук, то абавязкова прыйшоў бы на плошчу і ўсіх сваіх прывёў бы. І начаваць застаўся б!»

## Народнае ДАІ

Пасьля выступу Аляксандра Казуліна людзі пачалі фармаваць калёну. Па натоўпе пранеслася: «Ідзём на Акрэсьціна, падтрымаем нашых!» Хто аўтар такой ідэі і колькі ісьці да Акрэсьціна, шмат хто даведаўся пасьля з Інтэрнэту.

Калёна ўвесь час папаўнялася за кошт мінакоў і пасажыраў грамадзкага транспарту, што, пабачыўшы людзей пад сьцягамі, з кветкамі і балёнікамі, далучаліся да шэсьця. Людзі ішлі па ходніках, настроеныя былі выключна мірна. Толькі аднойчы ў раёне перасячэньня з вуліцай Гарадзкі вал адбыўся інцыдэнт: вадзіцель адной з машынаў, незадаволены тым, што яму не даюць праехаць, выйшаў і пачаў лаяцца на дэманстрантаў. Тады нехта ўзяўся кіраваць рухам, па чарзе прапускаючы групы людзей і аўто.

## Першыя перасьцярогі

Удзельнікі шэсьця пачалі атрымліваць SMS-кі пра магчымы разгон. Знаёмыя, што сядзелі ў Інтэрнэце, паведамлялі пра высоўваньне ў раён праспэкту Дзяржынскага вялікіх сілаў міліцыі і вайскоўцаў. На людзей гэтыя паведамленьні мала дзейнічалі — колькі ўжо такім спосабам ім манілі пра «выбухі» і «праліцьцё крыві». Калёна працягвала рух. Аўто, што праносіліся побач з дэманстрантамі, вітальна сыгналілі. На сыгнал салідарнасьці наважыўся нават вадзіцель сустрэчнага тралейбуса.

## Сутычка

Каля тэатру Музкамэдыі па натоўпе пранеслася: «Кардон!» Дэманстранты пачулі застрашвальны грукат дубінак па шчытах. Дасьвечаныя пазнавалі па форме СОБРаўцаў і вайскоўцаў унутраных войскаў. Калёны параўняліся. З-за шчытоў наперад выступіў Паўлічэнка ў суправаджэньні двух ахоўнікаў. Яны перашкодзілі Казуліну, што разам зь сьвятарамі выйшаў з натоўпу дамовіцца, як высьветлілася пазьней, аб мірным сыходзе мерапрыемства. Перамоваў ня выйшла. Пачаўся брутальны разгон. Паўсюль званілі тэлефоны, людзі нэрвова крычалі: «Нас разганяюць! Нешта выбухнула!» Па гуку гэтыя выбухі



нагадвалі вайсковыя выбуховыя пакеты. Пачалі зьяўляцца першыя ахвяры калатнечы — з пабітымі насамі, сінякамі. Нехта, кульгаючы, спрабаваў ускарабкацца на схіл, але скаціўся акурат пад ногі «праваахоўнікам», каторыя ўчацьвярох пачалі біць яго хто чым. Некалькі чалавек ляжалі паблізу ходнікаў нерухомыя.

## Зачыстка тэрыторыі

Пачулася сырэна «хуткай». Нейкі час яна не магла прабіцца да месца, дзе проста на асфальце ляжаў нерухомы сталы мужчына з акрываўленай галавой. Па натоўпе там-сям пачало праносіцца: «Тут забітыя!» Мэдыкі не маглі прабіцца праз ачапленьне. У розных месцах працягвалася зьбіцьцё дэманстрантаў: білі ўсіх — дзяўчат, жанчын, пажылых і маладых. Пры гэтым амапаўцы брудна лаяліся.

Побач нехта закрычаў: «Казуліна б’юць!» Калі я падбег да месца падзеяў, экс-кандыдата ў прэзыдэнты ўжо зацягвалі ў аўтобус. «Касманаўты» ў гэты час білі сьвятароў, што хацелі заступіцца за Казуліна.

Натоўп рассыпаўся па вуліцы. Дэманстранты пачалі зьбірацца ў невялічкія групы. Дзе-нідзе працягвалі скандаваць лёзунгі. Нехта прапанаваў вяртацца ў цэнтар.

Па дарозе на ўдзельнікаў шэсьця распачалася сапраўднае паляваньне. Асабліва лютавалі людзі ў форме на скрыжаваньні вуліцаў Нямігі і Караля.

Спэцназаўцы ўварваліся нават на другі знадворны паверх «Гандлёвага дому на Нямізе» — зьбівалі ўсіх, хто меў хоць нейкія адзнакі мітынгоўцаў: значкі, джынсавыя стужкі — альбо прыкметы нядаўняга кантакту з «праваахоўнікамі» на праспэкце Дзяржынскага.

# Звон Свабоды ў няволі

Уначы з 21 на 22 сакавіка ў Менску затрыманы ўнікальны мастацкі твор — Звон Свабоды (падрабязьней пра яго гл. «НН» №2 за 13 студзеня 2006 г.). Ён дагэтуль знаходзіцца ў Цэнтральным РАУС сталіцы.


ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

**Звон Свабоды на Кастрычніцкай Плошчы 20 сакавіка.**

Упершыню Звон загучаў на Кастрычніцкім пляцы 20 сакавіка. Аўтары Звана Алесь Шатэрнік і Аляксей Марачкін кажуць, што да іх зьвярнуліся актывісты каманды Казуліна і прапанавалі прынесьці яго на пляц. Шатэрнік, які раней казаў, што Звон будзе гучаць на Дзень Волі, пагадзіўся: «Мне Алесь Пашкевіч (старшыня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. — **«НН»**) гарантаваў, што яны вернуць Звон назад. Я ідаверыўся пад гарантыю Пашкевічавага слова».

Звон загучаў над тэрыторыяй Вольнай Беларусі — на пляцы, якому яго абаронцы з прапановы Ўладзімера Арлова надалі імя Кастуся Каліноўскага. Аднак пазьней, калі Звон вывозілі з пляцу, машыну зь ім затрымалі міліцыянты. У гэты час у аўтамабілі былі А.Пашкевіч, актывіст казулінскай каманды Мікалай Карпачоў і кіроўца. Сьпярша міліцыянты выстаўлялі прэтэнзіі да аўтамабіля, але ўрэшце стала ясна, што ім патрэбны Звон. Яго канфіскавалі, патрабуючы паказаць дакументы на мастацкі твор (ці ж жарт — больш за 100 кг каляровага мэталу, бронзы?).

Па недасьведчанасьці затрыманых (вэрсія А.Шатэрніка) ці па самадурстве міліцыі (вэрсія Ніны Шыдлоўскай, прэс-сакратаркі А.Казуліна) ніхто з суправаджальнікаў не парупіўся запатрабаваць копію пратаколу канфіскацыі. «Ім паказалі паперу, але ў рукі не далі», — кажа Н.Шыдлоўская.

На цяперашні момант А.Шатэрнік сабраў дакумэнты, якія сьведчаць, што ён аўтар Звона Свабоды. Гэтыя сьведчаньні ён мае падаць у Цэнтральны РАУС, каб вярнуць свой твор. «Думаю, яго забралі адмыслова, каб Звон Свабоды не прагучаў на Дзень Волі, — кажа скульптар. — Але гэта сьвятая рэч, у гэтай бронзе гучыць Боская душа. Там напісаныя словы Біблії, словы сьвятой Эўфрасіньні Полацкай. І трымаць гэтую рэч за кратамі — блюзьнерства, на яе нельга ўздымаць руку. З тымі, хто падыме на Звон руку, будзе тое, што і з тымі, хто нішчыў храмы: пра іх усіх расказваюць, што яны былі пакараныя потым».

Шатэрнік упэўнены, што Звону Свабоды нічога не пагражае: сьвятая рэч здольная абараніць сябе. «Наўрад ці ў каго падымецца рука на яго». Прыкладна тую ж думку ў даступнай для сябе форме карэспандэнту «НН» выказаў і дзяжурны міліцыянт Цэнтральнага РАУС: «Ды каму ён трэба — ваш Звон? Зьвярніцеся ў прэс-цэнтар ГУУС». Кіраўнік прэс-цэнтру Менскага ГУУС Алег Сьлепчанка, у сваю чаргу, быў ляканічны: «Я ад вас упершыню чую, у нас жа ёсьць ня ўся інфармацыя. Чаму з Цэнтральнага РАУС паслалі да нас? Ня ведаю — можа, у іх не было часу вам адказваць».

Скульптар кажа, што хоча падарыць свой твор Менску: «Многія краіны маюць свой Пляц Волі і Звон Свабоды. У Менску каля ратушы была гадзіньнікавая вежа, дзе мог бы гучаць Звон Свабоды. У будынку насупраць ратушы, дзе цяпер музычны каледж, прымалася Трэцяя Ўстаўная грамата БНР. Ён мог бы гучаць і там».

**Адам Воршыч**

## Судзьдзі сыходзяць

Судзьдзі Савецкага суду Менску Алена Крайчык і Руслан Казадаеў, вядомыя сваімі прысудамі ўдзельнікам мірных акцыяў пратэсту, звольненыя “з уласнага жаданьня”. Такая фармулёўка, паведамляе АФН, пазначана ў указе прэзыдэнта №180 “Аб вызваленьні ад пасадаў судзьдзяў судоў Рэспублікі Беларусі” ад 28 сакавіка 2006 г. Казадаеў і Крайчык — адзіныя ў сьпісе, хто пакідае пасаду не з нагоды пэнсійнага веку. Беларускія праваабаронцы ўнесьлі іхныя імёны ў сьпіс асобаў, супраць якіх прапануецца прыняць абмежавальныя меры.

**АШ**

# Трэцяя рэвалюцыя Веранікі

Стажэрку люблінскага выпуску «Газэты выборчай» Вераніку Самалінськую затрымалі ў ноч на 24 сакавіка разам з астатнімі жыхарамі намётавага гарадка на Кастрычніцкім пляцы. Суд Ленінскага раёну Менску 27 сакавіка асудзіў яе на 10 сутак за «ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве».

Зь Веранікай я пазнаёміўся ў 2002 г., калі яна разам з групай кракаўскіх студэнтаў прыехала ў Беларусь. Вераніка была ў групе наймалодшая. Дзяўчыну вылучала прага да нефармальных кантактаў са звычайнымі беларусамі — ёй яўна бракавала афіцыйных экскурсіяў.

Летась Вераніка займалася арганізацыяй у Любліне канцэртаў забароненых беларускіх гуртоў, брала ўдзел у акцыях салідарнасьці, пісала пра гэта ў «Газэту выборчу».

19 сакавіка, калі мы разам ішлі на плошчу, дзяўчына пажартавала, што для яе гэта трэцяя рэвалюцыя: «Мама, калі была цяжарная мною, хадзіла на акцыі «Салідарнасьці». Другая рэвалюцыя — украінская. Дзяўчына была на Майдане ў самыя гарачыя дні.

Улетку, падчас прыезду на выпускны вечар Беларускага ліцэю, Вераніка цешылася, што прэзыдэнцкія выбары ў нас пройдуць улетку: «Надта ж халодна зімой у намётах. Рабіце рэвалюцыю летам, і я да вас абавязкова прыеду». Але ўсё адно прыехала.

У Веранікі была гасьцявая віза: яна баялася, што ў якасьці журналісткі яе сюды ня пусьцяць. Зьнешні выгляд яе, аднак, прыцягнуў увагу не аднаго беларуса: «бундэсвэраўская» куртка зь бел-чырвона-белым значкам, стракаты шалік з налепкай «Юшчанку — так!» і велічэзны заплечнік з памаранчавай стужкай. Хоць у выданьні пра Беларусь піша Вацлаў Радзівіновіч, а Вераніка — пра Люблін, яна зрабіла шэраг артыкулаў пра выбары — пра датэрміновае галасаваньне, рэпартажы з канцэрту на Бангалоры і з Кастрычніцкай плошчы 19 сакавіка. Канцэрт, нягледзячы на дрэнны гук і няўтульнасьць плошчы, зрабіў на яе вялікае ўражаньне: «У вас сапраўдны жывы рок!» А Плошча зьдзівіла мужнасьцю беларусаў, што не спалохаліся страшылак КДБ.

Беларускі Майдан ёй спадабаўся больш, чым украінскі: «Вы больш дружныя і арганізаваныя. На плошчы я сутыкнулася зь неверагодным прыкладам узаемадапамогі — незнаёмыя людзі гатовыя аддаць апошняе».

Потым Вераніка на пару дзён зьехала ў Горадню, дзе яе ўразіў візыт у мясцовы штаб Мілінкевіча: у пустым офісе за кампутарам сядзіць Віктар Шалкевіч, які на пытаньне «Дзе ўсе?», коратка адказвае: «Сядзяць!» У Менск Вераніка разам з гарадзенскімі сябрамі прыехала ў чацьвер і ад абеду была ў намётавым гарадку. Увечары пайшла ў інтэрнэт-кавярню адаслаць матэрыялы для «GW». Казала, што тыя дзесяць хвілінаў, што яна выбіралася з плошчы, былі «самымі страшнымі ў яе жыцьці».

Мама Веранікі кажа пра яе ідэалізаванае ўяўленьне пра беларусаў, як пра «выбітны народ добрых людзей». Пасьля вучобы ў Польшчы Вераніка марыла паступіць у адну зь беларускіх ВНУ, каб пасьля працаваць у Беларусі.

Падчас начной «спэцапэрацыі» па згортваньні намётаў Вераніка не скарысталася з магчымасьці сысьці разам з журналістамі. Але я б моцна зьдзівіўся, каб яна гэтым «правам» скарысталася. На ўгаворы пайсьці начаваць да сяброў на кватэру адказала: «Застануся да канца».

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вераніка Самалінская ў судзе.**



**Павал Севярынец — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.**

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Выбарчы кодэкс

«…Галасуйце за Аляксандра… — твар 70-гадовай бабулькі расьцьвітае, — …Мілінкевіча!» Спалоханая старая жахаецца. Як?! Прэзыдэнт Аляксандар — не-Лукашэнка?..

«Ці дасьць Мілінкевіч разгарнуцца фэрмэрам?» — зморана, але з надзеяй пытае кабета гадоў 40, якой ля Сітна вылучылі 20 га пяску і цяпер абдзіраюць бы ліпку.

«Толькі за Лукашэнку!» — ледзь адчыніўшы дзьверы, заяўляе немаладая жанчына з палаючымі чорнымі вачыма. З-за яе сьпіны высоўваецца мужык: «Давай сюды, мы будзем за Мілінкевіча». «За Лукашэнку…» — не здаецца кабета. «Муж сказаў за Мілінкевіча, значыць — за Мілінкевіча!» — нават хлопаньне дзьвярэй не заглушае раптоўнай сямейнай сваркі.

«Дык што, цяпер усе галасуем за яго? — прастадушна пытае бабуля веку Кастрычніцкае рэвалюцыі. — А ці зьменіцца яно да лепшага?» «Зьменіцца, абавязкова зьменіцца!» «Ой, мы ўжо не дажывём» — сумняецца бабулька. «Дай вам Божа здароўя — дажывём!» «Дай Божа…» — зь нечаканай цеплынёй прыгортвае бабулька да грудзей «Мілінкевіча» і ўсьміхаецца амаль дзіцячай усьмешкай.

«За Мілінкевіча? Паша, бутэлька — і хоць за чорта лысага!» Не, мы ня ўдзельнічаем у спойваньні беларускага народу.

Кампанія «ад дзьвярэй да дзьвярэй» мэтадычна, хата за хатай, прасоўваецца па Малым Сітне. Сабакі шалеюць, брэшуць, рвуцца на ланцугах і ашчэрваюцца так шчыра, быццам іх нацкоўвалі адмыслова на нацыяналістаў.

«Колькі табе за гэта даюць?» — ківае на агітацыю магутны лясьнік, выразным жэстам пацiраючы пальцы ў шчэпці. «Два гады «хіміі», — адказваю, — а нашым маладафронтаўцам зараз даюць яшчэ больш».

У чацьвер, 16 сакавіка, увечары ў інтэрнат зьяўляецца ўчастковы й тры міліцыянты з раёну (зусім ня простыя — кіраўнік полацкага крымінальнага вышуку, начальнік ДАІ і нейкі чын у цывільным, які камандуе парадам). «У Сітне ўчынена злачынства. Правяраем увесь кантынгент. Севярынец і Яхімовіч [мой сусед], едзем у сельсавет разьбірацца». Іншыя тры «хімікі» гасьцей чамусьці не цікавяць. Майго суседа пакідаюць у машыне, мяне заводзяць на прахадную леспрамгасу, дзе прысутнічае адно незнаёмы мне мужык «пад градусам». Міліцыянты час ад часу водзяць мужыка за дзьверы, пэўна, на інструктаж, і ўрэшце той заходзіць ды заяўляе мне: «Прапала бэнзапіла. Прызнавайся, а то будзе горш!..» Ясна, правакацыя. «У аддзел!» — коратка распараджаецца незнаёмец у цывільным, і мяне

## СЬЦІСЛА

**Ліда**

Навучэнцу зь Ліды **Сяргею Чайку** з 17 сакавіка адміністрацыя ўстановы (дырэктар Ю.Грыневіч) пагражае выключэньнем: Чайка распаўсюджваў агітацыйныя матэрыялы Мілінкевіча.

**Шукаюць крымінал**

22 сакавіка ўвечары ў цэнтры Менску былі затрыманыя **Сяржук Салаш** і **Сяргей Сацук** — актывісты штабу А.Мілінкевіча. Затрыманьне праводзілі супрацоўнікі КДБ (у цывільным) і міліцыянты з Кастрычніцкага РУУС. Пры сабе кадэбісты мелі раздрукоўкі тэлефонных размоваў С.Салаша. Актывістам выстаўляюць абвінавачаньне ў крымінальнай справе па «падрыхтоўцы масавых беспарадкаў».

Крымінальную справу рыхтуюць на маладафронтаўцаў з Жодзіна **Сержука Гудзіліна**, **Яўгена Ваўкаўца** і **Алеся Чырэйку**. 22 сакавіка хлопцаў двойчы выклікалі на допыт. Паводле папярэдняй інфармацыі, на іх зьбіраюцца завесьці крымінальную справу за прыналежнасьць да незарэгістраванай арганізацыі.

**Горадня**

21 сакавіка выпусьцілі з-за кратаў і паўторна арыштавалі на 5 сутак актывістаў **Яўгена Лясоцкага** і **Андруся Мялешку** — за «нецэнзурную лаянку». Лясоцкі быў на волі дзьве гадзіны. Мялешку а 23-й гадзіне 21 сакавіка прывезьлі з ізалятару Ленінскага РАУС на чыгуначны вакзал, дзе затрымалі празь дзьве хвіліны і завезьлі ў спэцпрымальнік Кастрычніцкага РАУС гораду.

На 10 сутак арыштавалі 24 сакавіка актывіста непрызнанага Саюзу палякаў **Анджэя Лісоўскага**. У судовым рашэньні напісалі, што ён «моцна лаяўся на адрас ураду і супрацоўнікаў міліцыі».

**Берасьце**

У Берасьці праваабаронцу **Ўладзімера Вялічкіна** 22 сакавіка паўторна арыштавалі, нават не выпускаючы з-за кратаў: проста адвезьлі з спэцпрымальніка ў РАУС і зноў абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы.

23 сакавіка па заканчэньні арышту на волю так і ня выйшлі **Юрась Губарэвіч**, кіраўнік абласнога штабу А.Мілінкевіча, і **Яўген Пракурат**: іх адвезьлі ў іншы РАУС Берасьця і асудзілі 24 сакавіка на чарговыя 7 сутак.

**Сьцяпана Навасяльчана**, у якога тэрмін скончыўся 24 сакавіка, ня выпусьцілі, а павезьлі з турмы ў РАУС — каб асудзіць на новы тэрмін. Затрыманага гэткім жа чынам 24 сакавіка **Зьмітра Шыманскага** меліся судзіць 27 сакавіка, аднак уначы з 26 сакавіка яму стала блага, і яго паклалі ў інфэкцыйны шпіталь.

**Намётавы гарадок**

21—23 сакавіка за пражываньне ў намётавым гарадку, дапамогу ягоным насельнікам, прысутнасьць каля яго былі асуджаныя Ўладзімер Кішкурна (**1 суткі**), Настасься Васіленка, Настасься Кавалёва, Ганна Кухарава (усе — па **3 сутак**), Тацяна Нядбаева, Зьміцер Галіноўскі, Настасься Мілаванава, Лізавета Пяткевіч, Ліда Саўко, Тацяна Скурат (**5 сутак**), Валер Астраверхаў, Сьвятлана Бабінцава, Аляксандар Буракоў, Ірына Дарафейчук, Юлія Ефімовіч, Ільля Кульбіцкі, Натальля Кунцова, Сяргей Лугін, рок-сьпявачка Сьвятлана Сугака, Юля Яхімовіч, Міхаіл Уласаў (**7 сутак**), Андрэй Адамовіч, Віталь Алейнік, журналіст Вадзім Александровіч, Аляксандар Карапыш, Аляксей Амелін, Кацярына Аніскевіч, В.Анушкевіч, Канстанцін Арцёменка, Сяргей Бабіцкі, Ян Бабіцкі, Яўген Бірук, Алег Борын, Валер Браднеўскі, Аляксей Буклей, Аляксандар Варахоб, Раман

# Малога Сітна

цягнуць у машыну.

У Полацкім райаддзеле складаецца пратакол па «хуліганцы»: «Размахваў рукамі, нецэнзурна лаяўся, спрабаваў учыніць бойку».

Адмаўляюся што-небудзь падпісваць. Вязуць у гарадзкі ізалятар. І міліцыянты-ахоўнікі, і люд, што сядзіць на «сутках», абмяркоўваюць «выбары», згаджаюцца, што налічаць, як мае быць, кажуць: сыстэму абавязкова трэба мяняць.

Назаўтра ў судзе мужык, які нібыта згубіў пілу, блытаецца ў паказаньнях: «Ён нешта казаў па-беларуску… Можа, лаяўся так… матам». «У беларускай мове мату няма», — адказваю. Судзьдзя (між іншым, з Вушаччыны) нечакана згаджаецца, і — першы выпадак за 10 гадоў! — мяне вызваляе. Але за дзьвярыма ўжо стаіць начальнік спэцкамэндатуры з брыгадай. Вязуць у Ветрына, дзе дзьве гадзіны чакаюць указаньняў «з вышыні». Нарэшце адбіраюць у мяне пасьведчаньне даверанай асобы Мілінкевіча, забараняюць назіраць на выбарах і пад канвоем двух супрацоўнікаў вязуць у Сітна. Селяць у пакой зь міліцыянтамі: цяпер любы выхад на вуліцу — толькі ўтрох. Даведваюся — пакуль я быў у Полацку, з пакою зьніклі ўсе грошы.

У леспрамгасе пярэпалах. Убачыўшы настрой галасаваць за Мілінкевіча, начальства распускае чуткі: маўляў, Севярынец падкупае людзей, частуе іх «максімкай» і цукеркамі. Люд абурана абвяргае «дэзу» перад міліцыянтамі.

А 8-й раніцы 19 сакавіка ў інтэрнат прыбывае «падмацаваньне»: абласны кіраўнік камітэту выкананьня пакараньня са сьвітай і начальнік камэндатуры. Шасьцёра чыноў вартуюць аднаго «хіміка»! Галасаваньне — пад канвоем. Кіраўнік камісіі адмаўляецца даць інфармацыю пра датэрміновае галасаваньне (хаця мне ўжо паведамілі — каля 40%).

Пасьля таго, як у Менску дзясяткі тысячаў людзей выходзяць на плошчу, «варта» атрымлівае тэлефонны загад: сядзець у Сітне і ў панядзелак, і ў аўторак, і ў сераду…

Заявам сіценскай камісіі пра тое, што за Мілінкевіча ў вёсцы прагаласавала ўсяго 22 чалавекі, людзі ня вераць: «А чаго тады Пашу назіраць не пусьцілі?!» «Менск бушуе!» — задаволена кажуць вяскоўцы і паказваюць, каб міліцыянты ня бачылі: трымайся!

Штовечар па тэлевізіі разам з «вартаўнікамі» бачым шматтысячныя аграмады пад бел-чырвона-белымі сьцягамі Хрыста. Рух Божае волі апаноўвае сэрца Беларусі!

Гэта не Майдан. Гэта беларуская Плошча. Плошча Перамогі.

*в.Малое Сітна*

— Колькі табе за гэта даюць?
— Два гады «хіміі».

## СЬЦІСЛА

Вахрамееў, Андрэй Вінакураў, Павал Галембіеўскі, Алег Гаўрылаў, В.Гец, Уладзімер Грыбовіч, Антаніна Гулько, журналіст Зьміцер Гурневіч, Андрэй Дзенісевіч, Юры Дзюк, Кірыла Жаўток, Уладзімер Захарэвіч, Арцём Золатаў, Уладзімер Казак, Валер Каўбаска, Тацяна Кебікава, Кострычаў, Ліпень, Лугіна, Арцём Лук'янчык, Лучына, Аляксандар Лычаўка, Андрэй Ляневіч, рэжысэр Валер Мазынскі, Аляксандар Малаштан, Лявон Маліноўскі, Ларыса Насановіч, Пажарава, Паліна Пархімовіч, Віктар Пінчук, Аляксей Пішчада, Дар'я Растовіч, Ільля Рашэтнікаў, Канстанцін Рутkоўскі, Гелена Савянкова, Дзяніс Садоўскі, Яўген Самаль, Сьвятаслаў Сокал, Аляксандар Сьцяпанаў, Сяргей Сьцяпанаў, Мікалай Тоўсьцік, Канстанцін Усянок, Уладзімер Усьцінаў, Максім Фралоў, Раман Хандзюнь, Андрэй Церашкоў, Юры Чавусаў, Эдуард Чувак, Канстанцін Чыкалаў, Андрэй Шукала, Мікалай Шуцянкоў, Алесь Шыловіч, Дзяніс Шэлег, Уладзімер Ямкавы, Артур Ярамчук (**10 сутак**), Антон Тарас (**11 сутак**), Алег Барысевіч, Міхась Баярын, Іван Жаніхоў, Іван Шаблінскі (**12 сутак**), грамадзянін Расеі Самвел Сагацелян, Сяргей Салаш (**13 сутак**), Павал Амбрасовіч, Віктар Бурылюк, Іван Ваўчок, Канстанцін Віктаровіч, Уладзіслаў Грабавы, Уладзімер Жароў, Алег Жлутка, Андрэй Зуеў, Міхаіл Кандрашоў, Сяргей Касько, Андрэй Катавусаў, журналіст з Украіны Андрэй Любка, Анатоль Лябедзька, Вольга Маклакава, Юрась Меляшкевіч, Сяргей Міхноў, Станіслаў Стогній, Раман Вусьцінаў, Пятро Церашэнка, Яўген Чарных, Андрэй Шумараў (**15 сутак**). Невядомыя тэрміны арышту: Юля Касьпер, Вадзім Пархімовіч. Штрафамі пакараныя Уладзіслаў Андросаў (1 базавая велічыня), Юры Галавань, Ларыса Куніцкая, Ірына Лаўроўская, Алена Лукашэвіч (па **2 б.в.**), Тамара Лукашэвіч (**20 б.в.**, 620 тыс. руб.). Юр'я Алейніка адпусьцілі, уручыўшы позву. Апраўдалі адзінага чалавека — Вячаслава Навакоўскага, якога захапілі зусім выпадкова пры зачысткі, і ён здолеў гэта даказаць з дапамогай адваката.

Зранку 22 сакавіка зьбітага міліцыянтамі Міхаіла Аўдзеева з плошчы забрала машына хуткай дапамогі. 23 сакавіка затрымалі 68-гадовую Галіну Сіўчык, маці Вячаслава Сіўчыка. Жанчыну адпусьцілі, толькі калі ў яе здарыўся сардэчны спохват і давялося выклікаць хуткую. Самога В.Сіўчыка звабілі з пляцу праваахоўцы: вывезьлі ў машыне зь нібыта дыпляматычнымі амэрыканскімі нумарамі, перасадзілі ў аўтобус, дзе жорстка зьбілі й інсцэнавалі расстрэл.

**Штурм гарадка**

Падчас штурму намётавага гарадка на Кастрычніцкай плошчы ў ноч з 23 на 24 сакавіка затрыманыя Тацяна Грудзько, Аляксандар Плаксіцкі, Арсень Канаплёў (усе асуджаныя на **3 сутак** адміністрацыйнага арышту), Надзея Бабіч, Кацярына Бязмацерных, Вольга Крыванасава, Натальля Крыванасава, Сьвятлана Лявонава, Тацяна Сяверына, Аксана Сяргеенка, Зінаіда Хіло, Кацярына Фурса, Юлія Чуяшова (**4 сутак**), Яўген Афнагель, Барысевіч, Надзея Батура, Іван Бенедыктаў, Будай, Віктар Грышкевіч, Еўціхіеў, Яўген Завесьніцкі, Аляксандар Краўчонак, Юры Пахучы, Павал Прохараў, Кірыла Рабыкін, Рыгор Рудэнкоў, Салодкі, Дзяніс Станкевіч, Мікалай Хіло, Цукрэнка, Цялегін, Міхась Чыжык, Руслан Шалайка (**5 сутак**), Андрэй Адзінцоў, Юлія Ахмадзіева, Ірына Бурак, Яўген Ваўкавец, Яраслаў Берніковіч, Марына Вашкевіч, Сяргей Вераб'ёў, Іна Габрыельчык, Юліян Гайдук, Алена Жызь-




**Пасол Польшчы ў Беларусі (1998-2002) Марыюш Машкевіч, затрыманы ўначы 24 сакавіка ў намётавым лягеры, атрымаў у судзе Ленінскага раёну 15 сутак арышту.**

## ХРОНІКА

неўская, Сьвятлана Жылінская, Зайцаў, Надзея Кавалеўская, Аляксандар Казулін (пляменьнік кандыдата ў прэзыдэнты), Дзяніс Карноў, Алесь Копаць, Настасься Коршук, Ксенія Кручок, Алесь Мазур, Сяргей Мурашка, Алена Пеляпат, Аксана Рудовіч, Антон Сасноўскі, Валерыя Саўчанкава, В.Сахарчук, Віктар Сянько, Натальля Сячко, Субач, Тацяна Ўласенка, Сяргей Церах, Віктар Шмыгаў, Дзяніс Шыйко (**7 сутак**), Дар'я Зялінская (**8 сутак**), Надзея Сінкевіч (**9 сутак**), Мікіта Абраменка, Антон Агароў, Пятро Адамовіч, Багдан Арлоў, Віктар Арлоў, Аляксей Асіпенка, Аўдзейчык, Станіслаў Багданаў, Андрэй Баранаў, Мікіта Баталаў, Павал Батуеў, журналіст Эдуард Брокараў, журналістка Тацяна Ваніна, Аляксандар Ванчук, Алесь Васілеўскі, Валер Вішнеўскі, Віктар Гавака, Цімур Газімаў, Зьміцер Гарачка, Сяргей Гарэлік, Жанна Гізун, Юры Глушакоў, Алег Граблеўскі, Грань, Настасься Дарафеева, Марыя Дзівіна, Т.Дзядок, Паліна Дзянісава, Дубовік, Л.Еўдакімава, Зьміцер Жых, Ірына Завадзкая, Натальля Зямчонак, Сяргей Ількевіч, Віталь Кавалёнак, журналіст Вадзім Казначэеў, Аляксей Казулін (пляменьнік кандыдата ў прэзыдэнты), Сяргей Карбановіч, Дзяніс Кароль, Дар'я Кастэнка, Аляксей Конаш, Максім Корж, Глеб Курцоў, Кучынскі, Яўген Лабанаў, Яна Лаўрыновіч, Сяргей Лацінскі, Павал Лукін, Антон Ляшчоў, Зьміцер Лістахаў, Лысюк, Надзея Манцэвіч, Зьміцер Мацук, Місюк, Сяргей Міхіёнак, Іван Паршын, Віктар Пінчук, Стас Пачобут, Пашыток, Пералыгін, Аляксандар Пірэйка, Сяргей Пісарчык, Юры Пячэрскіх, Аляксей Раковіч, Аляксандар Рамановіч, Рапека, Рэзьнікаў, Павал Савіцкі, Ігар Салавей, Зьміцер Салаўёў, польская журналістка Вераніка Самалінская, Аля Сідаровіч, Аляксандар Сінкевіч, Павал Сінькевіч, Алесь Стральцоў, Павал Сяргееў, Юры Талапіла, Канстанцін Усянок, Павал Харламчук, Аляксей Хмялеўскі, Ціхановіч, Валадар Цурпанаў, Чарноў, Настасься Чахоўская, Ільля Шчарбінскі, Юры Ягораў, Ігар Якаўлеў, Даніла Яскеўскі, Віталь Яцко (**10 сутак**), Раман Шчэрбаў (**11 сутак**), Віктар Грынчык, Станіслава Гусакова, Мікіта Красноў, Антон Сьвірыдовіч, Сяргей Шмялёў (**12 сутак**), Максім Знак, Аляксей Лашук (**13 сутак**), Зьміцер Абразцоў, Юлія Балонкіна, Дзяніс Вашкевіч, грамадзянін Расеі Эдуард Глезін, Сяржук Гудзілін, Васіль Давідовіч, Зьміцер Дашкевіч, Дзяніс Дзянісаў, Іна Дзячак, Мікіта Залескі, Аляксей Зубок, Артур Кавальчук, Яўген Казлоў, грамадзянін Расеі Алег Казлоўскі, Мікола Каралёнак, Ганна Касьцюк, Аляксей Кашэль, Кірыла Ксяндзоў, Тацяна Куўшынава, Зьміцер Лапцёнак, канадзкі журналіст Фрэдэрык Лявуа, Васіль Левадовіч, Арцём Лук'янчык, журналіст «НН» Арцём Лява, В.Малашчыцкая, экс-пасол Польшчы Марыюш Машкевіч, Яраслаў Навуменка, Міхаіл Наскоў, Яўген Неткачоў, Ігар Падалінскі, расейскі журналіст Аляксандар Падрабінек, Валянціна Палевікова, Зьміцер Пауленка, Міхаіл Пілаць, Зьміцер Рагачоў, Сяргей

# Як я сядзела ў жодзінскай турме

Журналістка «Нашай Нівы» **Тацяна Сьнітко** была затрыманая ўначы 24 сакавіка на Кастрычніцкім пляцы. Для яе і яшчэ сотні схопленых не знайшлося месца на перапоўненым Акрэсьціне. Яны трапілі ў жодзінскі ізалятар.

Па дарозе ў Жодзіна нас папярэдзілі: гэта сапраўдная турма. Хоць мы мелі статус часова затрыманых і трапілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня Жодзінскага ГУУС, хоць нас ахоўвалі не салдаты ўнутраных войскаў, як у турме, а супрацоўнікі жодзінскай міліцыі, адрознасьць парадкаў ад акрэсьцінскіх адчуваецца. Першае, што чуеш, зрабіўшы крок з аўтазаку — жорсткае «Рукі за сьпіну!». Пры спыненьні — «Тварам да сьцяны!». Як суправаджэньне — «Не размаўляць!», «Галавы не павяртаць!». Трэба быць псыхалягічна гатовым. Нас рыхтавалі... канваіры, што везьлі партыю дзяўчат зь Менску. «Там проста такія парадкі. Абстаноўка будзе ня дужа вясёлая».

Памятайце: калі на вас складзены адміністрацыйны пратакол, да суду вы — *часова затрыманыя*.

### «Як у кіно»

У першым «перадлазьніку»-сутарэньні кожнага чакае абавязковы «шмон». Сапраўдны, як у кіно. Рукі на сьцяну, ногі на шырыню плячэй, курткі расшпіліць. Дзяўчат абшукваюць супрацоўнікі-жанчыны. Запытаюць пра мабільнікі, колюча-рэжучыя прадметы — голкі, шпількі... Калі разьмесьцяць па камэрах, будзе яшчэ адзін «шмон» — *тыпова турэмны*. Кожную камэру асобна выводзяць на калідор, шыхтуюць тварам да сьцяны, потым невялікімі партыямі (па тры чалавекі) вядуць у асобнае памяшканьне. Там трэба распрануцца дагала. Кожную зьнятую рэч, акрамя ніжняй бялізны, перапісваюць на адмысловы блянк. Кожную з нас даглядчыцы (жаночага полу) прасілі двойчы прысесьці і ўстаць. Тымчасам шманаюць і камэру.

### Інтэр'ер

Нам трапілася прасторная, мэтраў на дваццаць, камэра №96. На восем асобаў, хоць мы там жылі ўшасьцёх. Было месца патанчыць, паадціскацца ад падлогі. Адзінае, перашкаджаў недахоп сьвежага паветра. Там сыравата й цяжка праветрываць.

Пасярэдзіне памяшканьня — забэтанаваныя стол і дзьве лаўкі паабапал, з трох бакоў — чатыры «шконкі» (ложкі) у два ярусы. На кожным спальным месцы — коўдра, танюткі матрац і невялікая падушка. Цьвердавата, але можна падсьцяліць куртку ці швэдар. Мне ўдалося выспацца за ўвесь «майданны» тыдзень. Кожнаму выдаецца пасьцельная бялізна, «вафельны» ручнік і жалезны кубак бяз ручкі. З мэблі ёсьць яшчэ жалезная сьцянная шафа і невялікая палічка для кубкаў. У процілеглым куце — прыбіральня, без кабінкі, адасобленая цаглянай сьценкай мэтровае вышыні. Гэта самае нязручнае і псыхалягічна цяжкае месца ва ўсім абсталяваньні турмы. Мятла, сьметніца, рукамыйніца з адным кранам (гарачай вады няма). Для мыцьця выдаюцца два невялікія кавалкі гаспадарчага мыла з пахам ёду і яшчэ нечага кіслага — мабыць, дэзынфэкцыі. Замест туалетнай паперы — некалькі чыстых часопісаў з блянкамі для адзначэньня яўкі міліцыянтаў на нейкія заняткі.

Вокны камэры закратаваныя з двух бакоў, плюс жалюзі звонку. Яны не гермэтычныя: калі трохі вывернуцца, бачны кавалачак неба і дах будынку насупраць. Па асьвятленьні няцяжка

**Працяг са старонцы 16.**

## ХРОНІКА

Раманоўскі, Аксана Сенчанка, Арцём Скарабагаты, Леанід Скарабагаты, Антон Столяр, Талстой, Н.Тарасава, Андрэй Трызубаў, Алесь Чырэйка, Уладзімер Шаблаеў, Андрэй Шумараў, Юры Шумовіч, Валер Шыла, Андрэй Юркоў, Дзяніс Юхновіч (**15 сутак**), Аляксей Адамовіч, Аляксандар Аляб'еў, Канстанцін Арціменка, Дзяніс Арэшка, Юры Бакур, О.Баранчук, Тацяна Баранчук, Аляксей Більдзюк, Л.Бужэленка, Дзяніс Буйніцкі, Алесь Буракоў, Сяргей Бялевіч, Бялько, Васількавак, Яўген Ваўкавец, Зьміцер Вянско, І.Волчак, Усеўнік, Вяроўскі, Т.Гайдук, Аляксей Гарадзінскі, Гаранюк, Алесь Гізун, Алег Грубіч, Тацяна Грышан, Аляксандар Дарагаўцаў, Яўген Дземідовіч, Натальля Дзямчонак, Алег Дзячкоў, Н.Дулуб, Аляксандар Дызун, Аляксандар Дэпрыз, Віктар Яеўнік, Кацярына Жалезка, Кацярына Жылінская, Жлоба, Аляксандар Залатар, Ціхан Золатаў, Уладзімер Зорын, Андрэй Зуеў, Дзяніс Зюкаў, Е.Іванова, Іна Іванова, Яўген Іванюк, Мікола Ільлін, Даніла Іназемцаў, Мікола Кавалёнак, Е.Казак, Зьміцер Казлоўскі, Уладзімер Кандрусевіч, Аляксей Каральчук, Віталь Карбінскі, Тацяна Касьцюк, Качэўскі, Віктар Кірэеў, Кацярына Клецаўка, Іна Кліметка, Н.Кавалеўская, Андрэй Качанаў, Андрэй Козел, Аляксандар Конаш, О.Корсак, Т.Касьцюк, Сяргей Красуцкі, Віталь Красячкоў, Аляксей Куваеў, Зьміцер Кузьняцоў, Яўгенія Кудзянава, Зьміцер Куніч, Вера Купчанка, Е.Кур'янава, Аляксандар Куўшынаў, Тацяна Лавінская, Аляксандар Лантух, Яна Лаўрановіч, Сяржук Марчык, Сяргей Мацкойць, Аляксей Мітрафанаў, Ганна Мурадава, Д.Мурабава, Натальля Нарэль, Ж.Новік, Аляксей Новікаў, Зьміцер Палойка, Мікіта Паўроз, Марыя Піляева, Аляксандар Пажыган, Пракацень, Дзяніс Пугач, Пулынка, Уладзіслаў Равуцкі, Алена Радына, Уладзімер Раманцоў, Кірыла Расолька, Рахманаў, Віталь Ругайны, Ігар Русанаў, Е.Саўчанкава, І.Садоўскі, Сьцяпан Сьвідзерскі, Валер Сянько, В.Сілкова, грэка-каталіцкі сьвятар Андрэй Сідаровіч, П.Сількевіч, Вадзім Смок, Вольга Сньткіна, Н.Стахоўская, Надзея Сычугова, Антон Сьвірыдовіч, Іван Сьцепанцоў, С.Тамкоўская, Л.Цітова, Ян Тамілін, Кацярына Ткачэнка, Канстанцін Усьценка, Андрэй Фамін, Павал Фінькевіч, Мікалай Цімафееў, Максім Чабан, Алег Чамерка, Тацяна Шандовіч, А.Шатэрава, Яўген Шадко, Зоя Шчало, Іна Шышнеўская, Якаўцаў, Яўген Якіменка, Кацярына Янкевіч, Ірына Ярашэвіч.

Аштрафаваныя журналістка Тацяна Сьнітко, Тацяна Віткоўская (па **30 б.в.** штрафу, 930 тыс. руб.), Крысьціна Шацікава, Тацяна Ларына, Ж.Ямайкіна (па **20 б.в.**, 620 тыс.), Натальля Баярына (**50 б.в.**, 1 млн 550 тыс.).

Непаўналетніх Ксенію Ёлкіну, Алену Ігнацьцеву, Яўгенію Карону, Паліну Курыловіч, Руслана Мацьвеева, Арцёма Платонава, Таню N. адпусьцілі зранку. Адпусьцілі таксама Вадзіма Зяннька.

Некаторыя адвезеныя ў Жодзіна арыштанты з 24 сакавіка трымаюць галадоўку.

# Як я сядзела ў жодзінскай турме

Працяг са старонкі 15.

зразумець, якое надвор'е і колькі часу (гадзіньнікі забіраюць, а радыё гаворыць ня ўвесь час). Сьвятло гарыць круглыя суткі: удзень — лямпачка пад стольлю, уначы — «начнік» (цьмянейшая лямпачка) над дзьвярыма. У цяжкіх жалезных дзьвярах ёсьць вочка, шчыліна для нагляду за зьняволенымі ў камэры і вакенца пад імі — для падачы ежы. Вочка і шчыліна могуць адчыняцца аховай колькі заўгодна разоў.

## Ежа

Ежу падаюць тройчы на дзень у жалезных місках. Сьняданак — каша з маслам нявысьветленага паходжаньня, чвэртка белага хлеба на чалавека і паўкубка гарбаты, нямоцнай, але салодкай і гарачай. Абед — міска даволі смачнага супу (давалі розны), міска кашы з пахам мяса ці нават яго невялікай колькасьцю... безь ніякага кампоту ці гарбаты. Дзякуй Богу, вада ў кране была нічога сабе на смак. Вячаровую трапезу мы называлі «вячэру аддай ворагу». Штовечар, прынамсі падчас майго гасьцяваньня ва ўстанове, давалі бігас: вараную кіслую капусту ва ўласным соку (яго лепей адразу выліваць у ракавіну і есьці капусту, колькі зможаце, з хлебам). Хлеба у турме хапае: як жартавалі мае сукамэрніцы, выраз «сушыць сухары» безнадзейна састарэў. Дарэчы, дзевяць палітвязьняў-пратэстантаў з самага першага дня затрыманьня абвесьцілі галадоўку.

Цяжка курцам. Як паведамілі па сакрэце міліцыянты яшчэ на Акрэсьціна, нібыта ёсьць указаньне «не даваць паліць». Адзінае выйсьце — успрыняць жартоўную параду наглядчыкаў «паліць венік» літаральна.

## Чытаць можна, пісаць — не

Будзяць вязьняў ізалятару а 6-й дзяржаўным гімнам па радыё. Потым вяшчае радыё «Сталіца» зь яго ня самымі праўдзівымі навінамі, але цалкам нармальнай музыкай: расейскі, беларускі, украінскі рок, найлепшыя ўзоры ангельскамоўнай поп- і рок-клясыкі і толькі зрэдчас — расейская папса. З газэтаў далі пачытаць толькі нумар «СБ» за 28 чэрвеня 2003 году. Ад панядзелка адміністрацыя абяцала пачаць выдачу кніжак зь бібліятэкі.

**Чаго не хапае ў Жодзінскай турме?**

1. Прадметаў гігіены.

2. Цыгарэтаў. Іх усё-такі могуць, а згодна з любымі турэмнымі правіламі — *абавязаны* перадаваць!

3. Гарбаты і кіпяцільніка. Пасьля турэмнай пайкі чамусьці хацелася піць — даводзілася спажываць ваду з-пад крана. Таму не хапае напояў (сокаў, мінэралкі).

4. Калі сядзіш доўга, хочацца больш разнастайнай ежы. Перадайце на камэру трохі садавіны і гародніны, сала і каўбасы, цыбулі і часныку (альбо хоць бы нешта адно з кожнай згаданай пары прадуктаў). Некаторым бракуе закрасаў.

5. Лекі. Яны патрэбныя найперш тым, хто мае хранічныя хваробы. Трэба ўлічыць, што ад нязвыклага турэмнага рацыёну ў кагосьці могуць быць праблемы. Актываваны вугаль і абязбольваючыя, вітаміны, а таксама тое, што чалавек прымае заўжды па рэкамэндацыі доктара — найбольш актуальныя рэчы. Але жанчына-доктарка ў турме ставілася да нас дастаткова ўважліва: некалькі разоў пыталася, ці няма хворых. (Пра наяўнасьць высокай тэмпэратуры альбо цяжарнасьці пытаюцца адразу, на першым жа шмоне пры ўваходзе.)

6. Сувязі зь сьветам. Незалежнай прэсы. Прывітаньняў па радыё «Сталіца». Толькі трэба памятаць пра цэнзуру, інакш прывітаньне могуць не перадаць. А ўвогуле, замест беларускай песьні вязьням могуць чытаць і правілы распарадку — па ўнутраным вяшчаньні.

## ХРОНІКА

### Дзень Волі

Затрыманыя 25 сакавіка: Алена Талапіла (**4 сутак**), Вольга Кораш, Наста Бурсевіч, Марына Гермак, Зьміцер Чарноцкі (**5 сутак**), Альшэўскі, Е.Віткоўская, Мікалай Гардзееў, Зьміцер Калейчык, Вольга Корсак, Настасься Ларына, Вольга Ныткіна, Сьвятлана Цімкоўская (**7 сутак**), Сьвятлана Станкевіч (**8 сутак**), Аляксандар Ванчук (**9 сутак**), Сяргей Анянкоў, Андрэй Арэхаў, Багуцкі, Сяргей Барсток, Бяркой, Зьміцер Гамолка, Галіна Грыцкевіч, Зьверава, Іванкоў, Івашкоў, Аляксандар Ількевіч, Аляксей Казлоўскі, Ганна Когай, Е.Кудзелік, Сяргей Лісіцын, Яўген Ліскевіч, Міхаіл Ліцьвінаў, Настасься Малодкіна, Вераніка Маскевіч, В.Нікалайчук, Аляксандар Порах, Пратасаў, Саламан, Вера Сілкова, Натальля Старасьціна, Фурсевіч, А.Цітова, Юры Шлапік, Ільля Шымански (**10 сутак**), Аляксей Мікульчык, Аляксей Язылец (**13 сутак**), Яўген Бас, Ларыса Бухаленка, Мікіта Залескі, Крушэўскі, Віталь Куклевіч, Ігар Кулей (сын Іны Кулей), Ільля Садаўнічы, Андрэй Хоцін (**15 сутак**), Ларыса Андросік (**10 б.в.**, 310 тыс.), Аляксандар Мацюхін (**20 б.в.**), Алеся Ясюк (**30 б.в.**), Юры Аксеневіч, Алейнік, Станіслаў Багданаў, Андрэй Барок, Брадко, Грудзько, Максім Буйніцкі, А.Дзегцярова, А.Дзегцяроў, Аляксандар Дзішчыц, Дзяшкевіч, М.Дубоўскі, С.Жук, А.Жукаў, Д.Завадзкі, В.Калінін, Кужалева, Іванкоў, В.Казак, Мазучэнка, Ніхімаў, Віктар Панкавец, Кірыла Прадко (выпадкова апынуўся каля шэсьця: гуляў зь дзіцем у раёне дому), Солтан, Рагоўскі, Зьміцер Зьвераў, Андрэй Сантаровіч, Прышнеўскі, Сакалоўскі, П.Сальга, Сівановіч, Січко, Сьвятлана Станкевіч, Васіль Хадкевіч, Хандога, Т.Хіло, Іна Чыжык, Чэкмараў, Валерыя Шылава, Антаніна Шыш, Павал Юшкевіч.

### Ашмяна

**Яна Невядомскага** 22 сакавіка міліцыянты вывезьлі на машыне за горад і дапытваліся, калі ён мае ехаць у Менску. Не дамогшыся адказу, міліцыянты адпусьцілі актывіста.

### Магілеў

**Віталя Васількова** (карэспандэнта «Нямецкай хвалі») 23 сакавіка затрымалі па дарозе ў Менск і асудзілі на 7 сутак. Затрымалі таксама **Сяргея Фаміна** і **Аляксандра Сілкова** ды асудзілі на 7 сутак.

### Баранавічы

У Баранавічах 23 сакавіка затрымалі актывістаў выбарчай кампаніі **Сяргея Гоўшу** і **Віктара Сырыцу**. Сырыцу далі 4 сутак арышту.

### Ворша

5 сутак арышту атрымаў 23 сакавіка моладзевы актывіст **Ігар Казьмярчак**, якога абвінавацілі ў дробным хуліганстве. На знак пратэсту супраць несправядлівага прысуду ён абвясьціў галадоўку.



**Такімі аўтазакамі удзельнікаў пратэстаў вывозілі з Плошчы, транспартавалі ў суды й ізалятары.**

Але аловак, каб разгадаць крыжаванку, не далі, як мы ні прасілі. «Разгадвалі» згарэлымі запалкамі ды таблеткай актываванага вугалю.

У камэрах даволі цёпла. Раз на мае трое сутак нас выводзілі на прагулянку ў турэмны двор з закратаванай стольлю. У суботу па чарзе вадзілі ў лазьніцу, прытым з нармальным гаспадарчым мылам. Каб яшчэ ня вочка ў дзьвярох, што раз-пораз адчынялася... Але за дзьвярыма стаяла жанчына-наглядчыца.

Стаўленьне аховы і адміністрацыі да палітзьняволеных — даволі добразычлівае, цікаўнае і хутчэй станоўчае, чым наадварот.

Самае важнае і самае лепшае, што давялося бачыць і адчуваць за кратамі, — дух братэрства, пачуцьцё падстаўленага кімсьці пляча, адчуваньне, што нехта падаў табе руку. Нават той, каго ты зусім ня ведаеш і можаш больш не пабачыць.

## ХРОНІКА

**Васіля Берасьнева** выклікалі ў пракуратуру на 25 сакавіка: паўтары гадзіны яго дапытвалі пра сукамэрніка, зь якім актывіст сядзеў падчас арышту за ўдзел у выбарчай кампаніі.

### Віцебск

21 сакавіка былі затрыманыя 15 віцяблянаў, якія з 19 сакавіка ладзілі пратэставыя вулічныя акцыі ў цэнтры гораду. Суды над імі адбыліся 22 і 23 сакавіка. **Сьвятлана Ідзельчык**, **Алена Фаміна**, **Кацярына Фахарадзінава**, **Марыя Зьвярынская**, **Арцём Хадыка** атрымалі штрафы ў памеры 20 б.в. Непаўналетнюю **Ірыну Пятрову**, дзевяцікласьніцу лінгвістычнай гімназіі №2, забіраў зь міліцыі бацька: на яго склалі адміністрацыйны пратакол за кепскае выхаваньне дзіцяці. Па 5 сутак арышту прысудзілі **Ўладзімеру Ідзельчыку**, **Уладзіславу Токараву**, **Зьмітру Петрачэнку** і **Кастусю Перагуду**. Штраф у 1 б.в. атрымаў **Сяргей Белязека**, які на акцыі сьпяваў песьні пад гітару. Ад часу затрыманьня Белязека трымаў сухую галадоўку, як і яшчэ адзін актывіст — **Сяргей Гаўруцікаў**, якога асудзілі на 15 сутак.

На Дзень Волі затрыманыя **Барыс Хамайда** і сябры КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка** й **Алесь Пазьняк**: яны прастаялі з нацыянальнымі сьцягамі й плякатамі на плошчы толькі 5 хвілінаў. 27 сакавіка Хамайду і Плешчанку асудзілі на 7 сутак арышту, Пазьняку далі папярэджаньне.

27 сакавіка пачаўся суд над моладзевым актывістам **Віталём Броўкам**: яго затрымалі ў Менску 24-га, прывезьлі ў Віцебск і зьвінавацілі ў непадпарадкаваньні работнікам ДАІ. Суд адкладзены да 12 красавіка.

**Валер'ю Шчукіну**, абвінавачанаму ў абразе старшыні ўчастковай выбарнай камісіі Ніны Шубінай, 27 сакавіка прысудзілі штраф у 1 б.в.

### Напады на актывістаў

23 сакавіка ў Менску жорстка зьбіты **Віктар Карняенка**, намесьнік кіраўніка штабу Мілінкевіча. Калі ён выйшаў з дому, каля пад'езду яго стукнулі ззаду палкай па галаве, а як паваліўся на зямлю — пачалі зьбіваць нагамі. Нападнікаў было двое. Потым яны ўцяклі, а Карняенку ў цяжкім стане давялося везьці ў больніцу. Па факце нападу міліцыя распачала крымінальную справу.

### Нон-грата

На станцыі Гарынь на беларуска-ўкраінскай мяжы 23 сакавіка беларускія памежнікі зьнялі зь цягніка Львоў—Санкт-Пецярбург групу з **37 украінскіх студэнтаў** з Івана-Франкоўска. Памежнікаў насьцярожыла, што ўва ўкраінскіх студэнтаў не было з сабой рэчаў, і яны вырашылі, што тыя зьбіраюцца застацца ў Беларусі для ўдзелу ў мітынгах.

### Журналісты

Карэспандэнта інтэрнэт-газэты «Салідарнасьць» **Івана Романа**

# Новая менская мода

У апошнія тыдні Менск накрыла мода на палітычныя флэш-мобы, удзельнікі якіх каардынуюць дзеяньні празь Сеціва. Акцыі розныя: ад вулічных пэрформансаў да салідарнага галасаваньня на сайтах афіцыйных СМІ, і нават іх псаваньня.



Так выглядаў зламаны хакерамі сайт АНТ.



Удзельнікі гэтага флэш-мобу занесьлі да прахадной БТ кардонны «тэлевізар», поўны «зьнятай з вушэй» локшыны.



На Нямізе штовечар ставяць сьвечкі ў памяць аб намётавым гарадку.



Групка людзей зьбіраецца на вуліцы, набывае «Советскую Белоруссию», чытае, а пасьля рве й выкідае ў сьметніцу.

## ХРОНІКА

ў Горадні 22 сакавіка затрымалі міліцыянты, завезьлі ў суд і асудзілі на 13 сутак арышту за «лаянку ў грамадзкім месцы».

У Пінску 22 сакавіка суд арыштаваў на 6 сутак галоўнага рэдактара рэгіянальнай газэты «Мясцовы час» **Аляксандра Ярашука**: яго зьвінавацілі ў лаянцы і непадпарадкаваньні міліцыянтам.

У Горадні 23 сакавіка міліцыянты затрымалі машыну, якая везла частку накладу газэты **«Glos znad Niemna na uchodzstwie»**.

24 сакавіка ў Менску затрымалі і асудзілі здымачную групу Грамадзкай тэлевізіі Грузіі — **Ніно Гіёргабіяні** (5 сутак) і **Георга Лагідзэ** (15 сутак), якія бралі інтэрвію ў сваякоў затрыманых.

Увечары 24 сакавіка на пляцы была затрыманая журналістка францускай газэты *Liberation* **Лярэн Мілё**. Разам зь ёй затрымалі таксама **Дзяніса Талпеку, Андрэя Сьняяна, Вольгу Бутырчык, Надзею Крапівіну, Вольгу Жураўлёву**.

Пазаштатнага супрацоўніка інтэрнэт-газэты «Пагоня» **Аляксея Салея** затрымалі 25 сакавіка і асудзілі на 6 сутак. Супрацоўніцу гэтага ж выданьня **Ірыну Чарняўку** затрымалі 24 сакавіка і папярэдзілі, каб яна езьдзіла ў Менск.

Расейскага журналіста **Паўла Шарамета** затрымалі 25 сакавіка, пратрымалі выходныя ў спэцпрымальніку на вул.Акрэсьціна, а 27 сакавіка выдалілі зь Беларусі.

Яшчэ да пачатку мітынгу 25 сакавіка ў Менску ў скверы Янкі Купалы зьбіты журналіст *Wall Street Journal* **Алан Калісан**.

**Паўла Мажэйку**, прэс-сакратара А.Мілінкевіча, затрымалі 25 сакавіка пасьля сьвяткаваньня Дня Волі. З Цэнтральнага РАУС Менску яго вызваліў экс-кандыдат у прэзыдэнты.

### Наваполацак

**Аляксею Трубкіну** далі позву ў ваенкамат на 25 сакавіка, выходны дзень (!). Позву ўручылі падчас паседжаньня адміністрацыйнай камісіі, якая аштрафавала актывіста на 5 б.в. Штраф Трубкіну выпісалі за тое, што 14 лютага раздаваў мінакам бюлетэнь «Пазыцыя».

### Офісы

Каля офісу недзяржаўнага **Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП)** 23 сакавіка зьявіліся 4 назіральнікі ў цывільным. Калі кіраўнік РЭПу Генадзь Фядыніч у адным зь іх пазнаў капітана міліцыі, які ладзіўператрус у прафсаюзным штабе 18 сакавіка, міліцыянт адказаў: «Мы сёньня не на дзяжурстве, мы тут адпачываем».

### Гомель

23 сакавіка **Сяргея Трафімава** асудзілі на 15 сутак за парушэньне парадку пікетаваньня: 25 лютага яго затрымалі падчас раздачы агітацыйных улётак А.Мілінкевіча.

Старшаму бухгальтару «Белінвэстбанку» **Мікалая Калюка** 20 сакавіка паведамілі, што праз месяц банк спыняе кантракт зь ім: актывіста яшчэ падчас збору подпісаў папярэджвалі работнікі службы бясьпекі банку, каб не займаўся грамадзкай дзейнасьцю.

Актывіста РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Алеся Яўсеенку** 22 сакавіка выклікалі позвай у КДБ: сьледчы Шагаў сказаў, што вядзе расьсьледаваньне ў рамках справы «Партнэрства», Яўсеенка — сьведка.

25 сакавіка падчас сьвяткаваньня Дня Волі былі затрыманыя **Міхайлаў** і 2 невядомыя.

### Грошы апазыцыі

Увечары 25 сакавіка па прылёце ў аэрапорт «Менск-2» былі затрыманыя сябры АГП **Яраслаў Раманчук** і **Сяргей Альфэр**, 26-га — каардынатар «Хартыі'97» **Андрэй Саньнікаў**. Ва ўсіх канфіскавалі валюту (сумы меншыя, чым неабходна задэкляраваць): мытнікі абвясьцілі, што грошы трэба праверыць на сапраўднасьць.

### Дзень Волі

25 сакавіка падчас разгону шэсьця пацярпелі шматлікія яго ўдзельнікі. Вядомыя пакуль імёны **Сяргея Атрошчанкі, Алеся Цішука, Ганны Чарнышовай**.

### Сьветлагорск

2 б.в. штрафу атрымала 27 сакавіка **Натальля Бордак**, зьбіральніца подпісаў за А.Мілінкевіча: яе пакаралі за тое, што раздавала праграму кандыдата на рынку.

**АШ**

# Арыштанцікі вы мае!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ВАЛЯНЦІН ТАРАС**

Мяне на Кастрычніцкую плошчу не пусьцілі дзеці — сын, унук, нявестка: «Помні пра свае гады і сваё здароўе. Табе не пайсьці ня сорамна». Яно, можа, і сапраўды ня сорамна, калі табе пад восемдзесят і сэрца даўно на нітачцы лекаў трымаецца... Але сумленьне з тваім узростам ня лічыцца, і было на душы нядобра, прыкра: як гэта я ўбаку? Хоць і сам паспрабаваў утрымаць унука, пасьля таго, як ён дзьве ночы правёў на плошчы ў намётавым гарадку. Папрасіў: «Антоська, можа, хопіць зь цябе? Такі холад! Ня дай Бог, захварэеш...» Ён паглядзеў на мяне зь вясёлай хітрынкай у вачох, хораша, сьветла ўсьміхнуўся: «Дзядуля, а ты ня памятаеш, хто гэта мне столькі разоў распавядаў пра трынаццацігадовага хлопчыка, які ў 1943 г., узімку, пайшоў у партызаны, мерзнуць у лесе?» Што я мог яму адказаць?

Яго схапілі 23 сакавіка, у чацьвер, разам з маці, маёй нявесткай Аленай Лукашэвіч. У той жа дзень паставілі на судовы канвэер, адштампавалі прысуд: Алене — штраф, Антону — адзінаццаць сутак арышту. Калі даведаўся пра гэта, цяжкі камень лёг на душу. Але не было роспачы. Ні ў мяне, ні ў маёй жонкі. Суцяшалі сябе прымаўкай: «Што міру, тое й бабінаму сыну». І сябры суцяшалі па тэлефоне, і добрыя знаёмыя, чые дзеці, сыны і ўнукі таксама былі на тым міры, на той плошчы, дзе цэлы тыдзень новае пакаленьне беларускай моладзі гукала Вясну.

Але галоўнай суцяшыцелькай была наша з жонкай праўнучка, Антосева дачка Верачка, птушанятка з бацькавымі праніклівымі вачыма. Нявестка на другі дзень пасьля арышту Антося прывяла Вяруню да прашчураў — ведала, чым нас па сапраўднаму суцешыць. А я, калі Верачка забегала па хаце, сьмеючыся і залазячы якраз у тыя шуфляды, якія ёй адчыняць забаронена, сказаў жартам: «Во, давядзецца пісаць паэму «Дачка арыштанта», яблычка ад яблыні далёка ня падае!..»

І тут жа падумалася, што гэта найчасьцей сапраўды так. Падумалася, калі раптам неяк па-новаму зірнуў на фотку, зробленую семдзесят гадоў назад, у 1936 г. Гэта сямейны здымак, на якім мая жонка Рэня Бакуновіч у пяцігадовым узросьце. Побач зь ёй бацькі — Зьміцер Іванавіч і Вольга Сямёнаўна. Адметнасьць здымку ў тым, што Зьміцер Іванавіч на ім сфатаграфаваны ў той дзень, калі выйшаў з турмы, куды запхнуў яго, простага рабочага, сталінскі хапун. Чамусьці празь некалькі месяцаў выпусьцілі. Але ўсё жыцьцё Зьміцер Іванавіч ненавідзеў Сталіна і ягоных барбосаў, саму сыстэму. А вось у гады вайны стаў партызанскім сувязным, падпольшчыкам. Калі пыталіся, чаму, адказваў: «Бацькаўшчына — ня Сталін, народ — не бальшавікі. Некалі ўсе пачвары адыдуць, а Бацькаўшчына застанецца».



**Сям’я Бакуновічаў у дзень вяртаньня бацькі з сталінскае турмы.**

Верачка бавіцца каля стэляжа, на якім стаіць фотка ейнай прабабкі і прапрадзедаў, не зьвяртае на яе ўвагі — ёй яшчэ няма і двух годзікаў, і яна ня ведае, што некалі будзе ганарыцца сваім бацькам, як ейная прабабка ганарыцца сваім, бо ён даў ёй прыклад чалавечай годнасьці. Ды пакуль што мы, бацькі і дзяды, ганарымся сваімі сынамі і ўнукамі, дачкамі і ўнучкамі, роднымі нашымі арыштанцікамі, птушкамі волі, якіх заганяюць у клеткі. Але сьпеў іхні ужо не абарваць дубінкай спэцназу. Зноў і зноў яны будуць выходзіць гукаць Вясну свабоды, Вясну Беларусі, Вясну нацыянальнага адраджэньня. Пакуль не дагукаюцца!

# Выбары — перад намі!

**ПЁТРА РУДКОЎСКІ**

Беларуская праўда прагучэла. Яна прагучэла на Кастрычніцкай плошчы, ля дзясяткаў беларускіх амбасадаў, на сотнях Інтэрнэт-старонак, прагучэла і гучыць у сэрцах мільёнаў беларусаў.

Ах, нас увесь час бянтэжыць і засмучвае, што яна, гэтая праўда, прагучэла ня так гучна і палка, як хацелася б.

Незабыўныя вобразы ўкраінскага Майдану так моцна ўрэзаліся ў нашую памяць, што міжволі навальваецца чорная думка: не відаць беларусам свабоды. Гэткі настрой часам яшчэ падкормліваюць замежныя журналісты, якія любяць у сваіх рэпартажах скантраставаць мэга-дэманстрацыю ў Кіеве 15 месяцаў таму і сёньняшнюю міні-дэманстрацыю ў Менску.

Але мова свабоды ня можа і не павінна быць усюды аднолькавай, яна заўжды дапасавана да месца і часу. Беларуская свабода насамрэч ня менш імпэтная і экспансіўная, чым украінская ці польская.

Кантраст паміж беларускай Кастрычніцкай плошчай і ўкраінскім Майданам адпавядае кантрасту паміж беларускім цьвёрдым таталітарызмам (з элементамі тэрору) і тагачасным украінскім мяккім аўтарытарызмам (з элементамі парлямэнтарызму і свабоды слова).

Няма нічога дзіўнага ў тым, што беларуская свабода павольна прабіваецца скрозь тоўсты слой жорсткага таталітарызму. Беларусы не вінаватыя ў тым, што іхнія ланцугі больш тоўстыя, чым ланцугі ўкраінцаў, сэрбаў ці грузінаў. І мяне зусім не бянтэжыць «малая» колькасьць дэманстрантаў, а наадварот — уражвае такая (вялікая) колькасьць людзей на Кастрычніцкай плошчы. Так, 20 тысячаў — гэта вельмі шмат, калі ўлічыць, што гэта адбылося, нягледзячы на жудасныя пагрозы Сухарэнкі і папярэднія намінкі Лукашэнкі ў конадзень менскіх падзеяў. Мяне ўражвае энэргія і моц, зь якой непакорныя беларусы спрабуюць разарваць праклятае кола таталітарнага прыгнёту. Мяне інтрыгуе гэты страх і паніка, якая ахапіла ворагаў свабоды. Бо інакш, як пры дапамозе катэгорыі страху, нельга растлумачыць іх тупую прасталінейнасьць, зь якой яны рэалізуюць сваю «рэакцыю»: схапіць, заламаць рукі, часам яшчэ плюнуць у твар, вынесьці абсурдальны вырак і пасадзіць.

Арышт Андрэя Дынька ў гэтым пляне даволі сымбалічны. Так сталася, што Дынько апынуўся носьбітам трох элемэнтаў мовы свабоды, якія нават паасобна страшныя для рэжыму, а ў спалучэньні — асабліва. Па-першае, нёс ежу для дэманстрантаў, па-другое, размаўляў па-беларуску, па-трэцяе, выявіўся незалежным журналістам.

Нашэньне ежы, спалучальнае з рызыкай быць схопленым і арыштаваным, нагадвае найгоршыя дні акупацыі, калі людзі мусілі ратаваць адзін аднаго, дарага за гэта плацячы. Адсюль бярэцца маральная сіла гэтага акту. Слугі рэжыму ня могуць спакойна глядзець на акты зычлівасьці і салідарнасьці, бо гэта прыніжальна для іх, яны падсьвядома ці паўсьвядома пачынаюць адчуваць сябе «па-за кантэкстам», па-за народам. Адсюль іхні страх і агрэсія.

Другое — беларускае слова. Яно ў нашай рэчаіснасьці таксама набывае характар дзеяньня і ўзьдзеяньня. Беларускае слова не нэўтральнае, яно цягам пары стагодзьдзяў «падпольнага» існаваньня набыло спэцыфічную энэргетыку: ад яе павявае духам непакоры і нонканфармізму.

Ну, і трэцяе — незалежны журналіст, то бок прарок-ерэтык, прапаведнік-інтэрпрэтатар, які правакуе людзей да самастойнага мысьленьня і крытычнай ацэнкі рэчаіснасьці. Вось і маем пакет крыміналу: носьбіт салідарнасьці, беларушчыны і свабоднага слова.

Вінаваты.

Арыштаваць.

Мова свабоды і жэсты салідарнасьці незразумелыя для рабоў беларускага рэжыму. Гэта — чужая для іх мова, таму нічога дзіўнага, што яны яе закваліфікавалі як «брыдкаслоўе».

Дынько ня першы, каго арыштавалі «за брыдкаслоўе». Ахвярамі «палітыкі чыстага слова» сталіся таксама Андрэй Пісальнік, Валер Шчукін і іншыя. Маральная далікатнасьць беларускіх уладаў папросту кранае да болю. Толькі ўражвае тут кантэкст гэтай «маральнай акцыі»: вось, яшчэ вісяць у паветры сьвежавымаўленыя Лукашэнкам «дэбілы» і «адмарозкі», а тут шараговых грамадзянаў арыштоўваюць за «брыдкаслоўе». Нават калі б Дынько, Пісальнік ці Шчукін і дазволілі сабе тое ці іншае «накрыць» матам, то, згодна са здаровай людзкой лёгікай, трэ’ было б спытаць: калі бацьку можна, то чаму дзецям не?

А вось чаму: у вуснах «бацькі» брыдкаслоўе застаецца пустаслоўем; яно «безаб’ектнае», застаецца ўсяго толькі адлюстраваньнем яго ўнутранага стану і нічым болей. А во эвэнтуальнае брыдкаслоўе «дзяцей» можа стацца трапнай і аб’ектыўнай характарыстыкай бягучых падзеяў. Бо беларускія «выбары» — гэта адна з тых сытуацыяў, калі ляпідарны нецэнзурны мат перастае быць матам, а набывае апісальную вартасьць.

Але гэта ня так і важна. Важна тое, што беларуская праўда ўсё ж такі прагучэла, а яе рэха пакацілася і коціцца па ўсім сьвеце. Дынаміка гэтага слова зусім не на карысьць рэжыму, якім бы «залежным» ён ні быў. Запалохваньне грамадзтва перадусім дэгенэруе саміх запалохвальнікаў. Сукупнасьць здэгенэраваных і маральна пакалечаных індывідаў у пэўны момант губляе здольнасьць дзейнічаць арганізавана, а таталітарная махіна, якую яны змайстравалі, незадоўга іх саміх пачне пажыраць.

Выбары — перад намі!




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Украінскія выбары

За дэмакратыяй выбары ва Ўкраіне пачалі нагадваць сьвяткаваньне Новага году. Рэпартаж з Кіева **Леліка Ушкіна.**

Нічога не нагадвае ва Ўкраіне пра атмасфэру эканамічнага хаосу ды іншыя катаклізмы, якія — калі верыць «СБ» і БТ — пасьля падзей на Майдане сталі пэрманэнтным атрыбутам украінскага штодзённага жыцьця. 26 сакавіка пра выбары нагадвалі хіба велізарныя чэргі ля школаў і адміністрацыйных будынкаў, ператвораных у перавыбарчыя «дільниці».

Але яшчэ ў пятніцу, 24 сакавіка, Кіеў нагадваў лягер намадаў: ля кожнай станцыі мэтро і кожнага супэрмаркету быў свой маленькі Майдан: палаткавы лягер прадстаўнікоў розных палітычных сілаў. Кожны, хто заглядаў у намёт, атрымліваў ад прапагандыстаў стос папяровай інфармацыі аб праграме партыі, яе лідэрах, а таксама бонус-каляндарык або пакет. Найбольшай папулярнасьцю карысталіся агіткропкі Юліі Цімашэнкі, дзе акрамя макулятуры можна было затарыцца шалікам або каптурком з «чырвоным сэрцам» — лэйблам яе блёку.

У суботу ўвесь гэты цырк зьнік — ва Ўкраіне быў «дзень цішыні». Засталіся выключна графіці — кшталту «За Камуністаў. Даві гідру» — ды каляровыя стыкеры на дрэвах. Бо кожная партыя мае сваю фарбу: сацыялісты — ружовыя, «рэгіёны» — фіялетавыя, «Наша Ўкраіна» — памаранчавая, канечне. Але выбарчая кампанія працягвалася і ў суботу. Украінцы дадумаліся да цікавых піярных крокаў. Напрыклад, трасы гораду ўпрыгожваюць бігборды са слоганам «зялёныя». Калі падысьці бліжэй, можна прачытаць, што «зялёныя» — новы мэдпрэпарат, які хутка павінен зьявіцца ў аптэках. А тое, што ён выклікае асацыяцыі з назвай нейкай партыі, — «чыстае супадзеньне». Тое ж робяць іншыя палітычныя акторы. Так, у горадзе цяпер шмат рэклямы піва «Абалонь», а ўсе ж ведаюць, што дырэктар гэтай кампаніі спансуе нацыяналістаў з блёку «Кастэнка—Плюшча». А бэльгійскія гомасэксуалісты абвінавацілі Ю.Цімашэнку ў парушэньні аўтарскіх правоў: быццам яна «сьпіянэрыла» ў іх лэйбл-сэрца. Было й нясьмешнае: увечары ў суботу ў Данецку невядомыя забілі дэпутатку «Нашай Украіны».

Тым ня менш градус напружанасьці ў суботу трохі спаў, і ньюсмэйкерам стала Беларусь. За два дні ў Кіеве адбыліся чатыры акцыі салідарнасьці зь беларускай апазыцыяй — тры каля амбасады і адна каля офісу МЗС. Пікетчыкі патрабавалі не пускаць у краіну датычных да парушэньня правоў грамадзян беларускіх чыноўнікаў. «Хай яны адпачываюць у Сочы», — казаў адзін парубак у мэгафон.

Мэрам Кіева нечакана стаў Леанід Чырванецкі —

# Гарачы зэдлік

Палітычны дыялёг панямецку. Зь Вітэнбэргу піша **Алесь Кудрыцкі.**

У сакавіку былі выбары ня толькі ў Беларусі, але і ў зямлі Саксонія-Анхальт. Лякальная палітыка выклікае тут ня меншы ажыятаж, чым нацыянальная — бо больш блізкая да людзей. Мясцовая моладзь вырашыла бліжэй пазнаёміцца з дэпутатамі ў ляндтаг — зямельны парлямэнт. Формай для знаёмства стаў «Гарачы зэдлік» — фармат палітычнай дыскусіі, даволі пашыраны ў Нямеччыне.

У памяшканьні мясцовай Эвангелісцкай акадэміі — рэлігійнай установы, якая займаецца сьвецкай адукацыяй, сабраліся 80 чалавек. Перад імі на сцэне сядзелі пяць маладых кандыдатаў у дэпутаты ад асноўных партыяў, якія будуць спрабаваць свае сілы на выбарах.

Першай задачкай для палітыкаў была прэзэнтацыя суперніка — яны мусілі рэпрэзэнтаваць свайго суседа па зэдліку так, нібыта яны ствараюць для яго палітычную рэкляму. Рабілі яны гэта збольшага прыхільна, дзе-нідзе для сьмеху гіпэртрафуючы перадвыбарчыя абяцанкі партыі-канкурэнта. Потым надышла чарга пытаньняў з залі. Будучыя парлямэнтары адбіваліся, як маглі. Пасьля гэтага ім давялося прайсьці празь віктарыну, якая мусіла выявіць узровень іх інтэлекту. Кандыдат ад ХДС як арэшкі шчоўкаў загадкі-тэрміны з разраду паліталёгіі, аднак на пытаньне «Колькі храмасом мае вуха чалавека?» адказаў «Чатыры!», прымусіўшы схапіцца за галаву кандыдата-біёляга ад левых. Пераможцай конкурсу эрудытаў выйшла кандыдатка ад сацыял-дэмакратаў.

Другое кола пытаньняў завяршыла вечар. Цікава, што традыцыйна балючыя тэмы — фінансаваньне адукацыі ды змаганьне зь беспрацоўем — займалі важнае, але не галоўнае месца. Нямецкая моладзь асьцярожна, але настойліва пачала ставіць пытаньне пра нацыянальны гонар ды сьвядомасьць — тэмы-табу для старэйшага пакаленьня. «Чаму нэанацысты прыватызавалі паняцце нацыянальнай годнасьці? Чаму я не магу сказаць, што я ганаруся быць немцам бяз страху, што мяне залічаць у шэрагі карычневых?» — запытаўся школьнік з залі. «Называцца немцам ніхто не забараняе, але чаму гэтым трэба абавязкова ганарыцца?» — парыравала са сцэны лявіца, і нават кансэрватыўнаму палітычнаму крылу давялося зь ёй збольшага салідарызавацца.

Паўстала і яшчэ адно вострае пытаньне — пра тое, як ацэньваць намеры нямецкіх спэцслужбаў ды паліцыі супрацоўнічаць з мэтай прафіляктыкі тэрарызму. «Кантакты паміж імі могуць быць, але супрацоўніцтва — спрэчны момант. Калі сакрэтныя службы ды паліцыя пачынаюць працаваць разам, тут не-

сябра сэкты «Пасольства Божае». Адным зь яго найбліжэйшых сяброў — Сунканмі Сандэй Адэладжы, ваяўнічы пратэстанцкі прапаведнік зь Нігерыі. Летась падчас кіеўскага маршу за легалізацыю марыхуаны яго паства спрытна разагнала маніфэстантаў. Думаецца, пры новай гарадзкой адміністрацыі барацьба за чысьціню нораваў працягнецца яшчэ з большай сілай.

За гады дэмакратыі ва Ўкраіне выпрацавалася цікавая формула паводзінаў у дзень народнага волевыяўленьня. Яна чымсьці нагадвае паводзіны 31 сьнежня. У дзень галасаваньня зранку прынята добра адсыпацца, каб потым не прапусьціць галоўнага: выбарчых тэлемарафонаў. Зь дзявятай вечара, калі зьяўляюцца зьвесткі першых экзыт-полаў, вядомыя палітыкі і аналітыкі па розных студыях аж да другой ночы даюць розныя ацэнкі. Слухаць іх зьбіраюцца перад тэлевізарам кампаніямі, пад добрае віно.

Галоўнай сэнсацыяй увечары 26 сакавіка быў трыюмф Ю.Цімашэнкі. Яе блёк набіраў на некалькі адсоткаў болей, чым давалі ўсе сацыялягічныя Касандры. Сп.Юлія проста сьвяцілася з экрана тэлевізара, тым часам як нашаўкраінцы былі сумныя, і нават воплі спэцыяльна запрошаных у офіс «НУ» «Вопляў Відаплясава» не ўзьнялі іхняга тонусу. Цімашэнка карыстаецца вялікай падтрымкай сярод жанчын і часткі аранжавага электарату, незадаволенага апартунізмам Віктара Ючшанкі, найперш у сацыяльнай палітыцы. Галоўны лёзунг праграмы блёку Цімашэнкі — справядлівасьць.

далёка да ўзьнікненьня сакрэтнай паліцыі», — такім быў агульны вэрдыкт выступоўцаў.

Зладзілі «гарачы зэдлік» 10 навучэнцаў вітэнбэрскай гімназіі імя Лукаса Кранаха. На арганізацыю ў іх пайшло два тыдні. Палітыкі ахвотна згадзіліся на дыскусію, хоць і ведалі, што давядзецца размаўляць са школьнікамі. З цэлым народам гутарку весьці можна і трэба менавіта праз такія лякальныя сустрэчы — гэта ў Нямеччыне ведаюць вельмі добра. Нацысцкая дыктатура ды сацыялістычная партакратыя ў НДР давялі немцам, што дыялёг — найлепшая прафіляктыка грамадзка-палітычных хваробаў. Вось жа, каб зладзіць і ў нас такую дыскусію з удзелам прадстаўнікоў усіх апазыцыйных сілаў! Толькі каб пытаньні задавалі не журналісты, а звычайныя выбарцы. Ці ўсе палітыкі здолеюць уседзець на такім «гарачым зэдліку»? Праўда, прадстаўнікі «партыі ўлады» на такую сустрэчу наўрад ці зьявяцца. Зрэшты, ці патрэбна гэта? На «гарачы зэдлік» у Вітэнбэргу крайне правую Нацыянальную партыю Нямеччыны нават не запрасілі, хоць яе падтрымка насельніцтвам на ўсходзе краіны даволі моцная. Недэмакратычным сілам няма месца ў дэмакратычным дыскурсе, мяркуюць арганізатары імпрэзы.

Такі фармат дыялёгу ня дужа прыдаецца да гарачага месяцу прэзыдэнцкіх выбараў, а вось у пару палітычнай задухі паміж выбарчымі кампаніямі размова на гарачых зэдліках зможа значна ажывіць беларускі палітычны ляндшафт.

# Розны болевы парог

## Паралелі ды кантрасты беларускіх і францускіх пратэстаў шукае **Алесь Кудрыцкі.**

Адно з найбольш папулярных графіці ў Парыжы: «Моладзь як зубная паста ў цюбіку: калі занадта моцна націснуць, назад аніяк не загоніш». Але казаць, што Францыя цалкам ахопленая новай моладзевай рэвалюцыяй, нельга. Сапраўды, больш за палову 84 унівэрсытэтаў краіны блякаваныя студэнтамі. Аднак, як і ў нас, у Францыі хапае моладзі, збольшага задаволенай сваім станам і да радыкальных дзеяньняў не гатовай.

Найчасьцей па тэлебачаньні паказваюць, як на вуліцах б’юць машыны. Аднак гэта старая загана мэдыяў — абіраць скрайнія ракурсы. Насамрэч самыя масавыя пратэсты праходзяць досыць мірна: намёты ў дварах унівэрсытэтаў, пэрманэнтныя сутычкі з паліцыяй на вуліцах ды час ад часу вялікія, збольшага негвалтоўныя дэманстрацыі.

У параўнаньні з францускай, беларускую кантрактную сыстэму можна назваць проста драконаўскай. Прымусовае разьмеркаваньне мусіла б абурыць нашых студэнтаў ня менш, чым новы дэкрэт абурыў іх францускіх калегаў. Аднак беларусы ўсё праглынулі. Болевы парог грамадства надта зьніжаны. А на французаў націснулі крыху — і яны ўжо на вуліцах.

Ня страх беспрацоўя выгнаў французаў на дэманстрацыі. Моладзь выйшла яшчэ і таму, што адчула: зь ёй ніхто не зьбіраецца раіцца. Яе абурыў стыль палітыкі прэм’ера Дамініка дэ Вільпэна, які пачаў абыходзіцца з унівэрсытэцкай моладзьдзю так, як міністар унутраных справаў Сарказі з моладзьдзю эміґранцкай. Не пажадаўшы весьці доўгія спрэчкі з парлямэнтам, прэм’ер зацьвердзіў дэкрэтам новы аблегчаны парадак звальненьня маладых супрацоўнікаў.

Ёсьць падабенствы ня толькі паміж моладзьдзю дзьвюх краінаў — мала чым розьняцца і міліцыянты з паліцыяй. Забыты камічна-бяскрыўдны камісар Жуў ды выкшталцоны Мэгрэ. Сучасны францускі паліцыянт паўстае ў заходніх мэдыях як закуты ў плястыкавыя шчыткі, бронекамізэльку ды шалом монстар, гатовы з асалодай зьбіваць студэнтаў Сарбоны ў браніраваных грузавіках.

Нягледзячы на падабенства мэтадаў, мэты перад беларускай ды францускай паліцыяй прынцыпова розныя. Перад францускай — не дапусьціць масавых беспарадкаў, перад беларускай — не дапусьціць таго, каб людзі нават думалі пра пратэст. У Францыі жорстка ды нязграбна, але спрабуюць рэгуляваць пратэсты. У Беларусі ж спрабуюць пратэсты наўпрост зьнішчыць.

Ці вы бачылі твар моладзевага супраціву ў Францыі? Найхутчэй, ён будзе схаваны пад капелюшом ды шалікам і не належыць адмысловай пэрсоне: апошняя хваля супраціву паўставала бязь яўных лідэраў. Моладзь згуртавалася сама — пра першы страйк 10 лютага дамовіліся праз Інтэрнэт ды SMS-кі. Лідэры партыяў ды прафсаюзаў пачалі «падцягвацца» значна пазьней. Штосьці падобнае адбылося і ў Беларусі, дзе Мілінкевіч ды Казулін хутчэй не кіравалі, а кіраваліся рашэньнямі Плошчы.

Дасьледчыкі групавых паводзінаў параўноўваюць сучасныя нефармальныя групы з чарадой птушак. Так, чараду можна спужаць раптоўным стрэлам. Аднак пасьля яна зноў зьбярэцца разам. І тады чарада можа зрабіцца такой вялікай, што сваімі крыламі закрые сонца таму, хто наважыўся страляць.



# Энэргетыка лёзунгаў

Лідэрам апазыцыі няма чаго дзяліць, акрамя месца на нарах. А ўлада лічыцца адно што з законамі супрамату. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Біпалярная схема — палітычная апазыцыя супраць рэжыму — занадта спрошчаная. Кастрычніцкая плошча паказала: паўстае грамадзянская супольнасьць.

Жыхар намётавага лягеру Стась Пачобут зазначыў: там сабраліся не партыйцы, не актывісты, а «рэальныя эўрапейскія людзі».

Мілінкевіч, адчуваючы, як дынамічна фармуецца слой сьвядомых грамадзянаў, абвесьціў пра стварэньне шырокага руху за перамены. Патрэбна багата крэатыву, каб праз пэўны час не паболела грудком на могілках «шырокіх рухаў».

А найперш мусяць нарэшце высьветліць стасункі двое экс-кандыдатаў. Што дзяліць — імаверныя месцы на нарах? Падабенства да дзьвюхгаловага дракона не дадае апазыцыі валянтэраў. Асабліва бянтэжаць намеры камандаў паасобку рыхтавацца да 26 красавіка. Чарнобыльскі шлях — ператвараць у ростань?

Аб’яднанай жа апазыцыі было б недарэчы зараз рэвізаваць пэрсанальны выбар леташняга Кангрэсу («маўр зрабіў сваю справу»). Што карысьці тасаваць калоду? Дый Захад у выпадку кадравай ратацыі апынецца ў дурнаватым становішчы.

Сам Мілінкевіч абяцае, што кааліцыя не распадзецца. Кажа: гэта моцны арэшак. Важна, аднак, каб апазыцыйныя сілы мелі ня проста супольны бюракратычны орган, а баяздольную канфігурацыю.

Наконт джэнтльмэнства кіроўных вярхоў ілюзіяў няма. Зь іншага боку, яны мусяць лічыцца з моцаю вонкавага ціску ды супрацівам «чалавечага матэрыялу» ў самой краіне. На нарадзе ў аўторак Лукашэнка зазначыў, што людзі і ўлада мусяць стаць партнэрамі — і гэты эўфэмізм сымптаматычны.

Мінулая кампанія засьведчыла, што ў апазыцыйных штабах бракавала крэатыву, імправізацыі, валоданьня сучаснымі паліттэхналёгіямі. Піярам мусяць займацца добрыя адмыслоўцы, і ня толькі падчас кампаніяў. На старым камсамольскім досьведзе тут ня выедзеш.

Мілінкевічава каманда набярэ маральнае вагі, калі стрымае абяцаньне канкрэтна дапамагчы ўсім рэпрэсаваным. Вандроўкі лідэраў па глыбінцы таксама вартыя стаць не кампанейшчынай, а завядзёнкай. Слушны і намер стварыць моцную сыстэму альтэрнатыўнага інфармаваньня.

У дні Плошчы, на тле апатэозу афіцыйнае хлусьні, грамада асабліва прагна прыпадала да незалежных крыніцаў. Палітычная апазыцыя будзе дальнабачнай, калі адмовіцца ад звычкі сябраваць з вольнай прэсай ад кампаніі да кампаніі. Варта ўвесь час дбаць пра яе пэрспэктывы, выкарыстоўваючы і свае сувязі ў Эўропе.

Ядро «рэальных эўрапейскіх людзей» у добрай арганізацыйнай шкарлупіне сапраўды становіцца моцным арэшкам.

Партыйнай жа кааліцыі, не прэтэндуючы на ролю «нашага стырнавога», варта знайсьці моцныя лёзунгі, каб іх энэргетыка давала кумулятыўны эфэкт у вырашальныя пэрыяды.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Чаргу зь перадачамі на Акрэсьціна пачынаюць займа**



ць ад 6-й гадзіны раніцы.

Афіцыйная прапаганда пачала рабіць стаўку на праявы жаласьці і спачуваньня да няшчасных прадстаўнікоў рэжыму. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**



# Выратаваньне радавога Л.

Застрэльшчыкам быў асабіста ён. Падчас усенароднага курултаю наш «сакрушыцельны» стаў жаліцца, што ня можа праз занятасьць падтрыманьнем стабільнасьці наладзіць нармальнае асабістае жыцьцё. У рамках мужчынскай салідарнасьці я паспачуваў. Ва ўсіх канкурэнтаў — жонкі, а ў яго толькі лыжы, клюшка і праца з дакумэнтамі.

Тэндэнцыя праглядаецца. Пасьля падзей 25-га замест звыклых кадраў, дзе спэцназаўцы крышаць кумпаламі цагліны і, прыкінутыя амаль што ў ню, танчаць, як салямандры, пасярод вогнішча, па БТ прадэманстравалі фэйсы бедных хлопчыкаў, прыкрашаныя бланшамі. Нібыта кухталі былі атрыманыя імі, жаўнерамі МУС, у бойцы з дэманстрацыяй. Сюжэт варты дзьвюх сэрыяў мэлядрамы пра пакуты рабыні Ізаўры.

Адначасова прайшла мулька пра карэспандэнта БТ, які стаў ахвярай маніфэстантаў у парку Купалы. Закіданы сьнежкамі, ён атрымаў чэрапна-мазгавую траўму. Вось вам першы пакутнік за свабоду слова па-лукашэнкаўску. Калі выходзіць на ланцуг неабыякавых людзей?

Новая тактыка сьведчыць, што ўлады раптам дапетрылі: куды мацнейшы прапагандысцкі эфэкт выклікаюць не Паўлічэнкавы «размовы па-мужчынску», а вобраз няшчаснага бацькі з «Эўраньюс», які ня можа перадаць харчы арыштаванаму сыну на Акрэсьціна.

Фішка павінна выкарыстоўвацца і далей, ствараючы прыкольныя культурныя артэфакты, якія будуць абуджаць дзікае жаданьне бегчы і галасаваць датэрмінова на выбарах 2011 г.

Новую хвалю прапаганды можна пачаць зь невыязных мандарынаў. Як наконт споведзі пра тое, як іх плюшчыць празь немагчымасьць паваляцца на пляжах Рыўеры? Каб яны яшчэ перад камэрамі пакапалі бульбу — вось да чаго давялі праклятыя эўрачыноўнікі, — гэта быў бы поўны «алес».

Або эмацыйная прамова сьпявачкі П., якая падчас выбарчай кампаніі гучней за ўсіх енчыла «За Беларусь!». Зараз поп-дзіва ходзіць пад візавай сякерай: у траўні замест таго, каб выступаць на «Эўрабачаньні», ёй сьвеціць супэртур па Дрыбінскім раёне. Маё слабое сэрца проста б ня вытрымала. Я б адразу праз карашоў на Варвашэні, 8 (соры, Машэрава) зрабіў ліпавую даведку, што П. толькі цудам адмазалася ад «хіміі» за акцыю зь Севярынцам.

Нарэшце, ён сам можа адкрыта папрасіць адстаўкі, бо хворы на параною. Гэта, паверце, мела б адваротны эфэкт. Усе падтрымалі б проста з спачуваньня. Калі б назіральнікі з АБСЭ пабачылі, што рэжым трымаецца не на штыхох і дубінках, а на спачуваньні да няшчасных, мяркую, яны б кінулі дурное і нарэшце аднавілі б нашае сяброўства ў Радзе Эўропы.

# Рыбакі ў цывільным

Хто яны, гэтыя людзі з шэрымі латамі на сьвядомасьці? Якімі павінны іх бачыць мы, калі наагул павінны бачыць?

Мяне як шараговага грамадзяніна пры любым дзяржаўным ладзе турбуе, ці стаіць за мной нябачны, але ўсюдыпрысутны чалавек, які ў крытычны момант закрые маю сьпіну ад кінжала хціўцы і ворага. Я хачу верыць, што гэтая непрыкметная асоба зь мяккімі рухамі і сталёвым позіркам умее мяне абараніць і нават здольная занесьці руку для маёй абароны на адно імгненьне раней за ўдар. Калі яна існуе насамрэч і здольная на гэта, разважаю далей я, я павінен альбо нічога ня ведаць пра яе сам, альбо ведаць нешта такое, што дасьць мне веру ў абароненасьць сьпіны. Тэлекарцінкі зь ценямі супрацоўнікаў спэцслужбаў — у камуфляжы, з зацемненымі тварамі, са зьмененым голасам — пасьля дасягненьня мной паўналецьця ўражваюць усё менш.

Што я ведаю пра іх? Пра людзей, што на паўкроку адступілі ў паўзмрок?

Распавядае знаёмы. Паляк. Грамадзянін суседняй дзяржавы, якая нядаўна ўступіла ў NATO. Год таму яго выклікалі ў райаддзел міліцыі як іншаземца зь відам на жыхарства. Там, у кабінэце ўчастковага, зь ім пазнаёміўся чалавек у цывільным, які распытаў пра жыцьцё і пляны. Канкрэтных прапаноў не даваў, але паабяцаў — зьвяжамся. Намінкі, абрыўкі фраз. Ваша краіна ўступіла ў NATO. Вы ж разумееце, у якой зьнешнепалітычнай сытуацыі знаходзіцца наша дзяржава. Ці часта бываеце на радзіме?

Церазь месяц зьвязваюцца па тэлефоне. Сустрэча ў кавярні. Цяпер іх двое, у цывільным, называюць толькі імёны. Замаўляйце, што хочаце. Грошы ў нас ёсьць. Дык ці часта вы бываеце на радзіме? Цягам трох сустрэч абрыўкі фраз сплятаюцца ў цэлую тканіну. Мы вам дамо назвы ваенных аб'ектаў, а вы прывязеце іх фатаздымкі. Для пачатку. Аплата за карысную інфармацыю да 600 тысяч.

Намаганьнем волі прымушаю сябе паверыць, што гэта нармальная практыка вэрбоўкі. Сярод новых мэтадаў работы, трэба думаць, людзі ў цывільным аналягічнага пакрою хутка засвояць вэрбоўку ў барах і рэстарацыях памежных гарадкоў Польшчы, а таксама па тэлефоне, цераз e-mail і SMS.

Распавядае сябар. Чарговыя ўгодкі бітвы пад Воршай, Крапівенскае поле. Сотня нацыяналістаў сярод намётаў, гітары, песьні, рэдкі бразгат жалезкі аб жалезку. Дзясятак мясцовых дзетак. Парачка міліцыянтаў у цяньку на ўзьлеску. Рыбак. Рыба ня ловіцца, ён нават ня надта зважае на кіўкі паплаўка. Але сядзіць доўга, засяроджана, нерухома. Сьвятую цішыню на беразе толькі штохвіліны прарывае піск з-пад пазухі. «Первый, первый, у нас всё тихо, приём».

Як чалавек далікатны, магу толькі ўзрадавацца, што хоць так гэты рыбак у цывільным далучыўся да нацыянальнага сьвята.

Расказваюць сябар, яго бацька і калега майго бацькі, былы супрацоўнік у цывільным. У нашым горадзе будынак дзяржбясьпекі мае чатыры паверхі. А ліфт у ім усталяваны на дзесяць. Пра гэта ведае ўвесь горад, хоць кожны з будаўнікоў гэтага ліфту падпісваўся аб нераспаўсюдзе зьвестак. Затое толькі былыя супрацоўнікі ў цывільным ведаюць — і расказваюць — пра спэцыяльныя прыстасаваньні, якімі багатыя трэці і асабліва чацьвёрты падземны паверхі. Адно зь іх — стул зь дзіркай у сядзеньні. Вельмі дапамагае спрасьціць допыт мужчыны. Супрацоўніку ў цывільным застаецца толькі час ад часу, распытваючы, намацваць праз гэтую дзірку нагой што-небудзь, на што націснуць.

Як чалавек далікатны, я не бяру на сябе сьмеласьці заяўляць, што клянуся захоўваць вядомыя мне таямніцы пры любых абставінах.

Расказвае знаёмы, супрацоўнік газэты. Званок у рэдакцыю. Вы апошнія, хто мне можа дапамагчы. Я сядзеў двойчы, два гады таму мяне зноў злавілі на крадзяжы, але прапанавалі супрацоўнічаць. Я здаў спачатку аднаго свайго сябра, потым другога. Ад мяне патрабавалі яшчэ. Здаў усіх, каго ведаў. Паведамляў пра ўсе ходкі, пра якія ведаў. Цяпер ад мяне патрабуюць яшчэ. Усе, каго я ведаў, сядзяць. Ім усім расказалі, што здаў іх я. Мне няма каго здаваць больш. А калі я перастану супрацоўнічаць, мяне пасадзяць на трэцюю ходку. У турму, дзе сядзяць мае сябры.

Гэтаму чалавеку па тэлефоне мой знаёмы нічым не дапамог. Газэта дзяржаўная, хутка выбары. Мне зараз альбо ў турму, на сьмерць, альбо самому павесіцца — так завяршылася тая тэлефонная размова. Болей пра яго я ня чуў.

Расказваю я. Цераз майго начальніка супрацоўнік у цывільным папрасіў у мяне за свайго інфарматара, майго навучэнца. На экзамэне бялявы малады чалавек з пранізьлівымі сінімі вачыма чырванее, апускае вочы, адказвае па тэме, але так сарамліва, нібыта я яго гадзіну таму засьпеў за ананізмам. Не іначай, ведае, што за яго папрасілі. Але ж гэты сорам — больш моцнага, едкага, відавочнага сораму я ня бачыў у жыцьці! Што гэта можа быць за праца зь людзьмі ў цывільным, калі яе так саромеюцца — падумаў тады я.

Наўрад ці гэта праца спыніць руку з кінжалам, накіраваным мне ў сьпіну ворагамі майго супярэчлівага грамадзтва.

**Алесь Цюбакоўскі**

## НА ТЭМУ

### Пракол КДБ

У глыбоцкай кавярні «Нэон» абедалі назіральнікі АБСЭ. Мясцовае КДБ падрыхтавалася: размовы назіральнікаў, а таксама бразганьне відэльцаў і нажоў, трансьлявалася на частаце 92,3 FM у радыюсе кілямэтру вакол кавярні.

*Глыбоцкі*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Чалавек  у цывільным зьбірае бел-чырвона-белыя сьцягі падчас ліквідацыі намётавага гарадку.**

Меней за ўсё ім патрэбныя нашыя енкі, а таксама ілжывы патас і ўсхваленьні. Усяго толькі й трэба, што заставацца разам, нібы няма паміж намі жалезабэтоннае сьцяны з калючым дротам і відэакамэрамі назіраньня. Піша Віталь Тарас.

# Па кім плача Акрэсьціна

## Імя ім — легіён

Маштаб гістарычных падзеяў цяжэй за ўсё ацэньваць, калі знаходзісься ў эпіцэнтры, калі робісься іх сьведкам ці ўдзельнікам.

Бракуе словаў, каб выказаць уласныя пачуцьці, розум губляе сілу, ня здатны ахапіць маштаб таго, што адбылося ў Беларусі пры канцы сакавіка.

Казаць, што на наступны дзень пасьля выбараў мы прачнуліся ў іншай краіне, — газэтны штамп. Але нават старыя штампы напаўняюцца новым сэнсам. Чатыры ночы запар некалькі сотняў юнакоў і дзяўчат спрабавалі абудзіць нас, ахвяруючы ўласным сном, каб мы сапраўды *абудзіліся*. І тое, што ўлада кінула супраць мірных дэманстрантаў адборныя сілы, узброеныя гранатамі, аўтаматычнай зброяй і спэцтэхнікай, сьведчыць пра тое, што яна, улада, збаялася рэальнага абуджэньня беларусаў. Да яго яшчэ далёка. Але відавочна, што за тыдзень, які выпаў на вясновае раўнадзенства, самасьвядомасьць беларускага грамадзтва прасунулася нашмат далей, чым за папярэднія 10 гадоў.

Аб'ектыўны аналіз пакінем будучым палітолягам і гісторыкам. Але ёсьць рэчы, якія немагчыма не сказаць сёньня — калі за кратамі застаюцца нашыя дзеці й бацькі, сваякі й сябры, знаёмыя й незнаёмыя... Імя ім — легіён! Меней за ўсё ім патрэбныя нашыя енкі, а таксама ілжывы патас і ўсхваленьні. Усяго толькі й трэба, што заставацца разам, нібы няма паміж намі жалезабэтоннае сьцяны з калючым дротам і відэакамэрамі назіраньня. Як казаў, усьміхаючыся, Сталін з анэкдоту пра ГУЛаг: «У нашай краіне самае каштоўнае — гэта людзі». Толькі сёньня спадкаемцы Сталіна ня столькі людзей хаваюць за калючым дротам ад сваякоў і журналістаў, колькі самі хаваюцца ў страху ад людзей, ад усяго сьвету. І ня трэба даваць ім паслабленьня ні на хвіліну...

## У сьпісах не пазначаны

Назва завулку, які носіць імя Акрэсьціна, зрабілася ня проста вядомай на ўвесь сьвет геаграфічнай кропкай у беларускай сталіцы. Яна зрабілася хадзячай назвай. Так, некалі, у 1988-м, Курапаты перасталі быць толькі назвай урочышча пад Менскам альбо могілак дзясяткаў тысяч ахвяраў сталінскага генацыду. Курапаты сталі сымбалем сталіншчыны, сымбалем рэпрэсіяў НКВД, а таксама й сымбалем грамадзянскай мужнасьці валянтэраў, якія абаранілі могілкі ад зьнішчэньня ды апаганьваньня ўладамі.

Імя героя СССР Барыса Акрэсьціна, які загінуў у ліпені 1944 г., ніякім чынам не зьвязана са спэцпрыёмнікам-разьмеркавальнікам. Калі ў народзе гавораць «на Акрэсьціна» ці «на Акрэсьціне», ніхто, канечне, ня згадвае ІІ сусьвеьтную ці лётчыка — ураджэнца Масквы, які загінуў пад Менскам. Акрэсьціна стала сымбалем рэпрэсіяў і бясправўя. Але ня толькі...

Пятніцу, 24 сакавіка, мне давялося правесьці з жонкай ля сьценаў спэцпрымальніка-разьмеркавальніка разам зь дзясяткамі іншых людзей, чые крэўныя ці сваякі патрапілі сюды напярэдадні. Частка спрабавала перадаць вязьням цёплыя рэчы, ежу, прадметы гігіены. Частка — і такіх было больш — хацела хоць нешта ўведаць пра лёс затрыманых. Перад намі ў чарзе стаяў таксіст з Полацку, сын якога зьнік у раёне Кастрычніцкай плошчы яшчэ 21 сакавіка. Усе спробы даведацца, дзе знаходзіцца ягоны сын, натыкаліся на глухую сьцяну — на Акрэсьціна, у ГУУС, у іншых месцах суха адказвалі адно й тое ж: у сьпісах няма. І гэта была абсалютна тыповая сытуацыя. Адзіным спосабам прымусіць міліцыянтаў хоць нешта гаварыць, хоць неяк варушыцца, было падаць заяву аб зьнікненьні сваяка ў РУУС. Тады, ня маючы права адмовіць у прыняцьці заявы, якую неабходна афіцыйна зарэгістраваць, супрацоўнікі райаддзелу пачыналі кудысьці тэлефанаваць, нешта высьвятляць і называць месцы, дзе ўтрымліваюцца «зьніклыя». Але й гэта не было гарантыяй, што вам ня схлусяць, накіруюць туды, куды трэба, не назавуць няправільны адрас, тэлефон, прозьвішча.

Увогуле, у людзей, якія мерзьлі ўвесь дзень у чарзе на Акрэсьціна, не было ніякіх гарантыяў ці хоць бы надзеі на атрыманьне інфармацыі. Ні яны не маглі тэлефанаваць затрыманым, ні затрыманыя — ім. Калі адна з жанчын, якая прыйшла забіраць няпоўнагадовага сына, сказала паставому, што ён ужо даўно чакае яе і што яму толькі што ўдалося паведаміць ёй пра гэта з камэры, праз мабільны тэлефон, ахоўнік не прапусьціў жанчыну, але стаў намагацца, каб яна назвала нумар гэтага тэлефону.

## Бацькі і дзеці

Сваякам у многіх выпадках адмаўлялі ў перадачы лекаў хворым. Жанчына, якая прынесла інсулін — жыцьцёва неабходны лек пры дыябэце, мусіла чакаць некалькі гадзінаў, пакуль над ёй зьлітаваліся. Калі тут пасуе гэтае слова.

Горш за ўсё было тым, каго прывезьлі з Кастрычніцкай плошчы


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ўначы. Іх паўдня трымалі проста ў турэмным двары, ля сьценаў разьмеркавальніка. Людзі, якія чакалі зьвестак вонках, здагадаліся пра гэта, калі затрыманыя пачалі скандаваць за сьцяной «Жыве Беларусь!». Гэта выклікала ў натоўпе ля прымальніка вялікае хваляваньне. Яны пачыналі скандаваць у адказ «Ра-зам! Ра-зам!».

Хваляваньні дасягалі свайго піку кожнага разу, як з Акрэсьціна выяжджалі аўтобусы з арыштантамі ці прывозілі іх назад пасьля судоў. Людзі абкружалі гэтыя аўтобусы, крычалі, спрабавалі не даваць ім ехаць. Кожнага разу падбягаў атрад амапаўцаў, які каравуліў паблізу, і людзі разьбягаліся. Але ненадоўга. Зьяўляўся чарговы аўтобус ці вагон-зак, і яны зноў спрабавалі блякаваць іхны рух. І зноў па трывозе прыбягаў АМАП. Але за тыя некалькі сэкундаў, калі аўтобусы прыпыняліся, некаторыя пасьпявалі пазнаць за вокнамі сваіх. Гэта былі імгненьні сапраўднай радасьці.

Некалькі разоў прыяжджала хуткая дапамога, і кожнага разу лекары адмаўляліся паведаміць, да каго іх паклікалі. Кіроўца адной з санітарных машынаў, якая забрала хворага хлопца, нават паехаў назад у аб’езд, каб не сутыкнуцца з сваякамі вязьняў. У выніку машына загразла, і людзям давялося бегчы дапамагаць яе выштурхоўваць з каляіны.

Тым часам некалькі дзясяткаў чалавек зь перадачамі цярпліва чакалі, калі іх пачнуць прымаць. Як потым высьветлілася, у гэтых людзей не было ў той дзень ніводнага шанцу. Але ніхто ня выйшаў да іх ня тое, каб папрасіць прабачэньня, але хаця б сказаць, каб людзі не чакалі дарэмна. Прыбіральняў, нават звычайных лаваў каля турмы няма. Як кажуць, не курорт.

Дзякуй тым невядомым людзям, якія куплялі гарбату ў кардонках і раздавалі іх усім, хто жадаў. Нейкая прадпрымальніца прыслала на Акрэсьціна некалькі скрыняў з сокам — для вязьняў.

У чарзе былі самыя розныя людзі, пераважна сталага веку. Не ва ўсіх зь іх, мяркуючы па размовах, склаліся добрыя стасункі з сваімі дзецьмі. Нехта скардзіўся, бурчэў. Нехта, відаць, застаўся далёка не ў захапленьні ад лідэраў апазыцыі, а можа, нават, і галасаваў за Лукашэнку. Але большасьць прысутных хутка паразумелася паміж сабой, паступова ўзьнікла пачуцьцё салідарнасьці — хай сабе і маўклівай. Амаль кожны гатовы быў хоць чымсьці дапамагчы чужому гору.

У гэтыя дні дзеці выхоўвалі сваіх бацькоў.

## Палітыкі і real-politic

Раніцай у пятніцу на Акрэсьціна зьявіўся Мілінкевіч зь Інай Кулей. Яны шукалі сына сп.Іны, затрыманага на Кастрычніцкай. Мілінкевіч выглядаў стомленым, адказаў на некалькі пытаньняў прысутных, але даваць інтэрвію журналістам адмовіўся. Бліжэй да поўдня зьявіўся Казулін. У абкружэньні фота- і тэлекарэспандэнтаў ён пачаў ламіцца ў дзьверы спэцпрымальніка, патрабаваць начальніка. Потым ягоныя памочнікі раздалі прысутным скаргу на імя генпракурора на дзеяньні міліцыі. Скаргу падпісалі больш за дваццаць чалавек. Пасьля гэтага Казулін зьехаў і вярнуўся празь

**Працяг на старонцы 30.**

# Па кім плача Акрэсьціна

Працяг са старонкі 29.

некалькі гадзінаў. Ён паведаміў, што яму ўдалося дамовіцца з памочнікам пракурора, каб у людзей пачалі прымаць перадачы. Казулін зноў пачалаў ламаць уваходныя дзьверы, потым — лаяцца з аховай, патрабаваць, каб выклікалі начальства. Потым ён запэўніў прысутных, што праз паўгадзіны ўсё будзе ў парадку. Людзі хутка выстраіліся ў чаргу ў чаканьні цуду. Праз паўгадзіны Казулін ізноў зьнік. Ягонае імя ў той дзень ніхто больш не згадаў.

Нават тут, на Акрэсьціна, дзе, здавалася, ужо не было месца палітычным разборкам, працягвалася падспуднае процістаяньне. Як толькі на ўваходных дзьвярох зьявіўся партрэт Мілінкевіча, як адразу нехта з актывістаў штабу Казуліна прычапіў і ягоны партрэт. Перад гэтым на дзьвярох зьявілася налепка «Достал!» і джынсавая стужка. Апрача ўсьмешкі, у прысутных гэтая схаваная барацьба за зачыненыя дзьверы нічога больш ня выклікала. Але, як выявілася наступным днём, процістаяньне зайшло надта далёка і будзе мець трагічныя наступствы.

Склалася ўражаньне, што яны, палітыкі, засталіся статыстамі на палітычным полі. А тыя, каму адводзілася роля статыстаў ці проста дэкарацыі, якая б нагадвала каляровую рэвалюцыю, выйшлі на першыя ролі. Нават не жадаючы таго, маладыя людзі зрабіліся рухальнай сілай рэвалюцыі, толькі не маляванай, а сапраўднай. Бо яны пачалі дзейнічаць — спантанна, неспадзявана і, галоўнае, шчыра. Як толькі падзеі пачалі разьвівацца па-за рамкамі звыклага сцэнара, і ўлады, і палітыкі разгубіліся. І тыя, і другія пачалі рабіць грубыя памылкі, дзейнічаць неадэкватна, гістэрыкаваць.

У маладых людзей у намётавым гарадку на плошчы не было ніякіх шанцаў. І яны гэта ведалі. Яны проста сьпяшаліся зрабіць тое, што не пасьпелі, не змаглі, ня здолелі зрабіць дарослыя дзядзькі са штабоў апазыцыйных кандыдатаў за некалькі месяцаў — даць выбарчай кампаніі душу й дух супраціву. Выявілася, што ў распараджэньні ў палітыкаў няма ня толькі запаснога варыянту на выпадак пройгрышу, а проста няма ніякіх варыянтаў працягу барацьбы. Толькі ў аднаго зь іх знайшлася мужнасьць прызнаць гэта. Другі вырашыў застацца лідэрам любой цаной і павёў людзей насустрач дубінкам і сьлезацечнаму газу. Ды не пра палітыкаў зараз гаворка...

## Па той бок

Ня Цэнтравыбаркам, не міліцыя, не КДБ, не суды выклікалі ў гэтыя сакавіцкія дні найбольшую агіду й нянавісьць звычайных людзей. Вораг увасобіўся ў абрэвіятурах БТ і АНТ. Бэтэшнікаў і аэнтэшнікаў пачалі біць. Сам гэты факт не выклікае асаблівай радасьці — таксама як і спачуваньня да аб'ектаў нападу. Ствараючы вобраз ворага з удзельнікаў акцыі пратэсту на плошчы, паказваючы іх, з дапамогай мантажу й элемэнтарных падробак, абібокамі, наркаманамі, блакітнымі, прагнымі да грошай мярзотнікамі, якія толькі п'юць каньяк і сяруць у каналізацыйныя люкі, тэлебачаньне дамаглося пастаўленай задачы. Але яно не ўлічыла існаваньня жывых людзей. Што ня дзіўна, паколькі ў тых людзях, якія здымаюць падобныя сюжэты, ня кажучы пра іх непасрэдных начальнікаў, нічога чалавечага даўно не засталося. Але ў многіх нармальных гледачоў, якія звычайна схільныя прымаць усё, што паказваюць з экранаў, за праўду, ёсьць сваякі альбо крэўныя. І калі яны выйшлі на плошчу, а потым апынуліся за кратамі, многія гледачы раптам адчулі, што БТ зьняважыла іх усіх.

Нават калі пакінуць без увагі ўсё, што беларускія каналы гаварылі пра апазыцыю цягам апошняга месяца, калі забыцца на іхныя рэпартажы з плошчы, «зачышчанай» АМАПам, з падкінутымі бутэлькамі й шпрыцамі, дастаткова будзе ўсяго аднаго факту. Калі сотні людзей мерзнуць на вуліцы ў марнай надзеі пачуць хоць слоўца пра сваіх крэўных на Акрэсьціна, туды прыяжджае здымачная група БТ, і ахова перад ёй шырока расчыняе вароты — ідзеце й здымайце ў камэрах, каго й колькі хочаце. Ужо адно гэта кладзецца на тэлежурналістаў незмывальнай плямай ганьбы. Такое тэлебачаньне не заслугоўвае на іншую назву, акрамя як «турэмнае тэлебачаньне».

Сёньня нармальныя людзі кідаюць у ягоных супрацоўнікаў сьнежкамі, і гэта, мабыць, прыводзіць зімоўскіх і азаронкаў у захапленьне — будзе, чым страшыць абываталя. Вось яны якія, агрэсіўныя апазыцыянэры-псыхапаты.

Але рана ці позна журналістам дзяржаўных СМІ давядзецца трымаць адказ. Бо іх таксама здымаюць калегі зь іншых тэлеканалаў. І фатаграфіі злачынцаў з тэлекамэрамі застануцца, прынамсі, у архівах гісторыі.

І яшчэ. Каля Акрэсьціна давялося бачыць, як некалькі жанчын з натоўпу за некалькі сэкундаў давялі маладую журналістку расейскага каналу ТВЦ да сьлёз. У першы момант яе стала шкада. Але потым падумалася — а чым, уласна кажучы, расейскія тэлеканалы прынцыпова адрозьніваюцца ад беларускіх? Так, яны яшчэ не навучыліся таму цынізму, зь якім працуюць іхныя беларускія калегі, ад іх каналаў яшчэ ня так сьмярдзіць каналізацыяй, як ад айчынных. Але казаць ня ўсю праўду ці палову праўды, замоўчваць маштаб рэпрэсіяў, пасьміхацца над апазыцыяй і яе прыхільнікамі расейскія журналісты навучыліся цудоўна. Але гэтаксама, як і дамарослыя «каралі этэру», яны ня хочуць разумець, што сеюць зубы дракона.

А потым, як заўжды, яны будуць шчыра зьдзіўляцца — і за што вы нас так ня любіце?..

## Сустрэнем нашых *разам*

Паважаная рэдакцыя «Нашай Нівы»!

Піша вам брат аднаго з затрыманых падчас падзеяў Беларускага Майдану. Падзеі ідуць, эмоцыі нас перапаўняюць... Галоўнае, што мы можам зрабіць, апроч інфармаваньня грамадзтва, — гэта падтрымаць тых, хто стаў ахвярай палітычных рэпрэсіяў.

Трэба сустрэць нашых гераічных родных. Мы можам *разам* сустракаць нашых родных — тых, хто на Акрэсьціна, на Старабарысаўскім тракце, у Жодзіна.

Напрыклад, зважаючы на тое, што першыя масавыя затрыманьні адбыліся ў ноч на 21 сакавіка, прапаную сустрэцца *разам* ля сьценаў Акрэсьціна ў ноч з 30 на 31 (роўна праз 10 сутак пасьля затрыманьняў). Нам важна быць *РАЗАМ*. Хтосьці з бацькоў адзін, камусьці цяжка — дык давайце падтрымаем адно аднаго. Бо 24 сакавіка многія ля сьценаў упершыню ў жыцьці адчулі, што такое чалавечае братэрства. Таму будзем *разам!*

Гэта ня бузе палітычная акцыя, а проста сумесная сустрэча вязьняў. Таму ня трэба лёзунгаў, плякатаў. Дастаткова прыйсьці, каб разам разьдзяліць радасьць сустрэчы родных. І ні ў якім разе ня будзем рэагаваць на правакацыі.

**Юрась Бусел**

## Выкінутае пакаленьне

Яны не прасілі нічога звышнатуральнага. Проста хацелі, каб іх пачулі і трошачкі зразумелі. Але ім здрадзілі. Толькі здраднікам выявіўся кожны асобна ўзяты мінак, кожны заўсёднік «соткі», кожны асобна ўзяты Баязьлівец, Пафігіст, Эгаіст. За сьвяты абавязак — прынамсі, напачатку — палічылі павысьміхацца і нібыта «незалежныя» журналісты.

Мы былі сьведкамі клясычнай сцэны вайны пакаленьняў, разрыву бацькоў і дзяцей, клясычнай бытавой трагедыі. Грамадзкай кухняй, зь яе «правамі і свабодамі», яе немагчымымі ў іншых месцах палітбаталіямі стала «рэвалюцыйная» Кастрычніцкая. Розьніца ў тым, што гэтым разам ня сцены ўзводзілі, а рылі бездань — мы, народжаныя ў СССР, шчасьлівыя насельнікі духоўнага гета, сваімі рукамі. «Дасьведчаныя» па жыцьці, нібы ім навучаныя, мы прайгралі кінуты выклік, нават не асэнсаваўшы сам факт выкліку. Налізаўшыся бэтэшнага зельля, аказаліся здольныя толькі да аднаго: «*усё роўна ў іх/вас нічога ня выйдзе*». Нават ня проста «ня выйдзе» ці «ў нас ня выйдзе», а «ў іх/вас» нічога ня выйдзе. Якое вытанчанае прakляцьце вычварнага бацькоўскага розуму цнатліваму, але храбраму юначаму сэрцу! Толькі ў «*іх*» — атрымалася. «Людзьмі звацца» — ня чыпсы зь півам травіць, тупа ўтаропіўшыся ў «скрыню». Яны, маладыя хлопцы і дзяўчаты, што выйшлі на плошчу пад страхам «сутак», змаглі забіць у сабе быдла. Што зрабіў ты, філёзаф на канапе?

Ім прыпісалі наіўнае жаданьне памайданіць. Ніхто і не заўважыў, што ноччу на вуліцы −10 і зь якой хрыпатой яны размаўляюць, як дзясяткамі яны зьнікаюць у міліцэйскіх машынах і як сама плошча становіцца Сэнацкай.

Так, Кастрычніцкая плошча так і ня стала ані Сакавіцкай, ані плошчаю Каліноўскага. Але агонь Менскай вясны запаліла менавіта яна. Цяпер многія зьедуць. І наўрад ці вернуцца праз пяць гадоў: за кардонам хранічны патрыятызм лёгка лекуецца. Дый не вяртаюцца ў Царства мёртвых, калі за сьпінай няма анікога, на каго хацелася б азірнуцца.

**Андрэй Баеў**

Дзяўчынцы–талачынцы, Вользе Ч. будучаму журналісту, за ўдзел у акцыі Свабоды асуджанай на 15 сутак прысьвячаю:

У цэнтры Менску пляц гамоніць,
Хоць вецер зь сьнегам дужа дзьме...
Свабода, праўда з плошчы крочыць,
Хоць Звон Свабоды ўжо ў турме.

Хоць сотні хлопцаў арышт маюць,
І ўжо дзяўчо ў турме сядзіць,
Але ж, сябры, часы мінаюць,
Калі народ, як раб, маўчыць!

У змроку плошчы цені бачны,
Намёты. Сьвечкі. Моладзь танчыць...
Адзінкі сьмелых, вам удзячны!
Хлусьня пра вас уладу ганьбіць!

**Мікола Петрушэнка, Талачынскі раён, polk.by@list.ru**

***
У паветры чуецца подых вясны —
Прырода хутка абудзіцца.
А вы, беларусы, пакіньце сны,
Ня хочацца вам прачнуцца?!

Прашу вас, давайце ня будзем маўчаць,
Свой лёс мы вырашым самі.
Каб дзеці маглі нам дзякуй сказаць
За тое, што мы не маўчалі.

**Ганна Будоль**

## Час ня спыніцца пасьля выбараў

На барысаўскім аўтавакзале сустрэў знаёмую, зь якой ня бачыўся больш за год. Я ведаў гэтую паненку як прынцыпова беларускамоўную, якая ў свой час нават папікала мяне за ўжываную трасянку. Цяпер гэта расейскамоўная задаволеная жыцьцём юначка, што на ўсе пытаньні адказвала па-чужому. «Чаму?» — «Новые друзья, новые интересы». Аказваецца, што й палітыкай ужо не цікавіцца, а год таму стаяла ж на Кастрычніцкім пляцы, пратэстуючы супраць «вынікаў» рэфэрэндуму.

Неяк усё меней беларускамоўных маіх аднагодак. Глядзіш на гэтых «зубранят», а ўсе міжсобку па-расейску перамаўляюцца. Загаворыш на матчынай мове — і ня кожны падхопіць. Тое самае са зборшчыкамі подпісаў за Алеся Мілінкевіча.

Нацыянальны рух, прынамсі ў правінцыі, працягвае драбнець. Змаганьне цяпер не ў пашане. Большасьць тлумачыць адыход ад беларускіх справаў тым, што для іх сямейных тут няма ніякага дабра. Хіба гэта добра, што малое дзіця ня можа наведваць беларускамоўны садок, а надпіс на роднай мове на магіле — гэта ўжо выклік? Сапраўды, ніхто табе не набудзе кватэру ці самаход, калі ты будзеш стаяць у пікеце і раздаваць улёткі. Спажывізм сёньняшніх беларусаў папросту ўражвае. Патрэбныя нейкія духоўныя арыенціры для ўсёй нацыі. А яны навідавоку: мова, вера, свабода.

Час ня спыніцца пасьля выбараў. Сумленна ўмацоўвай сваю дзялянку — і час перамен абавязкова прыдзе. Нацыянальны рух стане рухам моцным.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

Шаноўныя нашаніваўцы, дасылаю вам два вершы, якія напісаў пад уражаньнем ад навінаў пра падзеі на Кастрычніцкай плошчы маленькі хлопчык.

Яну Беляўцу ўсяго 6 гадкоў. Слухаючы навіны пра гвалт на пляцы, гойдаючыся на хатніх арэльках, ён нечакана загаварыў вершамі.

**З павагаю, Мікола Крывальцэвіч**

АДКРЫТЫЯ САКРЭТЫ
Адкрытыя сакрэты
Лёшы і Антона.
Яны хочуць
захапіць усе
цацкі, каб
паламаць усе
цацкі.
Каб яны не
пасьпелі, трэба
адбіць атаку.

РЫХТУЕЦЦА ЗЛАЧЫНСТВА
Ухіны сябры
хочуць выгнаць
усіх людзей і
атрымаць увесь
сьвет.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Да 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»

**РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар»**

**пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «ARCHE», «Дзеяслоў», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com»**

**абвяшчае**

# КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 26 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.).

**Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 красавіка 2006 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 красавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску ў першай палове траўня.**

**Творы дасылайце на адрас:** e-mail: maladylitaratar@tut.by. **Паштовы адрас:** а/с 218, 220050, Менск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар». У лісьце абавязкова пазначце дату нараджэньня і кантакты (паштовы і электронны адрасы, тэлефоны). **Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.**

***Журы конкурсу:***

Уладзімер Арлоў, Андрэй Дынько, Ганна Кісьліцына, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч.



# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка,
а ў Менску — да суботы,
абавязкова тэлефануйце
ў Рэдакцыю.
Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32 (МТС)

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

## запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Шчыры дзякуй за шчодрасьць!

Аляксандру М. з Астравецкага раёну.
В.С. з Ашмянаў
Георгію Р. з Карэліцкага раёну.
Арцёму Г. зь Ліды.
Зьмітру К. з Мастоў.
Валянціне М. з Навагрудку.
Івану А., Валеру Г., Сяргею Д., Андрэю К. з Горадні.
Вользе Б. са Століна.
Віктару П. з Баранавіч.
Мікалаю В. з Пружанскага раёну.
Ірыне Я. зь Берасьця.
І.К., Андрэю С., С.З. з Воршы.
Анатолю М. з Новалукомлю.
Уладзіславу Л. з Шаркоўшчыны.
Уладзімеру Ш. зь Віцебскага раёну.
Эдуарду М., Аўгену К., Юр’ю Б. зь Віцебску.
Сяргею К. з Маладэчна.
Аляксею С. з Стапцоўскага раёну.
Сьцяпану Г. з Калодзішчаў.
Сьвятлане Н., Е.С.,
Аляксею К. з Магілёва.
Валер’ю М. з Круглянскага раёну.
Алісе К. з Бабруйску.
Лідзіі М., Віталю Ц. са Жлобіну.
Алегу М. з Гомелю.
У.Д. з Мазыра.
Ю.М., Валер’ю В., А.П., Ю.В., К.Л., Ірыне З., Аўгену Ш., Э.С., Сьвятлане Б., Галіне Ж., Георгію Ш., Мікалаю Л., Міхасю Ф., Н.Б., Аляксандру Е., Вользе К., Марыне П., Валянціне Ш., Валянціну Ш., Г.Б., Іне З., Андрэю Л., Кацярыне З., Марыі Н., Л.І., Анатолю З., М.У., Надзеі М., К., С.Р., В.К., Аляўтыне В., Галіне Б., Аляксандру М., Уладзімеру З., Аляксандру С., Б.Я., Валер’ю І., Вользе А., Марыне Б., Марыне З. зь Менску.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай празь «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# «Залатая Літара» на Дзень Волі




Адам Глёбус уручаў прэмію ў кавярні «Стары Менск». Сёлета ляўрэатам стаў Ігар Бабкоў за кнігу эсэістыкі «Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньне ру[і]наў». У дадатак да грошай заснавальнік прэміі падараваў ляўрэату кнігу — трагедыі Шэксьпіра.

На ўручэньні Бабкоў ахарактарызаваў сёньняшні час: «Усё ацэньваецца, але нічога ня цэніцца. Паўсюль пануе лічба». «Таму ў нас Літара супраць Лічбы», — падтрымаў Глёбус.

Сьвята атрымалася камэрным і амаль хатнім. Ганна Кісьліцына сказала, што, зьбіраючыся на вуліцу, апранулася сьпярша ва ўсё чорнае, каб ісьці на мітынг, але потым памяняла вопратку на ўрачыста-белую: «Сьвята ёсьць сьвята, і мы не павінны падладжвацца пад іх».

**Адам Воршыч**

# «Плоскасьць свабоды»

27 сакавіка ў галерэі «Фальварак Добрыя Мысьлі» адкрылася выстава жывапісу і графікі Ілоны Барадулінай. Піша **Сяргей Харэўскі.**



Арт-кавярня «Добрыя Мысьлі» правяла сваю чарговую імпрэзу, прэзэнтуючы менскай публіцы тое мастацтва, што з розных прычынаў няможна пабачыць у іншых залях. Творы Ілоны Барадулінай пабачыць у Беларусі цяжка. Па-першае, яна жыве й працуе пераважна ў Санкт-Пецярбургу. Па-другое, яна — дачка народнага паэта, які добра пасьпеў вызначыцца нонканфармізмам — падзяляе бацькавы погляды. Тыя экспазыцыі, што Ілона ладзіла ў Менску, тыя артыстычныя акцыі, у якіх яна брала ўдзел, былі альтэрнатыўныя афіцыёзу. Ня склаліся стасункі ў Барадулінай і зь дзяржаўнымі інстытуцыямі мастацтва ў нашай краіне. Апошняя пэрсанальная яе выстава «Новая дарога» адбылася тут ажно дзесяць гадоў таму ў Музэі беларускае літаратуры. Таму наведнікі «Плоскасьці свабоды» атрымалі ўнікальную магчымасьць пазнаёміцца з тым, што стварае Ілона цяпер, як мысьліць і куды імкнецца. Сытуацыя кавярні, зь яе паважнай абслугаю й стандартнымі пахамі, робіць насамрэч самавітае ўражаньне.

«Зайздрошчу кулінарнаму мастацтву. Кухары ня ведаюць пасьмяротнага прызнаньня. Страўніку чалавек верыць безумоўна, а за сваю душу — выбачаецца. І чым незвычайнейшы, нестандартнейшы твор, тым больш выбачэньняў можна выслухаць ягонаму стваральніку за тое, што ён да душы цёмнаму наведніку, які не разумее», — кажа на пачатку акцыі Ілона Барадуліна.

Творы мастачкі незвычайныя ў беларускай плоскасьці. Выломваецца адтуль і яе плястыка, і набор вобразаў. Паспрыяла тое, што яна ня мела традыцыйнае для Беларусі мастакоўскае адукацыі, за выняткам хіба навучаньня ў школе з мастацкім «ухілам». Ілона Барадуліна, паводле адукацыі і нараджэньня, — філёляг. Шмат у чым яе сьветапогляд сфармаваны ў коле бацькавых сяброў, сярод якіх былі Васіль Быкаў, Уладзімер Караткевіч, Барыс Забораў. Мастацтва для яе заўжды было ня працаю з адпаведнай «прафэс-







ійнай адукацыяй», а працягам дзіцячых гульняў, што вырасьлі ва ўласную філязофію, у спосаб спасьцiганьня сьвету.

У творах гэтае мастачкі, пры жаданьні, можна знайсьці багата цытатаў: зь японскага мастацтва, з афрыканскага, зь беларуска-француcкага кубізму... Але ці варта іх шукаць? Бо зь любога набору формаў можна стварыць цалкам арыгінальны твор. І паўз усе алюзіі і падабенствы творчасьць Ілоны Барадулінай уводзіць нас у зусім нечаканы й ні на што не падобны сьвет. Яна вычарпальна тлумачыць патрэбу ва ўласным тэрміне для свайго мастацтва: «Мне ўстыла тлумачыць, у якой манеры я працую, я вырашыла ўвесьці гэты тэрмін у жыцьцё сучаснага мастацтва. Мастацтва зараз падзяляецца на два лягеры ў вачах агульнай масы людзей: тое зразумелае, традыцыйнае, астатняе — авангард, нават калі ён з трыццацігадовым тэрмінам «вартасьці». «Што вы малюеце?» Выбар адказу — мінімальны, калі гаворыш зь недасьведчаным чалавекам. Індывідуалізм — ключ да салаўінага сьпеву. Белыя вароны мастацтва стваралі й ствараюць уласны монаістычны почырк. Монаізм — гэта тое, што і як раблю толькі я, гэта тое, што і як робіш толькі так, як ты».

Пры канцы імпрэзы мастачка пацьвердзіла ўласную канцэпцыю пэрформансам **(на здымках)**. Пад адвольны набор гукаў гішпанскага флямэнка Ілона Барадуліна за чвэрць гадзіны стварыла на вачах гледачоў новы твор. Пры дапамозе драбіны, трох флямастэраў на белай плоскасьці аркуша паперы нарадзілася «Плоскасьць свабоды».

**Здымкі Веранікі Дзядок**



# Кулінковіч у Празе

25 сакавіка гурт *Neuro Dubel* даў вялікі сольны канцэрт, прымеркаваны да Дня Волі. Сьпевакі называюць свой выступ у сталіцы Чэхіі адным з самых удалых у новай гісторыі гурту. «Для гледачоў, у асаблівасьці чэскіх беларусаў, гэта быў глыток сьвежага паветра, і нам было ў радасьць пайграць для іх», — кажа гітарыст Уладзімер Сахончык.

*Neuro Dubel* на запрашэньне арганізацыі «Скарына» граў у клюбе *«Mlejn»*. Канцэрт пачынаўся а 20-й. Да гэтага часу ў Прагу ўвесь час паступалі зьвесткі пра падзеі ў Менску — у клюбе паставілі ноўтбук, кожны ахвочы мог паглядзець праз Інтэрнэт навіны зь Беларусі, у жывым этэры ў клюбе вяшчала «Эўрапейскае радыё». «Падзеі ў Менску ўскалыхнулі ўсіх: і музыкаў, і гледачоў — і яшчэ болей іх зьядналі», — апавядае У.Сахончык. Гурт атрымліваў калясальную аддачу ад залі. Наўзамен беларускія музыкі сыгралі больш песьняў, чым было заплянавана. Дзьве сотні гледачоў не адпускалі «дзюбэляў» са сцэны, некалькі разоў выклікалі на «біс». Кулінковіч неаднакроць выходзіў у залю і сьпяваў разам з гледачамі.Тамтэйшым беларусам настолькі спадабаўся канцэрт, што яны запрасілі лідэра каманды на некалькі дзён застацца ў Празе, а арганізатары зноў чакаюць гурт у госьці па нейкім часе.

У красавіку *Neuro Dubel* сыграе вялікі сольны канцэрт у Менску. У найбліжэйшы час плянуюцца канцэрты ў Горадні і Варшаве.

**Сяргей Будкін**



# Аляксей Пяткевіч: Як мы сьмяяліся з газэтаў 1950-х

Прафэсару Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы Аляксею Пяткевічу — сёлета 75 гадоў. А ў 2007 г. споўніцца 50 гадоў, як Аляксей Пяткевіч пераехаў працаваць у Горадню. Спачатку было ніякавата пасьля Менску, у якім правучыўся сем гадоў. У сталіцы была магчымасьць застацца — пасьля асьпірантуры атрымаў разьмеркаваньне ў Інстытут літаратуры. Але ўмяшаліся сямейныя праблемы — у Наваградку жыла жонка з малой дачкой на руках. Уласнай кватэры ў Менску не прадбачылася.

## Домік пані Алаізы

Горадня прыемна ўразіла, і Аляксей Пяткевіч не пашкадаваў, што пераехаў сюды. Ён пачуваўся першаадкрывальнікам, шпацыруючы па вузкіх вулках, пакручастых берагах Нёману, падворках Старога і Новага замкаў.

Яшчэ ўразіў будынак насупраць пэдынстытуту. Часта падчас лекцыі Аляксей Пяткевіч спыняўся ля акна аўдыторыі ды ўглядаўся на спарахнелыя драўляныя прыступкі ганка, уяўляючы, як былая гаспадыня дому Алаізы Ажэшка заходзіць у дзьверы.

У тым доме ня раз гасьцяваў Францішак Багушэвіч, яе добры знаёмы, калі прыяжджаў у Горадню па адвакацкіх справах. Пазьней гэты дом быў перанесены на дзясятак мэтраў далей ад дарогі. Той самай дарогі, якую ўдзячныя жыхары гораду ў 1910 г. выслалі саломай, каб хворую пані Элізу не турбаваў грукат вазоў пад вокнамі.

Аляксей Міхайлавіч перакананы, што менавіта ягоная зацікаўленасьць творчасьцю А.Ажэшкі — гэтай мужнай змагаркі з расейскім самадзяржаўем — ейная людзкасьць падштурхнулі яго заняцца краязнаўствам Гарадзеншчыны.

## З Новага Сьвержня

Аляксей Пяткевіч нарадзіўся ў Новым Сьвержні пад Стоўпцамі, за пяць кілямэтраў ад коласаўскай Мікалаеўшчыны. Потым ён зацікавіўся гісторыяй мястэчка, што ўпершыню згадваецца пад 1428 г. і якое ў трылёгіі «На ростанях» як Панямонь вывеў Якуб Колас.

Дзед Пяткевіча служыў на чыгунцы. Бацькавых братоў рэвалюцыі, войны раскідалі па сьвеце. Адзін служыў афіцэрам у час Першай сусьветнай, пазьней быў начальнікам школы чырвоных камандзіраў. Другі — камэндантам ваеннага порту. Бацькавы сёстры аселі ў Польшчы. «Адна зь іх доўгі час не прыяжджала ў Беларусь. А як сустрэліся, загаварылі па-беларуску, то я ня мог надзівіцца: сястра зусім не забылася нашай мовы! Яе гаворка была такой, нібыта завітала з суседняй вёскі». Сваёй малой радзіме А.Пяткевіч прысьвяціў эсэ «Бацька мой Нёман» — споведзь пра родны кут і родную сям'ю.

## У БДУ мы баяліся

У 1949 г. Аляксей Пяткевіч здаў сем уступных іспытаў і быў лепшым сярод абітурыентаў БДУ — конкурс складаў 11 чалавек на месца. Праўда, калі праверылі сачыненьні па расейскай літаратуры, выкладчыца сказала: «Вы сьпісалі. Ня можа выпускнік сярэдняй школы так прафэсійна раскрыць тэму. Таму стаўлю чацьвёрку». «Стаю і ня ведаю, што рабіць. Даводзіць, што сачыненьне ад першай да апошняй літары маё — бессэнсоўна, калі выкладчыца пераканала сама сябе ў адваротным. Так моўчкі і пайшоў. Крыўдна было...» — згадвае сп.Пяткевіч.

Але хутка крыўды адышлі на другі плян. Унівэрсытэт захапіў прыгожым сьветам ведаў і творчасьці. У гэты час тут вучыліся Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Рыгор Барадулін, Вячаслаў Адамчык, Генадзь Бураўкін, Адам Мальдзіс.

У групе Пяткевіча быў паэт — Фёдар Макаранка. Аднойчы ён раптоўна зьнік. Прайшла пагалоска, што ў інтэрнаце прачытаў свой верш пра вэтэрана вайны, інваліда, які просіць міласьціну. Нехта са слухачоў хуценька данёс. Фёдара асудзілі на восем гадоў турмы. «Вальнадумства заўсёды было ўласьціва БДУ. Памятаю, чытаем газэты, знойдзем адпаведную «верноподданническую» публікацыю, сьмяёмся, ажно заходзімся. І палітычныя падзеі абмяркоўвалі, асабліва не азіраючыся».

## Гарадзенскі гарт

У горадзе над Нёманам творчая інтэлігенцыя гурталавалася вакол абласной «Гродзенскай праўды». Цэнтрам прыцягненьня было літаратурнае аб'яднаньне пры рэдакцыі і ягоны кіраўнік — паэт Міхась Васілёк. Бывалі ў рэдакцыі Аляксей Карпюк і Васіль Быкаў.

У 1965 г. у «Гродзенскай праўдзе» А.Пяткевіч надрукаваў, у пэрыяд цкаваньня Быкава, станоўчы водгук на аповесьць «Мёртвым не баліць». Яго выклікалі ў абкам партыі. Але за свайго выкладчыка заступіўся тагачасны рэктар пэдынстытуту Маркоўскі. Дзякуючы яму, удалося ўтрымацца на рабоце...

Яны тады разам стаялі плячо да пляча — пісьменьнікі Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль, гісторык Барыс Клейн, краязнаўца Алесь Белакоз, паэтка Ларыса Ге-



**Сакрат Яновіч і Аляксей Пяткевіч на беластоцкім чыгуначным вакзале. Апэратыўная здымка КГБ.**

ніюш, Аляксей Пяткевіч.

На арганізаваных сходах працоўных «прарабатывалі» В.Быкава. А.Карпюка выключылі з партыі, ён застаўся без работы. Барыса Клейна пазбавілі працы ва ўнівэрсытэце. Моцны ўціск адчуваў А.Белакоз.

### Быкаў загадаў

У 1971 г. В.Быкаў, тады старшыня абласнога аддзяленьня Саюзу пісьменьнікаў, папрасіў сп.Пяткевіча: «Зрабі сьпіс сваіх публікацый». Паміж «сваімі» была завядзёнка: не цікавіцца тым, пра што табе не гавораць. Сказаў зрабіць, значыць, трэба так зрабіць. Быкаў даслаў той сьпіс у Саюз пісьменьнікаў, прыклаўшы рэкамэндацыю Д.Бічэль, а таксама ўласную да хадайніцтва аб прыёме Аляксея Пяткевіча ў СП.

«Які Саюз! Я ж кніг друкаваных, па сутнасьці, ня маю...» Васіль Быкаў парыраваў: «Кнігі будуць. Матэрыялу назапасіў, дай Бог кожнаму столькі».

Сёньня Аляксей Пяткевіч — аўтар некалькіх кніг. Яго пяру належыць блізу 450 друкаваных прац, зьмешчаных у энцыкляпэдыях, падручніках, зборніках, часопісах. Ён ахвотна выступае ў розных аўдыторыях, бярэ ўдзел у працы грамадзкіх аб'яднаньняў. Асаблівы клопат праяўляе пра разьвіцьцё роднай мовы і культуры. Носьбіт традыцыі — кажуць пра такіх, як прафэсар Пяткевіч.

**Антон Лабовіч, Горадня**

Рэдакцыя далучаецца да віншаваньняў. Было асабліва прыемна 9 сакавіка атрымаць бандэроль з новай кнігай прафэсара Пяткевіча «Старонкі спадчыны. Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, зьявы, асобы» з дарчым надпісам сп.Пяткевіча для Рэдакцыі «НН».

# Аляксей Адамовіч: Мой прадзед працаваў на беларускую Беларусь

Артыкулы ў "НН" пра ролю нацкамаў у гісторыі Беларусі ("Рызыкоўная барацьба намэнклятуры", 18 лютага 2005; "Трыюмвіры, або помнік камісарам", 1 красавіка, 8 красавіка 2005) выклікалі рэзананс сярод чытачоў, абудзіўшы як гісторыкаў, так і сваякоў былых нацкамаў. Сярод абуджаных аказаўся праўнук Алеся Адамовіча Аляксей, які захацеў сам, праз пошуку беларускіх архівах, разабрацца ў лёсе прадзеда.

Калініншчына (сёньня Клімавіччына), дзе сакратаром акруговага камітэту партыі працаваў 24-гадовы Алесь Адамовіч, у 1920-я была апірышчам беларусізацыі. На допытах у ДПУ па справе "СВБ" Адамовіч сьведчыў: "Калінінская акруга празь беларусізацыю хутка зрабілася чымсьці кшталту "белага крумкача". Усе, хто прыяжджаў у Менск з Калініншчыны, размаўлялі па-беларуску, і тут ужо ўсе ведалі і гаварылі: "А, гэта з Калініншчыны".

Пасьля пастановы ЦК аб ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў у галіне нацыянальнай палітыкі ў БССР, акруговы камітэт прыняў пастанову пра перавод школ на беларускую мову, беларусізацыю савецкага і партыйнага апарату. Адамовіч асабіста наладзіў сувязь з усімі раёнамі, асабіста цікавіўся ходам беларусізацыі, арганізацыяй курсаў па вывучэньні беларускай мовы, прасоўваньнем беларускай літаратуры. Ён вельмі жорстка ставіўся да ўсіх, хто замаруджваў ход беларусізацыі, тым больш супрацiўляўся ёй.

Штомесяц Адамовіч патрабаваў ад Наркамасьветы спэцыялістаў для арганізацыі курсаў па гісторыі, геаграфіі, літаратуры Беларусі. Сюды прыяжджалі рабіць даклады Гарэцкі, Колас, Купала, Азбукін.

Натуральна, што адзін чалавек беларусізацыю зрабіць ня мог. Пад кіраўніцтвам Адамовіча працавалі У.Дубоўка, А.Дудар, А.Александровіч, Вольны. Як піша Дудар, "Адамовіч дужа гасьцінна прымаў усіх беларусаў, якія перабіраліся туды на працу, і тагачасная Калініншчына зьяўлялася сапраўднаю "зямлёю абяцанаю" для беларускіх нацыянал-дэмакратаў".

На пачатку 1925 г. Адамовіч размаўляў са Смолічам, тады дырэктарам Інбелкульту, "пра стварэньне бар'еру супраць РСФСР", які б спыніў нарэшце русіфікацыю і "мог бы прывесьці да ўтварэньня БНР".

Сымон Кандыбовіч у кнізе "Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі" пісаў: "Яшчэ юнаком ён [А.Адамовіч] актыўна ўдзельнічаў у савецкай працы… Празь некалькі гадоў яго запал зьменшыўся, і прыблізна ўжо да 1925 г. ён стаў заўзятым народнікам і нацыяналістам".

Насамрэч было па-іншаму. "Памылкі ЦК КП(б)Б па нацыянальным пытаньні ў 1918—1919 г. прывялі мяне да нацыяналізму, які поўнасьцю аформіўся ўжо ў 1920 г.". Як паказваюць допыты Адамовіча ў ДПУ, менавіта яму належала ідэя "Заявы 32-х". 14 студзеня 1921 г. яна была накіравана ў ЦК РКП(б) з суправаджальным лістом на імя Леніна, што ад імя 32 беларусаў-камуністаў падпісаў вядомы рэвалюцыянэр, грамадзкі дзеяч, літаратар Алесь Бурбіс. Гэты даклад быў спробай дапамагчы ЦБ КП(б)Б выпрацаваць праграму адраджэньня і далейшага развіцьця Беларусі на савецкім падмурку.

Але ў жніўні 1925 г. ДПУ пачынае капаць пад Адамовіча і яго атачэньне, усталёўваецца сачэньне, укараняюцца інфарматары і гэтак далей. Пасьля гэтага Адамовіч вымушаны разьвітацца з Калініншчынай. Але яна назаўсёды засталася ў яго душы, асабліва пасьля паэмы "Калініншына" Дубоўкі, якую паэт прысьвяціў свайму сябру, Алесю Адамовічу.

Мой любы браце, блізкі і далёкі,
няма сталёвасьці і арфазвоннасьці.
Такая сьцюжа на душы, навокал,
як дзень з дажджамі — быццам сёньняшні.

Ці ж я ня ведаю, ці я ня знаю,
ці я ня сын сваёй сучаснасьці—
жыцьцё крынічыць і музыкі граюць,
на лад папасьці ўсё ня шчасьціцца.

Часінай — весела, часінай — сумна,
Ідуць шляхі — ў балотах трацяцца.
А недзе злосьнікі бразгочуць бубнамі…
Даруй, даруй, мой любы браце, мне…

Адамовіча перавялі ў Полацак, затым прызначылі кіраўніком аддзелу друку ЦК КП(б)Б, намесьнікам рэдактара газэты "Беларуская вёска", намесьнікам наркама земляробства — па асабістай просьбе Зьмітра Прышчэпава. 19 ліпеня 1930 г. ён быў арыштаваны па справе СВБ і асуджаны на 10 год. У 1937 г. справа была перагледжана. 15 верасьня 1937 г. А.Адамовіча расстралялі. Рэабілітавалі яго толькі ў 1988 г.



Ня стала Станіслава Лема — культавага польскага пісьменьніка і філёзафа — апошняга Мысьляра сярод фантастаў. Апроч «Салярысу», «Прыгодаў пілёта Піркса» і іншых мастацкіх твораў, якія прынесьлі яму сусьветную славу, пісаў філязофска-сацыялягічныя дасьледаваньні, літаратуразнаўчыя працы. Аўтар безьлічы афарызмаў.

Пад уплывам яго кніжак абралі прафэсію многія касманаўты.

# Уранавыя вушы

## СТАНІСЛАЎ ЛЕМ

Жыў некалі інжынэр-касмагонік, які, каб цемру перамагчы, запальваў зоркі. Прыбыў ён да туманнасьці Андрамэды, калі тая была яшчэ поўная чорных хмараў. Закруціў ён адразу вялікі віхор, а калі той пачаў рухацца, касмагонік выцягнуў свае прамяні. Меў іх тры: чырвоны, фіялетавы і нябачны. Перажагнаў ён зоркавы шар першым, і той адразу зрабіўся чырвоным гігантам, але ў туманнасьці ня стала больш сьвятла. Укалоў ён зорку другім праменем, ажно тая зьбялела. Сказаў свайму вучню: «Пільнуй мне яе!» — а сам пайшоў іншыя зоркі распальваць. Чакаў вучань тысячу год, пасьля другую тысячу год, а інжынэр не вяртаўся. Занудзіла яму тое чаканьне. Падкруціў ён зорку, і тая зь белай зрабілася блакітнаю. Спадабалася яму гэта, і ён падумаў, што ўжо ўсё ўмее. Хацеў яшчэ падкруціць, але апёкся. Пашукаў у пудэлку, які пакінуў Касмагонік, а там нічога няма і нават неяк занадта пуста: пазіраеш і нават дна не відаць. Здагадаўся ён, што гэта нябачны прамень. Хацеў паштурхаць ім зорку, аднак ня ведаў як. Узяў тады пудэлак і кінуў яго ў агонь. Усе хмары Андрамэды шуганулі тады, як быццам сто тысяч сонцаў адразу засьвяціла, і зрабілася ва ўсёй туманнасьці сьветла, як удзень. Узрадаваўся вучань, але нядоўгая была яго ўцеха, бо зорка лопнула. Прыляцеў тады Касмагонік, бачачы шкоду, а каб нічога не змарнаваць, хапаў прамяні і вырабляў зь іх плянэты. Першую зрабіў газавую, другую — вугляродную, а на трэцюю яму толькі найцяжэйшыя мэталы засталіся, выйшаў таму зь іх актыніевы шар. Касмагонік сьціснуў яго, пусьціў у палёт і сказаў: «Праз сто мільёнаў год вярнуся, то ўбачым, што з гэтага будзе», — і паляцеў шукаць вучня, які са страху перад ім уцёк.

А на той плянэце, Актынурыі, паўстала вялікая дзяржава Палятынідаў. Кожны зь іх быў такі цяжкі, што толькі па Актынурыі мог хадзіць, бо на іншых плянэтах грунт пад імі правальваўся. Але і ў сябе дома на дыбачках хадзілі й слова сказаць не маглі, бо іх уладар, Архіторы, меры ня ведаў у жорсткасьці. Жыў у палацы, вычасаным з плятынавай гары, у якім было шэсьцьсот вялізных заляў, а ў кожнай адна яго далонь ляжала, гэткі быў вялікі. З палацу выйсьці ня мог, але паўсюль меў сваіх шпегаў — такі падазроны быў, — а таксама мучыў сваіх падданых хцівасьцю.

Ня трэба было палятынідам ніякіх лямпаў, ані агню ўночы, бо ўсе горы іх плянэты былі радыяактыўныя, так што пры маладзіку можна было шпількі лічыць. Удзень, калі сонца вельмі ў знакі давалася, спалі яны ў сутарэньнях сваіх гор і толькі ўночы сыходзіліся ў мэталічных далінах. Але люты Архіторы загадаў у катлы, дзе тапіліся палядый з плятынай, кідаць кавалкі ўрану і абвясьціў пра тое па ўсёй краіне. Кожны палятынід мусіў прыйсьці да каралеўскага палацу, дзе зь яго здымалі мерку на новы панцыр і накладалі нарукаўнікі й шышак, рукав-

іцы й накаленьнікі, забрала й шлем, і ўсё гэта зіхоткае, бо тая вопратка была з уранавай бляхі, а наймацней сьвяціліся вушы. З таго часу не маглі ўжо палятыніды зьбірацца дзеля супольнай рады, бо калі натоўп рабіўся вельмі людным, дык выбухала. Таму мусілі весьці самотнае жыцьцё, здалёк абмінаючы адзін аднаго, бо засьцерагаліся ланцуговай рэакцыі. Архіторы жа радаваўся іх смутку і абцяжарваў штораз новымі падаткамі. Яго манэтныя двары ў сэрцы гор білі алавяныя дукаты, бо волава было вельмі мала на Актынурыі і мела яно найбольшы кошт.

Велізарныя беды цярпелі падданыя злога ўладара. Некаторыя прагнулі ўзбунтавацца супраць Архіторыя і паразумляліся з гэткай мэтай на мігі, але нічога з гэтага не выходзіла, бо заўсёды знаходзіўся менш кемлівы, які набліжаўся да іншых, каб запытаць, у чым справа, і ў выніку яго някемлівасьці змоўшчыкі ўзьляталі ў паветра.

Быў на Актынурыі малады вынаходнік па імені Пірон, які навучыўся дрот цягнуць з плятыны такі тонкі, што можна было зь яго сеткі рабіць, у якія воблакі траплялі. Вынайшаў Пірон тэлеграф з дротам, а потым гэткі тонкі дрот выцягнуў, што яго ўжо не было, — такім чынам паўстаў тэлеграф бяз дроту. У жыхароў Актынурыі зьявілася надзея, што пашчасьціць заснаваць змову. Але хітры Архіторы падслухоўваў усе размовы, трымаючы ў кожнай з шасьцісот рук плятынавы праваднік, дзякуючы чаму ведаў, пра што яго падданыя гавораць, а ледзьве даходзіла да яго слова «бунт» альбо «рокаш», як адразу ж пасылаў шаравыя маланкі, што змоўшчыкаў ператваралі ў агнявыя калюжыны.

Пірон вырашыў перахітрыць злога ўладара. Калі зьвяртаўся да прыяцеляў, замест слова «бунт» казаў «боты», замест «змовіць» — «пашыць» і гэткім чынам рыхтаваў паўстаньне. Ахіторы жа дзівіўся, чаму яго падданыя раптоўна шавецтвам заняліся, бо ня ведаў, што калі кажуць «на калодку ўзяць», дык маюць на ўвазе «на агнявы кол пасадзіць», а «зацесныя боты» азначаюць яго тыранію. Але тыя, да каго Пірон зьвяртаўся, не заўсёды яго добра разумелі, бо ня мог ім інакш расказаць пра свае пляны, як толькі шавецкай моваю. Выкладаў ім і так, і гэтак, а калі не разумелі, раз неасьцярожна затэлеграфаваў: «З плютонію пасы драць», — нібыта на падноскі. Тут кароль напалохаўся, бо плютоній — найбліжэйшы сваяк урану, а уран — торыю, нездарма Архіторы гэтак зваўся. Выслаў тады адразу браніраваных ахоўнікаў, якія схапілі Пірона і кінулі на алавяны паркет перад аблічам караля. Пірон ні ў чым не прызнаўся, але кароль зьняволіў яго ў паладзіевай вежы.

Усялякая надзея пакінула палятынідаў, але вярнуўся Касмагонік, стваральнік трох плянэт.

Здаля прыгледзеўся ён да парадку, што панаваў на Актынурыі, і сказаў сабе: «Так быць ня мусіць!» Пасьля выткаў найтанчэйшае ды найцьвярдзейшае зьзяньне і, як у кокан, паклаў туды сваё ўласнае цела, каб чакала яго вяртаньня, а сам прыняў выгляд убогага недарэкі й сышоў на плянэту.

Калі сьцямнела і толькі далёкія горы зімным колам асьвятлялі плятынавую даліну, Касмагонік хацеў падысьці да падданых караля Архіторыя, але тыя ўцякалі ад яго зь вялікім неспакоем, бо баяліся ўранавай рэакцыі, а ён дарэмна ганяўся за адным ці за другім, бо не разумеў, чаму гэтак ад яго ўцякаюць. Так кружляў ён па пагорках, падобных да рыцарскіх шчытоў, бразгаючы крокам, ажно падышоў да падножжа вежы, у якой Архіторы трымаў скутага Пірона. Угледзеў яго Пірон праз краты, і падаўся яму Касмагонік хаця і ў постаці сьціплага робата, але не падобным да іншых палятынідаў, бо зусім не сьвяціўся ў цемры, а цёмны быў, як нябожчык. Было гэта праз тое, што ў дасьпехах яго не было ні кавалачка ўрану. Хацеў паклікаць яго Пірон, але меў зашрубаваны рот, таму толькі выкрэсваў іскры, б’ючыся галавою аб сьцяну сваёй вязьніцы, а Касмагонік, заўважыўшы той бляск, падышоў да вежы і зірнуў у акно за кратамі. Пірон ня мог размаўляць, але мог бранчаць ланцугамі, гэтак і вызваніў усю праўду Касмагоніку.

— Цярпі й чакай, — сказаў яму ён, — ды дачакаесься.

Касмагонік падаўся ў найдзічэйшыя горы Актынурыі й шукаў там тры дні крышталі кадмію, а калі знайшоў, расплюшчыў іх у бляху, гахаючы па іх палядынавымі камянямі. Выкраіў з кадміевай бляхі навушнікі і паклаў іх на ганках усіх дамоў. Палятыніды ж, якія іх знаходзілі, дзівіліся, але адразу ж накладалі іх, бо была зіма.

Уначы зьявіўся паміж іх Касмагонік і дубцом распаленым махаў так шпарка, што складаліся з таго агнявыя лініі. Гэткім чынам ён пісаў ім у цемры: «Можаце ўжо бясьпечна сысьціся, кадмій захавае вас ад уранавай згубы». Яны, аднак, вырашылі, што ён каралеўскі шпег, і ня слухаліся яго парад. Раззлаваўся Касмагонік, што яму ня вераць, пайшоў у горы і назьбіраў там уранавай руды, выплавіў зь яе срэбны мэтал і біў зь яго бліскучыя дукаты; на адным баку быў зьзяючы профіль Архіторыя, а на другім — выява яго шасьцісот рук.

Нагружаны ўранавымі дукатамі, вярнуўся Касмагонік у даліну і паказаў палятынідам гэткае дзіва: кідаў дукаты здаля ад сябе, адзін на другі, так што ўтварыўся зь іх стос, што зьвінеў, а калі дадаў туды празь меру адзін дукат, паветра затрымцела, з дукатаў пырснула сьвятло, і ператварыліся яны ў шар белага полымя, а калі вецер ўсё разьвеяў, застаўся толькі кратар, выплаўлены ў скале.

Потым другі раз узяўся кідаць Касмагонік дукаты зь меха, але ўжо інакш, бо што ні кіне дукат, дык зьверху накрываў кадміевай пласьцінкай, і, хаця паўстаў зь іх стос у шэсьць разоў большы, чым папярэдні, нічога з таго не было. Паверылі тады палятыніды і, сабраўшыся, зь вялікай ахвотай пачалі снаваць змову супраць Архіторыя. Жадалі скінуць караля, але ня ведалі як, бо палац быў атачаны агнявым мурам, а на пад’ёмным мосьце стаяла машына ката і тых, хто ня ведаў паролю, секла на часткі.

Якраз набліжаўся час выплаты новай даніны, якую хцівы Архіторы прызначыў. Раздаў Касмагонік каралеўскім падданым уранавыя дукаты ды імі параіў плаціць даніну. Гэтак і зрабілі.

Кароль цешыўся, што так шмат бліскучых дукатаў ідзе да яго скарбніцы, бо ня ведаў, што яны ўранавыя, а не алавяныя. Уначы ж Касмагонік расплавіў краты вязьніцы і вызваліў Пірона, а калі моўчкі ішлі далінаю ў сьвятле радыяактыўных гор, быццам пярсьцёнак Месяца сышоў і аперазаў далягляд, нечакана сьвятло шуганула жахлівае, бо стос уранавых дукатаў вырас ужо досыць і пачалася ў ім ланцуговая рэакцыя. Выбух паднябесны разарваў палац і мэталічнае цела Архіторыя, і моц яго была такая, што шэсьцьсот адарваных далоняў тырана паляцелі ў міжзоркавы вакуўм. Актынурыю апанавала радасьць, Пірон стаў яе сапраўдным уладаром, а Касмагонік вярнуўся ў цемру, забраў сваё цела з прамяністага кокана і пайшоў, каб запальваць зоркі. Шэсьцьсот жа плятынавых рук Архіторыя дагэтуль кружляюць вакол плянэты, як кольцы, падобныя да Сатурнавых, сьвецяць прыгожым бляскам, стакроць мацнейшым за сьвятло радыяактыўных гор, і кажуць узрадаваныя палятыніды: «Глядзіце, як добра Архіторы шлях нам сьвеціць». Некаторыя ж да сёньня катам яго клічуць. А выказваньне гэтае сталася прымаўкай, дайшло да нас пасьля доўгага падарожжа сярод выспаў галяктычных, таму і кажам: «А гэтаму кат сьвеціць».

**Пераклаў з польскай**
**Руслан Равяка**



## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

ПАМЯЦІ НАМЁТАЎ
на пляцы Кастуся Каліноўскага
*(на матыў Bella chao)*

“Выбар сьдзелан, усё бясспорна, —
прасьвяшчаў, прасьвяшчаў, прасьвяшчаў эфір, —
а ў іх палатках — шпрыцы і порна,
у іх бутэльках — не кефір!”

На экране жыцьцё стабільным
абвяшчаў, абвяшчаў, абвяшчаў канал,
ды на плошчы мент у цывільным
мяне ва ўсім пераканаў.

Кожны вечар як жыць маральней
павучаў, павучаў, павучаў ТВ,
а па дарозе да прыбіральні
б’юць за мараль па галаве.

Ноч на плошчы была цікавай:
як гучаў, як гучаў, як гучаў наш сьпеў!
Ды забралі за тэрмас з кавай –
выпіць залпам не пасьпеў.

Гаварылі: “Ён адмарозак!”
Ён маўчаў, ён маўчаў, ён маўчаў пра сьцяг.
“Там, на плошчы, няма цьвярозых”, –
скажуць зранку ў “навасьцях”.

“Хуліганіў, – казалі сьведкі, –
парушаў, парушаў, парушаў закон”.
А на плошчы жывыя кветкі
грэб у сьметніцы амон.

Значыць, будзем стаяць на лёдзе —
падкачаў, падкачаў надыход вясны.
Але свабода ізноў у модзе,
але свабодзе ня скажаш “годзе!”,
але свабода шчэ на свабодзе,
на свабодзе — нашы сны!

## СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

РЭПАРТАЖ ЗЬ МЕСЦА ПАДЗЕЯЎ

вайна пачалася ўвечары
ніхто й не чакаў такога павароту
на плітах падаграваласяя вячэра
дзеці даглядалі калыханку
мужчыны моўчкі палілі ў вакно
у чаканьні апошніх навінаў

вайна пачалася ў нядзелю а ўжо ў панядзелак
па той бок лініі фронту зьвінелі бакалы
стратэгі адзін аднаму паціскалі рукі
адусюль гучала лёгкая чыстая музыка
і радыё верашчала пра трыюмфальную перамогу

летапісец жывое трагедыі
уключаны ў падзеі
я за ўсім назіраў знутры

вайна аднак працягвалася
нягледзячы на паўсюдны фарс
людзі выходзілі з бункераў
няўмела ўзводзілі барыкады
усё што трапляла пад руку
знаходзіла прызначэньне

вайна была ва ўсіх на вуснах
яна насьцігала цябе ў дарозе
на ранішняй прабежцы ў парку
у чарзе да лекара ў лазьні
на рыбалцы і ўласным вясельлі
але толькі нямногія казалі пра гэта ўслых

вайна больш падавалася бунтам
знаныя камэнтатары і экспэрты
ўсе яны былі падобныя на страўсаў
кожны атрымае сваё на ўсю катушку
іхні голас почасту фальшывіў
пераскокваючы на высокую ноту

вайна была дзіўнай бо вораг
быў невідочным што блытала многіх
паводле хронік падручнікаў фільмаў
ён уяўляся чужынцам захопнікам
з грубымі тварам і мовай
насамрэч усё выйшла складаней
бо вораг аказаўся ўнутры

іх было шмат нябачных жаўнераў
але ўзначальваў усіх Страх

цяжка змагацца зь нечым бясплотным
кнігі па мастацтве войнаў
гавораць пра гэта надзвычай мала
застаецца верыць адно ў сябе

бо вайна не дарує ваганьняў
яна вымушае браць на сябе адказнасьць
каб калі застанесься адзін у акопе
пры сустрэчы твар у твар зь *імі*
змагчы не адвесьці вочы

# Жалезны век у Браславе

«Жывая археалёгія» не раскопвае, а адтварае стары лад жыцьця.



Апошнім часам папулярнасьць набылі адмысловыя археалягічныя фэстывалі і экспэрымэнтальная («жывая») археалёгія, на якіх узнаўляюцца ня толькі самі заняткі ці тэхналягічныя працэсы, але і лад жыцьця старажытнага насельніцтва.

Полымя археалягічных ды гістарычных фэстаў ахапіла Эўропу. У адрозьненьне ад беларускіх, замежныя фэсты адметныя ня толькі рыцарскімі забавамі. На іх вялікая роля адводзіцца рамесьнікам, якія дэманструюць працэс стварэньня таго ці іншага вырабу. Ты бачыш, як з дапамогай грубай касьцяной голкі вялікі кавалак скуры ператвараецца ў зграбную ташку. Дзівісься, зь якой спрытнасьцю дзявочыя рукі нанізваюць на льняную нітку рознакаляровыя пацеркі, а жанчыны выбляюць паясы. На тваіх вачах кавалак дрэва ці гліны ператвараецца ў лыжку ці гаршчок.

Паветра, якім дыхаюць удзельнікі фэсту, пранізанае водарам страваў нашых продкаў. Сёньняшнія гаспадыні аднавілі спосабы гатаваньня рыбы, дзічыны, зёлак, напояў і, канечне ж, ласункаў.

Адраджальнікі мінуўшчыны жывуць падчас фэстываляў у аднолўленых па старажытных малюнках буданах, зямлянках ці хатках. Земляная падлога адначасова адыгрывае ролю і ложка, і стала. Абавязковы элемэнт кожнага фэсту — вогнішча. Менавіта ля яго зьбіраюцца шумныя кампаніі, сьпяваюць, танчаць.

Іскра вогнішча трапіла і ў Беларусь. Першым за ідэю ўдзельнічаць у такім фэсьце ўхапіўся ганчар, супрацоўнік Браслаўскага музэю традыцыйнай культуры Валеры Зінкевіч. Ён сабраў вакол сябе сяброў — музэйных супрацоўнікаў, якія зь цягам часу сталі апантанымі аматарамі сваёй справы. Сёньня Браслаўскі комплекс — прадстаўнік Беларусі на розных міжнародных фэстах, ён стала прыпісаўся на вядомых імпрэзах у Біскупіне, Старахавіцах ў Польшчы, Кернаве ў Літве, Цэсісе ў Латвіі.

На гэтых фэстах беларускія майстры знаёмяць цікаўных з рамёствамі і заняткамі жыхароў крывіцкага паселішча X—XI ст. (Браслаўшчына ў гэты час была ўскраінай Полацкага княства).

«Самае галоўнае на такіх фэстах — рэканструкцыя ладу жыцьця, — кажа В.Зінкевіч. — Археалягічныя фэсты даюць магчымасьць імітаваць жыцьцё ў будане, у адпаведным адзеньні і абутку, з адпаведным гістарычным раскладам дня, зь ежай, начыньнем, адпаведнымі прыладамі працы».

Трапляючы ў *крывіцкае паселішча,* гледачы маюць магчымасьць паназіраць за стварэньнем гліняных вырабаў ды пазнаёміцца са спосабам іх апрацоўкі. В.Зінкевіч распавядае пра шляхі апрацоўкі гліны. Разьбяр Аляксандар Курбан працуе з дрэвам — аднаўляючы старажытныя прылады для апрацоўкі дрэва, рэканструюе посуд, рэчы, неабходныя пры вядзеньні гаспадаркі, дзіцячыя цацкі. Ля Кастуся Шыдлоўскага — натоўп турыстаў, якія маюць ахвоту нанесьці некалькі літар драўляным ці мэталічным пісалам на мяккую паверхню вашчанай дошчачкі ці кавалку бяросты.

За кухню ў крывіцкай вёсцы адказвае Элеанора Зінкевіч. Ёй дапамагаюць дзеці, супольна гатуючы кашу, праснакі з макам ды мёдам.

Ірына Шыдлоўская дэманструе, як пралі льняныя ніткі з дапамогай праселкаў, як плялі паясы на дошчачках. Часам да браслаўскіх рамесьнікаў далучаецца мастак зь Менску Ўладзімер Кандрусевіч, ягонае захапленьне — паказ тэхнікі дрэварытаў. Адметная падзея ў вёсцы — здабываньне рытуальнага «жывога» агню, ад якога запальваюцца ўсе вогнішчы вёскі.

У Беларусі пакуль большая ўвага надаецца яскравым відовішчам ды рыцарскім баям. У Эўропе — вывучэньню матэрыяльнай культуры і яе прапагандзе.

«У Беларусі глядач на такіх фэстах вядзе сябе стрымана: падыдзе, трошкі пастаіць і адыходзіць. Гледачы на фэстывалях у замежжы проста закідваюць пытаньнямі. Чалавек заплаціў грошы, і ён мае права патрабаваць. Таму цалкам выкарыстоўвае гэтае права, каб яму растлумачылі што? як? чаму?», — кажа К.Шыдлоўскі.

Стваральнікі комплексу вераць, што ў межах нашай краіны будуць зьбірацца сапраўдныя фэстывалі даўняй матэрыяльнай культуры, фэстывалі «жывой археалёгіі».

**Яня Шыдлоўская, Браслаў**



1. Шэранькі ці беленькі.
2. Доўгую шыю мае.
3. Надзейны сябар і ахоўнік.
4. Паядальніца бананаў.
5. Шэры злыдзень.
6. Малая дзяўчынка.
7. Хітрая прыгажуня.

МАЛЯВАЎ СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

## ТЭАТРЫ

**опэра**
*на сцэне Цэнтральнага Дому Афіцэраў*
**31** (пт) — «Травіята».
**2** (ндз) — «Мадам Батэрфляй».
**Купалаўскі тэатар**
**1** (сб) — «Памінальная малітва».
**2** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**3** (пн) — «Згублены рай».
*Ранішнія спэктаклі*
**2** (ндз) — «Сьнежная каралева».
*Малая сцэна*
**3** (ндз) — «Муж для паэткі».
**Тэатар беларускай драматургіі**
**31** (пт) — «Адвечная песьня».
**1** (сб) — «Воўк-мараплавец».
**1** (сб) — «Містэр Розыгрыш».
**2** (ндз) — «Чорны квадрат».
**Тэатар юнага гледача**
**31** (пт) — «Сястра мая Русалачка».
**1** (сб) — «Парасё, што сьпявае».
**2** (ндз) — «Папялушка».
**2** (ндз) — «Апошняя дуэль».

## ВЫСТАВЫ

**Юры Палякоў**
Да **15 красавіка** ў Гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (Менск, пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава, прысьвечаная памяці скульптара Юр'я Палякова.

## СПОРТ

**Футбол. Кубак Беларусі. 1/4 фіналу**
**1 красавіка** (субота)
«Дынама» (Менск) — «Шахтар» (Салігорск). Стадыён «Дынама». Пачатак а 17-й.
«Зорка-ВА-БДУ» (Менск, першая ліга) — «Баранавічы» (першая ліга). Менск. Футбольны манэж. Пачатак а 12.00.
«Гомель»—«Хімік» (Сьветлагорск, першая ліга). Менск. Футбольны манэж (былы пр. Машэрава, 22). Пачатак а 15.00.
«Дынама» (Берасьце) — БАТЭ (Барысаў).
Матчы ў адказ пройдуць 5 красавіка.

**Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.**

**Плэй-оф**
**Фінал**
**2 красавіка** (нядзеля)
«Юнацтва» (Менск) — «Дынама» (Менск). Крыты каток у Парку Горкага. Пачатак а 17.00.
**3 красавіка** (панядзелак)
«Юнацтва» — «Дынама». Пачатак а 18.30.
**6 красавіка** (чацьвер)
«Дынама»—«Юнацтва». Палац спорту. Пачатак а 18.30.

# Успамін пра Генадзя Нарчука

Пяціразовы чэмпіён Беларусі па шашках, майстар спорту Генадзь Нарчук (1953—2005) быў арыгінальным творцам, чыімі знаходкамі доўга будуць захапляцца аматары шашачнай гульні. Заводзкі рабочы, вучань славутага трэнэра Ізраіля Бельскага не прэтэндаваў на дасканалае веданьне ўсіх дэбютаў: любіў даводзіць, што тэорыю трэба вывучаць, каб яе абысьці. Сп.Генадзь пайшоў з жыцьця роўна паўгоду таму, 1 кастрычніка. Але засталіся ўспаміны сяброў і прыгожыя партыі.



**Ю.Арустамаў — Г.Нарчук.** Фінал чэмпіянату СССР, 1971 г.

У пазыцыі на дыяграме гросмайстар Арустамаў, замест слушнага 1. fg3 з роўнасьцю, згуляў 1. ed2? і быў перайграны: 1…ab6 2. dc3 ed6 3. gh2 (кепска 3. de5? з-за 3…dc5 4. cd4 ab4X) 3…dc5 4. fg3 hf2 5. eg1 ce3 6. fd2 bc5 7. hg3 cd6 8. gh4 gf4 9. hg5 de5! 10. ge3 hg5 11. gh2 ba7! 12. ab4 (калі 12. hg3, то 12…gh4 13. ef4 hf2 14. eb4 fg1X) 12…cc1 13. ef4 ce3! і белыя здаліся. Ці не зарана? Праверым: калі 14. fh6, то 14…e3-d4 15. hg7 db2 16. gf8 ef4 17. fa3 bg7 18. af8 gh6 19. fa3 fe3X. Калі 14. fd6, то 14…gh4 15. de7 eg5! 16. ef8 gf6X. (Аналіз гросмайстра Г. Пятровіча.)




## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 1 красавіка

**НТВ, 21.40**
«Хуткі і мёртвы».
ЗША—Японія, 1995, рэж. Сэм Рэймі.
Вэстэрн.
Дзяўчына-каўбой помсьціць нягодніку, які забіў яе бацьку-шэрыфа. Кардэбалет кольтаў і куляў пастаўлены Сэмам Рэймі («Злобныя мерцьвякі», «Чалавек-павук»). У ролях — суцэльныя зоркі: Шэран Стоўн, Расэл Кроў, Леанарда Ды Капрыё.

**СТВ, 23.40**
«Калі нас ня стане».
Францыя, 2004, рэж. Дам'ен Адуль.
Лірычная драма.
Састарэлы буржуа Жан-Рэнэ (П'ер Рышар) вырашае скончыць свае дні ў старажытным палацы. Герой запрашае да сябе тэатральную трупу, каб тая інсцэнавала грэцкія міты.

**АНТ, 00.00**
«Эпідэмія».
ЗША, 1995, рэж. Вольфганг Пэтэрсэн.
Трымценьнік, фільм-катастрофа.
У выніку вайсковых экспэрымэнтаў небясьпечная хвароба вырвалася на волю. Вірусоляг (Дастын Гофман) робіць усё магчымае, каб прадухіліць біялягічную катастрофу…
І Д.Гофману, і Доналду Сазэрлэнду (у вобразе кепскага вайскоўца), і Моргану Фрымэну ёсьць, што граць.

### Нядзеля, 2 красавіка

**АНТ, 13.40**
«Бэтмэн».
ЗША—Вялікабрытанія, 1989, рэж. Цім Бёртан.
Фільм-комікс.
Шальныя, эксцэнтрычныя і неверагодныя прыгоды Бэтмэна й Джокера. Глючныя дэкарацыі, яскравыя колеры і звышвар'яцкая гульня Джэка Нікалсана ў комікс-шэдэўры ад Ціма Бёртана.

**СТВ, 20.25**
«Усё пра каханьне».
Данія—ЗША, 2002, рэж. Томас Вінтэрбэрг.
Фантастычная мэлядрама.
2021 год. Улетку ідзе сьнег, ва Ўгандзе ня дзейнічаюць законы прыцягненьня. Джон (Хаакін Фэнікс) прыяжджае ў Нью-Ёрк, каб разьвесьціся з Эленай (Клэр Дэйнз). Але каханьне прыйдзецца выратоўваць… Томас Вінтэрбэрг — адзін з заснавальнікаў дацкай «Догмы». Хоць фільм не падпарадкоўваецца «дагматычным» правілам, яго жанравую прыналежнасьць няпроста вызначыць.

**АНТ, 21.05**
«Інтэрвію з вампірам».
ЗША, 1994, рэж. Ніл Джордан.
Вампірская готыка паводле раману Эн Райс.
Пасьля сьмерці жонкі арыстакрат становіцца вампірам і пакутуе ад сваёй неўміручасьці. У героя засталіся чалавечыя пачуцьці — і ён спавядаецца пра сваё жыцьцё пасьля сьмерці.
Культавы гатычны фільм з Томам Крузам, Брэдам Пітам і Антоніё Бандэрасам у ролях крывасмокаў.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Маньячка вяртаецца!

**Асноўны інстынкт 2: Прага рызыкі**
(Basic Instinct 2)

ЗША—Вялікабрытанія—Гішпанія—Нямеччына, 2006, каляровы, 114 хв.

**Жанр:** эратычны трымценьнік.

Сьветлы вобраз інтэлектуалкі-маньячкі доўга не даваў спаць моцнай палове прагрэсіўнага чалавецтва. Роля пісьменьніцы-рызыканткі Кэтлін Трэмэл, якая пераўтварае мужчынаў у фарш адным позіркам, імгненна зрабіла з Шэран Стоўн супэрзорку. Але другой часткі фільму давялося чакаць 14 гадоў.
Саліруе ў карціне Стоўн. Яна й падбірала сабе партнэра. Брытанскага псыхіятра Эндру Гласа, якога даводзіць да ручкі пісьменьніца, грае Дэйвід Морысі — больш вядомы як тэатральны актор. Цікава, што сярод кандыдатаў разглядалася імя Пірса Броснана.
Рэжысэр карціны Майкл Кэтан-Джонз — малавядомы (карціна «Роб Рой» самая знакамітая), і цяжка казаць, наколькі атрымаецца ў рэжысэра паўтарыць вэрхувэнаўскую атмасфэру спакусы, гвалту і стоенай іроніі.
Шэран Стоўн за 14 гадоў не амаладзілася — і эратычная роля ёсьць няпростым выпрабаваньнем.
Наколькі карціна атрымалася — меркаваць гледачам. Сусьветная прэм'ера — у тым ліку і ў Менску! — прайшла 30 сакавіка.

**АР**

## КІНО НА DVD

**Master Records**
Элі Паркер.
Драма, ЗША, 2005, рэж. **Сот Кофі**.
У ролях: **Наомі Ўотс, Рэбэка Рыг, Скот Кофі.**
Элі Паркер носіцца з кінапробы на кінапробу. Аднойчы гераіні прапануюць кінапробу, якая вырашыць усё…
Прызы кінафэсту ў Сіетле і Сандэнзэ.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**


# Зрабі з газэты кнігу



«Нашу Ніву» ў новым фармаце зручна пераплятаць у квартальнікі ці гадавікі.

**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284-68-18, 284-72-17, 284-81-07, 8-029-6-400-100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284-81-84, 284-32-72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285-79-29, 8-029-645-99-54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284-37-07, 8-029-622-83-01, 8-029-622-83-04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22-77-133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8-029-388-40-82, 8-029-570-74-11, 8-029-400-48-55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8-029-758-06-16, 774-62-13, 8-029-341-17-29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211-00-63/64/65, 226-45-48, 8-029-643-80-77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).

**...сьнежкамі сапраўды можна было нанесьці чэрапна-мазгавую траўму.**



— Хутчэй яшчэ сьнегу, а то прарвуцца на Плошчу!

**...адміністрацыя Гаазкай турмы працавала гэтак жа, як адміністрацыя Акрэсьціна.**




— Нарэшце я перадала перадачу.

Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна

## У НУМАРЫ


### Спэцназ зьбіў вязьня Асьвенціма



Дзень Волі-2006.
**Старонка 7.**

### Што выбары, што Новы год



Рэпартаж Лёліка Ушкіна з Кіева.
**Старонка 22.**

### Памяці намётаў



Новыя вершы Андрэя Хадановіча і Сяргея Прылуцкага.
**Старонка 42.**

### Дзіцячая крыжаванка



**Старонка 44.**

### Плоскасьць свабоды



Рэдкая птушка ў «Добрых мысьлях». Піша Сяргей Харэўскі.
**Старонка 36.**


## ЖАРТЫ

Вам страшна хадзіць уначы па цёмных вуліцах? Намажце ногі сьвіным салам, і вясёлая зграя сабакаў не падпусьціць да вас нікога.

Дзе дзеўся Лукашэнка? Выказваецца меркаваньне, што ён пайшоў інкогніта на мітынг 25 сакавіка, а потым тры дні ня мог давесьці ў жодзінскім ізалятары, хто ён такі.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

У Думе і каля Думы

**Засяданьне 28 марца.** Праглядалі Закон аб змаганьні з п’янствам. На праект дэп. Булата (труд.), каб штогоду зьмяншаць выгонку гарэлкі на 20 прац., Дума не згадзілася.

С.**Хоміна**, Магіл. губ. Горацкі пав. У ноч з 18 на 19 марца сабраліся хмары, зігацела маланка, загрымеў пярун і паліў дождж. Вады надало столькі, што ў Міхееўцы зьнясло на рэчцы мост. У Волеўках пярун спаліў дзьве сялібы.

**Саўка Каваль**

**Менск.** Акружны суд у Гомелі менскага карэспандэнта газэты «Полесье» Н.Н.Верасава асудзіў на 50 руб. штрафу і месяц арышту за вострую карэспандэнцыю аб даваньні службы, быццам за грошы на Л[ібава]–[Р]оменскай чыгунцы.

**Мікола Камароўскі**
**«НН», №13, 31 сакавіка 1911**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ВІНШАВАНЬНІ

**Ігара Мацьвеева** зь Віцебску з Днём народзінаў! Зычу шчасьця, моцы, перамог! Я цябе кахаю! Таццяна

### ПРЭМ’ЕРА

**У нядзелю ў Беларускім ПЭН-цэнтры**(вул.Залатая горка, 2–101) адбудзецца прэм’ерны прагляд фільму Алега Дашкевіча «Маналёгі». Пачатак а 16–й.

### КНІГІ, ПЭРЫЁДЫКА

**«Наша Ніва»**, «Народная Воля», кнігі, часопісы, слоўнікі, энцыкляпэдыі, духоўная ды дзіцячая літаратура, музыка ды фільмы на CD на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15:00—19:30). Т.: 707–40–01

**Прапаную кнігі**: энцыкляпэдыя «Беларуская міталёгія», «Энцыкляпэдыя беларускай мовы», Л.Геніюш «Споведзь», У.Сыракомля «Добрыя весьці», Ядвігін Ш., Ажэшка, «Першы Літоўскі Статут 1529 г.», вялікі фармат ды шмат іншага. Т.: 294–02–15 (пасьля 18–й)

**Прапаную кнігі**: «Беларуска–польскі размоўнік», Байкоў–Некрашэвіч «Беларуска–расейскі слоўнік», Я.Крук «Сымболіка беларускай народнай культуры», Беларускі кнігазбор: «Летапісы і кронікі», Каліноўскі, Ян Баршчэўскі, Ластоўскі, Улашчык, Чачот ды іншае, гісторыя, этнаграфія, архітэктура, пераклады. Т.: 753–70–05

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. E–mail: alesknigi @mail.ru; а/с 195, 220030 Менск

**Прапаную**: Лёсік «Збор твораў», «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96


Як выпісаць «Нашу Ніву»

Старонка 33.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e–mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| адказны за выпуск | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2421. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.03.2006.
Замова № 1747.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а